Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт мастацкай культуры
Кафедра рэжысуры

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_______________ Н.В. Петухова
«___»_________________ 2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

_________________ А.В. Пагоцкая
«___»_________________ 2022 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
(ЭЕЛКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС)
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# РЭЖЫСУРА ФАЛЬКЛОРНЫХ ПРАДСТАЎЛЕННЯЎ

для спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят
прафілізацыі: Рэжысура народных абрадаў і свят;
Рэжысура сучасных відовішчаў і івэнт-праектаў

Складальнік:
Д.П.Сергейчук, старшы выкладчык кафедры рэжысуры

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета факультэта мастацкай культуры
«19» снежня 2022 г., пратакол № 5

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай рэжысуры установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №_ад __ __ 2022 г.)

Саветам факультэта мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №_ад _ _ 2022г.)

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №
ад )

Адказны за рэдакцыю:
Адказны за выпуск: Д.П.Сергейчук

ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 4 |
| 2. | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 7 |
| 2.1 | КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ | 9 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 86 |
| 3.1 | Тэматыка і метадычныя ўказанні да практычных заняткаў | 86 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮВЕДАЎ | 91 |
| 4.1 | Пералік пытанняў да бягучай атэстацыі | 91 |
| 4.2 | Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў | 93 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | |
| 5.1 | Вучэбная прграма | 96 |
| 5.2 | Асноўная літаратура | 117 |
| 5.3 | Дадатковая літаратура | 118 |


## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

На кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі “Беларускідзяржаўны ўніверсітэткультуры і мастацтваў”рыхтуюць высокакваліфікаваных і кампітэнтных спецыялістаў для работы ў галіне святочнай культуры, здольных да самаўдасканалення і развіцця ва ўмовах зменлівага духоўнага і інфармацыйнага жыцця грамадства.

Вучэбная праграма модуля «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя).

Актуальнасць вывучэння дадзенага модуля абумоўлена фундаментальнай роляй рэжысёрскіх ведаў у фарміраванні прафесійнага светапогляду будучых спецыялістаў; неабходнасцю пераемнасці гістарычнага вопыту, назапашанага мастацтвам рэжысуры святочных дзей, набыццём прафесійных уменняў і навыкаў у творчай арганізацыі разнажанравых сцэнічных мерапрыемстваў. Вучэбны модуль «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» прадугледжвае выкладанне творчых аспектаў увасаблення святочнай гульнёвай формы мерапрыемства на базе тэарэтычных дасягненняў айчыннай і замежнай рэжысуры, этналогіі, фалькларыстыкі, мастацтвазнаўства з выкарыстаннем значнага навукова-метадычнага матэрыялу: манаграфій, навукова-папулярных прац, метадычных дапаможнікаў і публікацый па асобных праблемах творчага ўвасаблення разнастайных форм святочнай культуры. Засваенне вучэбнага модуля «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» абапіраецца на веды, уменні і навыкі студэнтаў, атрыманыя пры вывучэнні сумежных дысціплін «Гісторыя свят», «Традыцыйная культуры беларусаў», Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Моўнае дзеянне ў свяце», «Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята», «Музычна-шумавое вырашэнне свята» і інш. Выкладанне модуля дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі для пошукаў шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення фальклоранага прадстаўлення. Сучаснае фальклорнае прадстаўленне разглядаецца як сукупнасць разнажанравых відаў мастацтва, таму будучаму рэжысёру неабходна засвоіць мадэлі творчай арганізацыі розных структурных кампанентаў святочнай дзеі на аснове фальклора.

Асноўная *мэта* вучэбнага модуля «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» – набыццё студэнтамі сістэмы ведаў, практычных навыкаў і

уменняў па розных аспектах творчай задумы, распрацоўцы і ўвасабленні фальклорнага прадстаўлення як комплексу разнажанравых масава-гульнявых і абрадава-рытуальных дзей.

Мэтавая накіраванасць вучэбнага модуля абумоўлівае вырашэнне кола *задач*:

– раскрыць агульнатэарэтычныя палажэнні і спецыфіку рэжысуры фальклорнага прадстаўленняз улікам разнажанравых элементаў;

– выявіць рэгіянальныя, тэрытарыяльныя і мясцовыя асаблівасці абрадава-рытуальных дзей у святах і ствараць на іх аснове спецыфічныя ўмовыдля сцэнічнай пастаноўкіфальклорнага прадстаўлення;

– разгледзець творчую арганізацыю прадстаўлення і яго разнажанравыя структурныя кампаненты ў якасці асобных тыпаў святочнай дзейнасці;

– вызначыць шляхі стварэння і развіцця новых фарматаў на аснове культурнай пераемнасці, мастацка-гістарычнага вопыту беларускага народа;

– фарміраваць мастацкую свядомасць будучых спецыялістаў – рэжысёраў факлорных прадстаўленняў.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– гульнёвы і абрадава-рытуальны каляндар беларусаў, яго ролю ў жыцці грамадства;

– генезіс, сімволіку і семантыку беларускіх рытуалаў, звычаяў і абрадаў;

– методыку распрацоўкі і ўвасаблення сюжэтна-гульнявых і конкурсных праграм, ролевых гульняў;

– методыку дэталёвай фальклорна-этнаграфічнай распрацоўкі прадстаўлення;

– традыцыі і навацыі ў творчай пастаноўкі фальлорнага прадстаўлення, новыя напрамкі для іх развіцця ў сучаснай святочнай культуры Беларусі.

– агульныя заканамернасці рэжысуры фальклорных прадстаўленняў.

– асаблівасці рэжысуры факлорнага прадстаўлення ўнародным свяце.

– методыку распрацоўкі рэжысёрскай задумы факлорнага прадстаўлення і яго ўвасабленне.

Засваенне матэрыялу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне павінна забяспечыць фарміраванне *наступных кампетэнцый:*

УК-1. Валодаць асновамі даследчай дзейнасцю, ажыццяўляць пошук, аназіл і сінтэз інфармацыі.

УК-4. Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесіянальныя, культурныя і іншыя адрозненні.

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканальванню ў прафесійнай

дзейнасці.

УК-18. Прымяняць сучасныя тэхналогіі стварэння і ўпраўлення творчымі праектамі ў сферы культуры і мастацтва.

СК-1. Ствараць сцэнарыі разнастайных відаў тэатральных прадстаўленняў і свят, абапіраючыся на прынцыпы і тэхналогіі, формы і жанры прадстаўленняў і свят.

СК-2. Выкарыстоўваць навыкі рэжысёры і выканальніцкага майстэрства акцёра, прымяняць разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці ў працэсе стварэння розных відаў свят.

СК-3. Выкарыстоўваць прынцыпы кампазіцыйнай пабудовы масавых свят на адкрытых і нетрадыцыйных пляцоўках.

Набыццё ведаў ажыццяўляецца ў непасрэднай сувязі з фарміраваннем прафесійных здольнасцей, таму студэнт павінен *умець*:

– увасабляць фальклорнае прадстаўленне на аснове мясцовых традыцыйправядзення абрадаў і рытуалаў ў закрытым памяшканні і на вольным паветры;

– увасобіць спецыфічны гульнявы комплекс кожнага канкрэтнага свята каляндарнага цыкла;сучасных сюжэтна-гульнявых, конкурсных праграм, ролевых гульняў на аснове фальклорных элементаў;

– валодаць прафесійнымі якасцямі вядучага гульнёвага дзейства;

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі для назапашвання пазітыўнага вопыту гульнёвага комплексу беларусаў у сучаснай святочнай культуры;

– ствараць сцэнарна-рэжысёрскую распрацоўку фальклорнага прадстаўленне на аснове выкарыстання этнаграфічнага матэрыялу.

Змест праграмы модуля распрацаваны на аснове дзяржаўнага адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі, у адпаведнасці з дзеючымі вучэбнымі праграмамі спец.дысцыплін.

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## *Уводзіны*

У структуры сучаснай культуры ўсё большае месца займаюць відовішчныя мастацтва, якім адводзіцца значная роля у справе ідэйнага, маральнага і мастацкага выхавання людзей, арганізацыі іх быта і адпачынку**.**

Сфера мастацка- гульнёвай дзейнасці заўсёды ўяўляла сабой надзвычай важны і неад’емны аспект жыццядзейнасці кожнага народа на ўсіх этапах яго гістарычнага развіцця. Таму сёння прыкметна ўзрастае навуковая актуальнасць і практычная значнасць усебаковага ўважлівага даследвання мастацка – гульнёвай дзейнасці нашага народа.

На сёняшнім этапе развіцця мастацка – гульнёвай дзейнасці, недастаткова развіта арганізацыйна – метадычная дзейнасць у арганізацыі і правядзенні фестывалей і святаў гульні (якія амаль з пачатку 90-х гг на Беларусі не праводзяцца). Конкурсы арганізатараў вольнага часу, гульнёва – забаўляльных праграм толькі паўстаюць як састаўная частка святочна-відовішчнага элемента культуры у агульным святочным календары.

Арганізацыя гульнёвых пляцовак на святах дае магчымасць уцягнуць у дзею значную колькасць людзей садзейнічае іх актывізацыі, стварае жыццярадасны настрой ў гледачоў. Сёння тэлебачанне паўсюдна паказвае шоў з элементамі гульні, але на маю думку, назваць гэта паўнацэннай гульнёй нельга.

Аднаўленне конкурсаў прафесійнага майстэрства культарганізатараў, школы і творчых лабараторый, семінараў па пытаннях гульнёвай дзейнасці патрэбны з мэтай абмену мастацка-гульнёвага вопыту, вырашэння пэўных праблем у гульнёвай дзейнасці, з мэтай падняць гульнёвы жанр на больш якасны ўзровень.

Таму адраджэнне, захаванне і ўкараненне традыцыйнай мастацка-гульнёвай дзейнасці на сучасным этапе на маю думку з’яўляецца актуальным і сацыяльна – значным.

Мэта і задачы дысцыпліны. Паняцце «фальклорнае прадстаўленне» ў навуковых крыніцах. Фальклорнае прадстаўленне і яго месца ў духоўным жыцці грамадства. Агульныя і адметныя рысы народнага свята і фальлорнага прадстаўлення. Адрозненне ад іншых відаў мастацтва. Творчыя праблемы рэжысуры сучаснага фальклорнага прадстаўлення.

Гульня ў структуры народнага свята. Абрад гульні народнага календара.

Стараславянскае і старабеларускае слова “ігра” адпавядае сучаснаму беларускаму “гульня”, у славянскіх мовах мае тое ж значэнне, што пацеха,

танец, гульня. Месцы, дзе праходзілі гульні , называліся ІГРЫШЧАМІ.

Народныя гульні – від актыўнага адпачынку чалавека , гістарычна сфарміраваных на аснове драматызаваных, умоўных або творчых дзеянняў. Складаліся пэўныя правілы і прыемы , якія з'яўляюцца сродкам фізічнага, разумовага, народна – эстэтычнага выхавання. Ігрышчы – месца, арэна для гульняў, спаборніцтва, збора моладзі для танцаў. На ігрышчы запрашаюць музыку са скрыпкай, гармонікам, бубнам.

Другая распаўсюджаная назва гульняў – ВЯЧОРКІ, ВЕЧАРЫНЫ, ВЕЧАРНІЦЫ.

Гульня ў структуры народнага свята , абрадавая гульня народнага календара займае важнейшае месца ў структуры народнага свята. Гульня – гэта абрады і рытуалы, якія страцілі магічную накіраванасць і ператварыліся ў забаву. Абрадавая гульня народнага календара – інсцэніраванне пэўных рытуальных дзей.

Гульні падраздзяляюцца на :

- Зімовыя;
- Веснавыя;
- Летнія і асеннія;
- Сямейна – абрадавыя.

Зімовыя ("Ваджэнне казы", "Яшчар", "Жаніцьба Цярэшкі", "Падушачка" і г. д.)

Веснавыя ( "Проса", "Журавель", "Гуканне вясны", "Перапелачка", "Ваджэнне и пахаванне стралы", "Біцце яек")

Летнія і асеннія ("Зяленыя святкі", "Завіванне і развіванне вянкоў", "Варажба на Купалле")

Сямейна – абрадавыя ("Пазнай нявесту", "Вазенне Бабкі" і г. д. )

Гульня – грамацкая з'ява. Складалася гістарычна, як самастойны від свядомай дзейнасці чалавека. Але гульня – умоўнае адлюстраванне рэчаіснасці , з развіццем грамацкай свядомасці змяняецца і змест народных гульняў, яны пачынаюць адлюстроўваць характар новых адносін паміжж людзьмі , новую мараль. Але самае каштоўнае – лепшыя традыцыі, звычаі, нацыянальны каларыт трэба беражліва захоўваць.

## Раздзел І. Беларускія народныя гульні як кампанент фальклорнага прадстаўлення

*Тэма 1.Гульня як кампанент фальклорнага прадстаўлення*

Гульня як кампанет фальклорнага прадстаўлення. Форма гульні ў прадстаўленні. Яе функцыі і мастацкі прыём. Суадносіны асноўных паняццяў, звязаных з фальклорным прадстаўленнем: традыцыя, гульня, абрад, цырыманіял, рытуал.

*Мэта:* раскрыць паняцце "гульня" як від дзейнасці чалавека; прааналізаваць гістарыяграфію пытання, даць класіфікацыю гульні.

"Гульня – від актыўнага адпачынку чалавека, гістарычна сфарміраванага на аснове драматызаваных, умоўных або творчых дзеянняў, у якога склаліся пэўныя правілы і прыёмы забаў і якія з'яўляюцца сродкам фізічнага, разумовага і маральна-этычнага выхавання", - сцвярджае А.Лозка. аўтар уступнага артыкула да тома "Гульні. Забавы. Ігрышчы" з серыі "Беларуская народная творчасць", выдадзенай НАН Беларусі. Многія народныя гульні ўзніклі з абрадаў і развіваліся са старажытных часоў і сёння нясуць на сабе адбітак старадаўняй народнай культуры, але гэтыя веды ўжо не ўспрымаюцца як вераванні ў язычніцкіх багоў, а выступаюць як сродак адпачынку і набыцця карысных ведаў. Цераз гульню пазнаецца свет і наваколле.

Адметныя рысы гульні як самастойнага віду дзейнасці чалавека. Неабходнасць у гульнёвай дзейнасці. Наяўнасць гульнёвай прасторы і умоў (правіл) гульні.

Метадычныя асаблівасці гульні праяўляюцца праз вобразнасць, самастойнасць, праяўленне творчай ініцыятывы для дасягнення пастаўленай мэты, выканання асобных роляў у гульне згодна сюжету, што ўстанаўлівае пэўныя ўзаемаадносіны паміж удзельнікамі гульні; сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў ў вырашэнні гульнёвых "канфліктаў", што стварае высокі эмацыянальны настрой.

Этымалогія слоў "гульня" і "ігрышча". Стараславянскае і старабеларускае слова "ігра" адпавядае сучаснаму беларускаму "гульня", у славянскіх мовах мае тое ж значэнне, што і "пацеха", "забаўка", "скокі" і інш.

Вялікую складанасць і цяжкасць уяўляе сабой класіфікацыя беларускіх народных гульняў. Гэтым пытаннем займаліся даследчыкі 19-20 стст. Г. Барташэвіч падзяляе гульні на 1. гульні як мастацка-драматычнае дзеянне; 2. гульні як сродак фізічнага выхавання. Іншыя даследчыкі, напрыклад М. Нікіфароўскі, падзяляе гульні па ўзросту гульцоў, згодна меркаванню даследчыка Я. Вількіна, гульні лепш падзяляць на падставе асаблівасцяў

удзельнікаў: “для дзевачак”, “для хлопчыкаў”, “для падлетаў”, “для дарослых” і інш. Даследчык Е. Раманаў прапануе наступную класіфікацыю, заснаваную на атрыбутах і асноўных дзеяннях гульні: “гульні з рухамі”, “гульні з мячом”, “гульні з шарамі”, “гульні з завязанымі вачамі” і інш. Акрамя гэтага гульні можна падзяліць на каляндарныя і сямейна-побытавыя.

Разгляд беларускіх дзіцячых гульняў па запісах этнографаў і фалькларыстаў XIX – пачатку XX стст. Развіццё гульнёвага жанру ў Беларусі.

Умовы для правядзення гульні. Высвятленне мэты гульні; сціслае, лагічнае і паслядоўнае тлумачэнне ўмоў або правіл гульні; уключэнне у тлумачэнне назвы гульні, высвятленне ролі гульцоў і іх месца знаходжання, сам ход гульні; вынікі гульні.

Выкарыстанне ў якасці дэманстрантаў гульні персанажаў з традыцыйных абрадаў (валачобнікі, калядоўшчыкі, купалінка і інш), скамарохаў, клоўнаў, аніматараў і інш.

Спосабы падзелу гульцоў на каманды (прафесійныя якасці, творчая складовая, жаданне, узрост і інш.).

Абавязковае кіраванне гульнёй: сігнал да пачатку лзеі, стымуляванне ініцыятывы гульцоў, падтрымка адпаведнага настрою, назіранне за выкананне правіл і умоў гульні, патрабаванне дысцыпліны як да гульцоў, так і гледачоў, арганізацыя работы журы.

Падвядзенне вынікаў. Ушанаванне і узнагароджванне пераможцаў, заахвочванне і стымуляванне да гульні пераможаных.

### *Тэма 2. Гульня ў структуры сучасных святочных мерапрыемстваў*

Разгляд тэрміна «гульня». Асноўныя прыкметы гульні. Умовы стварэння гульнявой атмасферы. Прынцыпы стварэння гульнявагафальклорнага прадстаўлення.Тыпалогія беларускіх народных гульняў. Разнастайнасць сучаснай тыпалогіі гульняў.

Гульня як від чалавечай дзейнасці. Гульнёвыя вытокі абрадаў. Абрад як гульня. Трансфармацыя гульні ў абрадавай практыцы. Абрадавая гульня як карнавалізаваныя формы абрадаў. Дэсакралізацыя гульні.

Месца гульні ў народным святе. Узаемасувязь гульні і мастацтва. Гульня дапамагае развіваць такія мастацкія якасці як фантазія, густ да музыкі, слова, назіральнасць, любоў да прыгожага. Пэўны эмацыянальны настрой стварае народная музыка.

Гульня і развіццё пазнавальнай дзейнасці чалавека. Этапы развіцця

пазнавальнай актыўнасці. Уменне засвоіць  і растлумачыць правілы гульні, паслядоўнасць выканання дзеянняў, падвесці вынікі.

Гульня і фізічнае развіццё чалавека. Узроставыя і псіхафізічныя асаблівасці правядзення гульняў. Удзельнікі гульні авалодваюць такімі здольнасцямі як фізічная вынослівасць, лоўкасць, спрытнасць, асцярожнасць.

Псіхолага-педагагічныя асновы гульнёвых зносін.  Падчас гульні неабходна самастойна прыняць рашэнне. Цяжка знайсці лепшы спосаб у выхаванні для развіцця самастойнасці і рашучасці.  Гульні выхоўваюць сяброўскія адносіны сярод удзельнікаў, вучаць паважаць думку і правы іншых, разумець сэнс спаборніцтва, які заключаны ў гульне.

Гульні, якія выконваліся адпаведна порам года і каляндарным святам, дапамагаюць зразумець і засвоіць асновы традыцыйнай культуры. Гульня як сродак актывізацыі ўдзельнікаў свята. Гульня як форма стварэння перадсвяточнай і святочнай атмасферы.

Класіфікацыя сучасных гульнёва-забаўляльных праграм. Каляндарна-абрадавыя (у адпаведнасці са святамі каляндарнага цыкла) і сямейна-побытавыя (вяселле, радзіны, юбілеі, улазіны). Праграмы экалагічнай накіраванасці (свята лесу, свята кветак, свята птушак, свята на вадзе). Праграмы, прымеркаваныя да свят беларускай культуры (дзень ведаў, дзень пісьменства, свята гумару). Праграмы па ўзроставым прынцыпе, па месцы правядзення (на адкрытым паветры, у закрытым памяшканні); па сюжэту (конкурсныя, творчыя, спартыўныя); па характары падзелу гульцоў (каманды).

Каляндарна-абрадавыя гульні можна класіфіцыраваць па порах года. Зімовыя гульні падзяляюцца на характару правядзення - у закрытым памяшканні і на вольным паветры: а)     Калядныя гульні ў закрытым памяшканні, тэрытарыяльныя разнастайнасці. Тэатралізаваныя калядныя гульні беларусаў (“Жаніцьба Цярэшкі”, “Яшчар”, “Жаніцьба Бахара”, “Халімон”): мастацкія сродкі выразнасці. Тэрытарыяльныя асаблівасці вырабу калядных карнавальных касцюмаў, масак, рэквізіту. б)    Зімовыя ігрышчы на вольным паветры пры святкаванні Каляд і Масленіцы (“Цягнуць Каляду на дуба” (Бярэзінскі раён), “Кола” (Дзяржынскі раён), снежныя горкі, калядны карнавал “Конікі” у Давід-гарадку. Карнавалізацыя масленічных гульняў “Слуп”, “Перацягванне каната”, ледзяныя атракцыёны, аб’езд маладых коней. “Пахаванне дзеда” - абрадавая гульня.

Веснавыя і летнія абрадавыя гульні. Характыэрныя асаблівасці - качанне на арэлях, гульні з яйкамі, варожбы на вянках, абход жывёлы. Ігрышча “Гуканне вясны”. Выяўленне антрапаморфных і зааморфных персанажаў. “Тураўскі карагод” - юр’еўскае ігрышча моладзі.Ваджэнне

стралы - трансфармацыя старажытнага магічнага абраду. Культ раслін у сёмушным ігрышчы. Варожбы на засохлых галінках і вянках. Масавыя дзявоцкія варожбы на зелках і жытніх каласах. Купалле - шлюбная накіраванасць тэатралізаваных гульняў і карагодаў: “Марусіначка” (Рэчыцкі раён), “Выбар пары” (Барысаўскі раён). Гульнёвыя спаборніцтвы. Выкраданне купальскага агню. “Праводзіны русалкі”. Пошук папараць-кветкі. Танцавальныя гульні Купалля. Гульнёвыя дзеі агульнанародных купальскіх кірмашоў (неафіцыйныя конкурсы гуртоў вясковых музыкаў, конныя гульні, арганізацыя гандлёвых рыбалак, спаборніцтвы на вадзе). Адметныя гульнёвыя дзеі купальскіх кантрактовых кірмашоў (наладжванне танцавальных збораў, арганізацыя водных маскарадаў, карнавалаў)

Гульні на восеньскіх кірмашах. Характэрныя асаблівасці і тэрытарыяльныя адрозненні кірмашовых латэрэй (мінская, латарэя “па спісу”, столінская сельскагаспадарчая латарэя, заходнебеларуская грашовая латарэя і латарэі-рулеткі і інш.). Спартыўныя забавы беларускіх кірмашоў (турніры барцоў, выпрабаванні коней скакавых і цяглавых парод, рознаварыянтныя пераправы праз раку, перацягванне каната, абгонкі “на казе”).

*1.Восеньскія святы беларускага народнага календара.*

Беларусы восень лічаць ад ІллІ (які адзначаецца 02.08). Ілля –апекун земляробства і абаронца ад нячыстай сілы, які увабрау у сябе рысы язычніцкага бога Перуна. Свята дажджоу і навальніц. Успрымаецца як канец лета і пачатак восені. Ілля багаты на прыказкі “Прышоу Пятрок-апау лісток, прышоу Ілля- сарвау і два,; Ілля – набрау гнілля; На Іллю да абеда лета, а пасля абеду – восень; Ілля – жніва пачынае, а лета канчае”...

Першае восеньскае свята Спас – які мае 3 тэрміны. Гэта 1 Спас – які адзначаецца 14 жніуня і называецца Макавей (Макова, Макауе, Спас Медовік) або свята маку. Праводзілі абрады з макам,ужывалі у ежу, рабілі варэнікі з макам, а так сама елі тое у што можна было макаць. Асвечалі ваду, зелкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам, морваю, грудкі з маку. Пчалаводы правяралі пчол . Для сбору меду усе апрыналіся па-святочнаму.. Хаця і частаваліся перад асноунай падзеяй , але без гарэлкі і закусак з рэзкім пахам. Дымар запальвалі “жывым агнем, Выкарыстоувалі свяччоную ваду. Прыказкі сцвярджаюць “ Першы Спас проводы лета,Ад першага Спаса халодныя росы.

Спас “ 2” – (19.08) Яблачны Спас (Другі Спас, Вялікі Спас) Свята садавіны. Царква прыстасовывала да гэтага дня асвячэнне садавіны, пасля чаго дазволялася ужо есці яблакі, грушы, слівы. Таму і гаворыць “ Добра яблычка к Іспасу” Асвячалі так сама мед, каласкі новага ураджаю. Усе

можна было ужываць у ежу, аб чым і сцвярджала прыказка “ Спас- усяму час№ Пачыналі сеяць азіміну. (28.08; 15.09) Прачыстая (першая прачыстая) – свята ураджаю. Асвячалі “бараду” апошні снапок, зернем якога пасля прачыстай пачыналі засеукі, а так сама зелкі і городніну. Наладжвалі свята свечкі, пераносілі ее з адной хаты у другую, гасцявалі.

Наглядалі за бусл958, што на зжатых палетках збіраліся у вырай.

Амаль паусюду вядомы прыказкі “ Прышоу Прачыстая стало поле чыстае”

Спас -3 (29.08) Малы Спас, Хлебны спас – адно са свят хлеба. Шмат дзе спраулялі. Дажынкі – свята канца жніва. Упрыгожвалі ступкамі і кветкамі “бараду”. Ахвяровалі хлеб і соль духу нівы(Воласу) Зерне і каласкі ужывалі на працягу года у розных магічных абрадах.

На усе тры Спасы у Беларусі звычайна праводзіліся храмовыя святы, ва усход. Беларусі – кірмашы, у заход. Бел. – фэсты. Правіліся богаслуженні, святары асвячалі гандлі, людзі запрошалі да сябе у госці родзічай. Моладзь гуляла.

21.09; 08.10 – Багач (Малая Прачыстая, Другая Прачыстая) - старажытнае свята заканчэння уборкі зерневых.(У некаторых раенах лічылася першым днем восені) Зараз прымеркавана да Роства Белародзічы. Багачом або багатцам называлі так сама кошык з жытам і свечкаю. Яго на свята насілі у кожную хату і адрыму.Зерне у кошык збіралі з першага зажыначнага снапа, свечку рыхтавалі пад спеу дажынкавых мелодый.. Згодна павер’ям, Багач забяспечвау сем’і дабрабыт і шчасце. На Багача да усходу сонца гаспадар засявау ніву жытам, асвечаным яшчэ у Першую Прачыстую- “Прыйшоу Багач-кідай рагач, бяры сявеньку, сей па маленьку” Да свята стараліся скончыць касавіцу.

27.09.(14.10) Уздвіженне – свята “ закрывання зямлі на зіму”.Лічылася, што сонца і прырода іграе усімі колярамі. У гэты дзень не хадзілі у лес, бо там нібы збіраліся у клубкі гадзюкі і вужы, каб схавацца у норы на зіму. Гэта апошняе свята, якое развітваецца з цяплом.

14.10 – Пакровы (Трэцяя Прачыстая) – народнае свята глыбокай восені, пасля яго пачынаецца зіма. Сяляне стараліся закончыць палявыя работы, усебакова падрыхтавацца да зімы. Пакроу зауседы чакалі, бо тады было менш работы. Пачыналася пара вяселляу. Дзяучаты варажылі на замужжа.

На усей тэрыторыі бел. адбываліся кірмашы.

Такім чынам святы восені гэта святы накіраваныя на забеспячэнне збору ураджаю і яго захаванні на зіму.

*Тэма 3. Методыка правядзення гульняў*

Узроставыя асаблівасці правядзяння гульняў для дзяцей і падлеткаў. Этапы развіцця пазнавальнай актыўнасці. Афектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці. Здольнасць тлумачыць умовы гульні для дзіцячага разумення. Разгляд беларускіх дзіцячых гульняў па запісах этнографаў XIX стагоддзя.

*Тэма 4. Распрацоўка сцэнарыяў гульнёвых фальклорных прадстаўленняў*

Мастацкае бачанне свету як асноўны элемент асобы рэжысёра. Імкненне да крытыкі ідэй. Пошук сюжэта фальклорнага прадстаўлення. Тэхналогіі творчага мыслення. Апісанне месца дзеяння. Падбор гульняў – падзейны рад.

Як вядома, праз культуру асоба набывае агульначалавечыя каштоўнасці, авалодвае якасцямі "культурнай асобы", грамадскай адказнасцю. На сучасным этапе ў школах спецыялізаваныя прадметы па вывучэнню нацыянальнай культуры знаходзяцца на другасным плане, што безумоўна ўплывае на ўзровень эстэтычнага, культурнага і духоўнага развіцця асобы. Для вырашэння дадзенай праблемы неабходна ў першую чаргу разглядзецьтакі ўнівесальны сродак выхавання падрастаючага пакалення як народна-гульнёвая дзейнасць.

На педагагічныя магчымасці народнай гульні ў свае часы звярталі ўвагу вядомыя навукоўцы, педагогі і псіхолагі, такія як А.Г. Кіркор, С. Цярохін, П.В. Шэйн, Я.Р. Вількін, Е.Р. Раманаў, М.Я. Нікіфароўскі і іншыя.

У канцы 20-ага стагоддзя навукоўцамі была зроблена спроба больш пашыранага вывучэння праблемнага поля выхавання праз гульню. Каб больш уважліва разглядзець педагагічныя магчымасці народнай гульні, лічу мэтазгодным разглядзець падыходы да іх класіфікацыі.

Педагагічныя магчымасці гульні разглядалі ў розныя часы вядомыя навукоўцы: П.П. Блонскі, А.У. Сухамлінскі, Ю.П. Лазаранка, А.В. Мудрык, Г.І. Камаева, В.М. Грыгор’еў, Э.В. Панічава, Л.І. Казлоўская. На думку Л.С. Выгоцкага “у гульні магчымы вышэйшыя духоўна-маральныя дасягненні чалавека, якія ў далейшым становяцца яго сярэднім стандартным узроўнем, яго звычайнай мараллю”. Гульня пранікае і суправаджае ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Яна ўзбуджае ўя’ўленні, актывізіруе фантазію дзяцей, мабілізуе іх да набыцця новых ведаў. У гульні выхоўваюцца маральна-эстэтычныя якасці, агульначалавечыя каштоўнасці, развіваецца і павышаецца культура мовы і камунікатыўныя зносіны, удасканальваецца іх рэакцыя на акружаючы свет, выхоўваюцца паважлівыя і гуманныя адносіны да сябе, другога, да прыроды. Народная гульня далучае дзяцей да

нацыянальнай культуры і гісторыі. Такая мнагаграннасць (поліфункцыянальнасць) гульні актывізуе ўсебакое развіццё асобы.

Народныя гульні з рэквізітам дапамагаюць удзельнікам творча і з асабістай фантазіяй падыйсці да здзяснення пастаўленых умоў у гульні. Раскрыццё фізічных магчымасцяў і здольнасцяў, накіраваны народныя гульні сямейна-радавой абраднасці беларусаў. Яны спрадвеку адлюсроўвалі комплекс імітацыйных працоўных дзей, якія ахарактэрызоўвалі земляробчы працоўны цыкл. Да такіх гульняў адносяцця народныя гульнёва-абрадавыя формы праверкі гатоўнасці падлеткаў да адказнай справы (гульня на свята Юр’е “Пастушок”, на Масленку “Жарабец ці Павадыр”, на Купалле “Выпрабаванне праз раку”, “Скокі праз вогнішча”, і іншыя).

Значная частка народнага гульнёвага фонду беларускіх традыцыйных гульняў прысвечана гендарнаму выхаванню. Драматызаваныя народныя гульні з лялькамі і цацкамі выхоўваюць у дзяўчынак якасці клапатлівых гаспадынь, пачуцці мацярынства, пашаны, павагі, адказнасці за другога. Ролевыя дзіцячыя гульні ў бацькоў, “Дочкі мацяры”, “Хатка”, “Лялькі”, “Гаспадыня”, “Бабіна страўня” накіраваны на развіццё працоўных здольнасцяў дзяўчынак, фарміраванне ўменняў па вядзенню гаспадаркі і сямейных спраў.

У адрозненні з дзявочымі гульнямі, гульні для хлопчыкаў накіраваны на развіццё такіх якасцяў, як смеласць, мужнасць, вынослівасць, цярпенне, працавітасць. Народныя гульні для хлапчукоў прысвечаны фарміраванню якасцяў сапраўднага гаспадара. У разуменні нашых продкаў, сапраўдны гаспадар павінен добра весці гаспадарку, быць фізічна моцным і вынослівым, спрытным, кемлівым, разважлівым і памяркоўным. Што датычыцца сучаснага выхавання хлопчыкаў у працэсе народнай гульні, то ў асноўным яны накіраванні на развіццё фізічных здольнасцяў. Такія гульні як, “Конікі”, “Пастушок”, “Пеўні”, “Схованкі”, “Гусі” разам з фізічным выхаваннем фарміруюць ў хлапчукоў навыкі гаспадарчай працоўнай дзейнасці. Як эфектыўны інструмент выхавання, народная гульня знайшла сваё прызначэнне, якасрава ўпісаўшыся, ў святочна-абрадавую культуру Беларусі. Народная гульня стала паўнапраўным элементам (эпізодам) святочных мерапрыемстваў. Але ж на вялікі жаль, творчы і выхаваўчы патэнцыял народных гульняў у святочнай культуры рэалізуецца не ўпоўным аб’ёме.

Гульня, як эфектыўны інструмент выхавання знайшоў сваё прызначэнне, якасрава ўпісаўшыся, ў святочна-абрадавую культуру Беларусі. Гульня стала паўнапраўным элементам (эпізодам) святочных мерапрыемстваў. Але ж на вялікі жаль, творчы і выхаваўчы патэнцыял народных гульняў у святочнай культуры рэалізуецца не ўпоўным аб’ёме. На

сучасным этапе выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу народнай гульні ў святочнай культуры мае шмат праблемных аспектаў.

Народная гульня з’яўляецца эфектыўным інструментам выхавання духу адзінства нацыі, павагі і гордасці да гісторыі народа і краіны. На сучаным этапе ў працэсе нязначнага выкарыстання выхаваўчага патэнцыялу народнай гульні паўстае вострая праблема пошуку механізмаў фарміравання інтарэсаў маладога пакалення да нацыянальнай культурнай спадчыны беларусаў. На гэтае пытанне мы паспрабуем даць адказ абапіраючыся на семіялагічнае вызначэнне цікавасціяк феномена сацыяльна-культурнай дзейнасці. Па меркаванню Г.І. Шчукінай тэрмін “цікавасць” падчас свайго развіцця характарызуецца пазнавальнай актыўнасцю; яснай выбарчай накіраванасцю да дзейнасці; каштоўнаснай матывацыяй, якая садзейнічае пранікненню асобы ў істотныя сувязі, адносіны, заканамернасці пазнання. Дадзены даследчык выяўляе наступныя паказчыкі пазнавальнай актыўнасці дзяцей. Першым з іх-пазнавальная актыўнасць. Якой жа характарыстыкай пазначыць актыўнасць дзяцей у рамках святочнага мерапрыемства?

Дзеля гэтага нам патрэбна сінтэзаваць класічныя псіхолага-педагагічныя паказчыкі пазнавальнай цікавасці дзяцей з кампазіцыйна-драматургічным падзелам самой формы гульні. У дадзеным выпадку мы назіраем цесную ўзаемасувязь паміж псіхалагічным станам дзяцей ў працэсе гульні яе з непасрэднай арганізацыяй. Мэтай дадзенага спалучэння з’яўляецца фіксіраванне дынамікі пазнавальнай цікавасці школьнікаў і выяўленне заканамернасці іх уключэння ў працэс святочнай народнай гульні. Дзеля гэтага намі быў пабудаваны паслядоўны ланцужок з паказчыкаў уключэння дзяцей у гульню.

Па сваёй архітэктонікі народная гульня мае 7 эпізадычных элементаў, па прынцыпах драматургіі іх можна ўпарадкаваць наступным чынам:

Экспазіцыя: - Тлумачэнне ўмоў гульні.

Пралог: - Працэс актывізацыі ўдзельнікаў гульні.

Завязка: - Выбар удзельнікаў і размеркаванне роляў.

Развіццё дзеі: - Працэс гульнёвых спаборніцтваў.

Апафеоз: - Вынікі спаборніцтваў.

Кульмінацыя: - Узнагарода пераможцаў.

Фінал: - Вынікі гульні.

Пазнавальная цікавасць, як дзеясны працэс, таксама мае сваю лагічную паслядоўнасць, складзеную з паказчыкаў уключэння гульцоў у працэс гульнёвай дзеі.

Экспазіцыйнаму этапу народнай гульні адпавядае такі псіхафізічны паказчык цікавасці як увага. Па вызначэнню К.С. Станіслаўскага ўвага - гэта

“процесс полного сосредоточения всех психофизических сил на заданом объекте”. У дадзеным выпадку, лагічна абгрунтоўваецца псіхафізічны стан школьніка ў працэсе тлумачэння ўмоў гульні. Удзельнік ўважліва слухае ўмовы гульні і абгрунтоўвае атрыманую інфармацыю, ўмоўна транслуючы яе на ўласныя паводзіны, карацей кажучы, як “Я” буду дзейнічаць у прапанаваных мне абставінах.

На другім драматургічным этапе народнай гульні пралогу, актуалізуецца працэс актывізацыі ўдзельнікаў, якому адпавядае такі паказчык пазнавальнай цікавасці як ініцыятыўнасць, іншымі словамі працэс самастойнага безпрымусовага праяўлення цікавасці да гульні.

На трэцім кампазіцыйным узроўнінароднай гульніажыцяўляецца працэс выбару ўдзельнікаў і размеркаванне роляў. Тут паказчыкам пазнавальнай цікавасціз’яўляецца дзіцячая скіраванасць да гульнёвай дзейнасці. Гэта азначае, што ўдзельнікі гульні азнаёмлены з умовамі і правіламі выпрабавання і ўжо знаходзяцца ў поўнай гатоўнасці дзейнічаць у межах гульнёвых правіл.

Развіццём дзеі, як працэса гульнёвых спаборніцтваў адпавядае паказчык праяўлення пазнавальнай цікавасці - узровень дзіцячай актыўнасці і праява самастойнасці ў працэсе гульні. На дадзеным этапе выяўляецца псіхафізічныя здольнасці, жаданне і ўнутраны настрой удзельнікаў. Вядома, што школьнікі характарызуюцца сваёй гіперактыўнасцю, празмернае праяўленне самасці і фізічнай актыўнасці. У гэтым выпадку праяўленне актыўнасці дзяцей знаходзіцца на высокім узроўні.

Па псіхаэмацыянальнай напружанасці наступны эпізод гульні па драматургіі вызначаны тэрмінам “апафеоз” як найвышэйшая эмацыянальная кропка ўсёй гульнёвай дзеі”. У кантэксце гульні найвышэйшая кропка эмацыянальных праяў адпавядае эпізоду агучвання вынікаў спаборніцтваў, таму пазнавальная цікавасць дзяцей грунтуецца на вымярэнне характару іх эмацыянальных праяў.

Кульмінацыйным элементам пастраення гульнёвай дзеі з’яўляецца працэс ўзнагароды пераможцаў і суцяшальнае адорванне пераможаных. Паказчык пазнавальнай цікавасці па характару супадае з паказчыкам цікавасці на ўзроўні апафеозу. Кульмінацыя тлумачыцца як найвышэйшая кропка развіцця канфлікту, пасля чаго ўся дзея па напружанасці ідзе на спад.

Фінальны эпізод народнай гульні вызначае яе паскрыптуальныя вынікі, дзе ў поўным аб’ёме тлумачыцца і раскрываецца аўтарская ідэя, іншымі словамі “дзеля чаго мы з вамі гулялі?”. Таму фінал гульні накіраваны на далейшае зацікаўленне дзяцей да гульнёвай творчасці,паглыбленае набыццёведаў, прынякцце адпаведнай ідэйнай пазіцыі.

Пры арганізацыі і правядзенні гульнёвай дзеі патрэбна спасылацца на дадзеную архітэктоніку, бо на кожным узроўні арганізатар ці вядоўца гульні будзе яскрава бачыць паказчыкі пазнавальнай цікавасці ўдзельнікаў, што дае магчымаць якаснага псіхолага-педагагічнага суправаджэння гульні. Гэта дазваляе арганізатару гульні на любым узроўні прааналізаваць паводзіны ўдзельнікаў і скарэктаваць іх далейшае дзеянне. Калі пры рэфлексіі на пэўным этапе паказчык пазнавальнай актыўнасці не супадае з эпізодам па архітэктоніцы, то гульня ідзе не па правілах, і на якімсьці этапе арганізатар дапусціў памылку. Улічваючы лагічна пабудаваны ланцужок паказчыкаў пазнавальнай цікавасці можна прадбачыць, на якіх этапах гульні ўдзельнікі будуць праяўляць найбольшую актыўнасць, а на якіх не. У гэтым выпадку арганізатар можа ўносіць свае карэктывы, дзеля таго каб працэс гульні непарушаўся.

Такім чынам, асноўная задача арганізатараў гульнёвай дзеі непарушыць прадстаўленую намі паслядоўнасць з паказчыкаў дзіцячай цікавасці, што ў сваю чаргу паўплывае на наступныя складаючыя псіхолага-педагагічнага суправаджэння:

1. Гарантаванасць якаснага гульнёвага працэсу. Гульнёвая дзея пройдзе без сцэнарных і арганізатарскіх пагрэшнасцяў і па запланаваных аўтарам межах, і якаснай характарыстыкай самаго працэсу гульні.

2. Мінімалізацыйнасць уплыву на працэс гульні знешніх фактараў свята. Улічваючы лінейнасць і паслядоўнасць псіхафізічнага праяўлення ўдзельнікаў у працэсе гульні, для арганізатараў прадбачна ступень верагоднага ўплыву знешніх фактараў на сам працэс гульні.

3. Станоўчыя ўражанні ўдзельнікаў гульнёвага працэсу ад гульні. Калі гульнёвая дзея пройдзе па запланаваным аўтарскім якасна-эмацыянальным маршруце, улічваючы бесперапыннасць праяўлення эмацыянальных паказчыкаў цікавасці, то гарантавана, што ўдзельнікі застануцца ў задавальненні ад гульнёвага працэсу.

4. Станоўчыя вынікі гульні, запланаваныя арганізатарам на свяце. Пры планаванні гульні, арганізатар прадбачыць на розных этапах гульнёвага працэсу эмацыянальна-псіхалагічны паказчык удзельнікаў гульні, іх ступені эмацыянальных праяў, што дазваляе скарэктаваць выніковую пазіцыю ў гульні.

5. Прадбачнасць і падкантрольнасць.Ход гульнёвай дзеі арганізатару вядомы, эмацыянальныя межы праяў удзельнікаў гульні таксама, атрымліваецца, што гульнёвы працэс для арганізатара відавочны, што дазваяле яго кантраляваць.

6. Уплыў вядоўцаў гульні на ўдзельнікаў. Ведаючы эмацыянальную складаючую ўдзельнікаў на кожным этапе гульні, вядоўцы могуць карэктыровачна-маніпуляцыйным ўздзеяннем кантраляваць працес гульні.

7. Кантроль за эмацыянальна-псіхалагічным станам ўсіх ўдзельнікаў. Арганізатарам гульні вядзецца кантроль за адпаведнасцю псіхаэмацыянальнага праяўлення ўдзельнікаў гульнёвага працэсу адпаведна дадзенаму драматургічнаму этапу гульні.

8. Своечасовыя арганізатарскія карэктывы ў працэсе гульні. У выпадку неадпаведнасці псіхаэмацыянальнага стану гульцоў для дадзенага эпізоду гульні арганізатар вядзе карэктыроўку ўмоў гульнёвага працэсу.

*Тэма 5. Прафесійныя якасці вядучага гульні.*
*Роля вядучага як арганізатара гульні*

Гульнявыя мізансцэны і месцазнаходжанне вядучага. Умовы прыцягнення ўвагі гледачоў да падзей на гульнявой пляцоўцы. Вядучыя гульнявых праграм: касцюм, паводзіны і моўнае дзеянне.

Вядзенне разнастайных форм культурна-адпачынкавых праграм – своеасаблівае мастацтва, якое мае спецыфічныя рысы і асаблівасці, патрабуе наяўнасць пэўных здольнасцей, камунікатыўных якасцей, пазнання яе законаў, практыкі, а таксама сакрэтаў прафесійнага майстэрства. Функцыі вядучага культурна-адпачынкавых праграм вельмі разнастайны. Ён павінен не толькі інфармаваць, але і арганізазаваць аўдыторыю, зацікавіць яе, уцягваць у драматургічнае і сцэнічнае дзеянне, ствараць асабую атмасферу праграмы, а таксама злучаць усе кампазіцыйныя кампаненты, падпарадкоўвая іх адзінай ідэйна-тэматычнай задуме.

Роля вядучага ў адпачынкавай праграме як арганізатара пазасюжэтнай сувязі паміж эпізодамі. Вядучы як пазасюжэтны персанаж. Характарыстыка асноўных функцый вядучага і прыёмы іх рэалізацыі. Вядучы – інфарматар. Вядучы – каментатар. Вядучы – правакатар.Вядучы – арганізатар. Вядучы – акцёр. Работа рэжысёра-пастаноўшчыка адпачынкавай праграмы з вядучым. Выкарыстанне прыёму імправізацыі ў рабоце вядучага. Тыпы імправізацыі. Характарыстыка прафесійных уменняў і навыкаў вядучага культурна-адпачынкавай праграмы.

Структура майстэрства ў сістэме К.С.Станіслаўскага. Акцёрскія прыёмы і метады як спосабы авалодання рамяством вядучага адпачынкавай праграмы. Характарыстыка камунікатыўных уменняў і навыкаў вядучага. Асноўныя шляхі і спосабы іх фарміравання.

Студэнты рыхтуюць адказы на гэтыя пытанні ў працэсе *самастойнай работы***.**

Сцэнічны вобраз вядучага. Роля “прапаноўваючых абставін” ( па К.С.Станіслаўскаму) у пошуку сценічнага вобраза вядучага. Залежнасць вобраза вядучага ад формы культурна-адпачынкавай праграмы.  Вобраз і імідж вядучага.

Мова як аснова камунікацыі вядучага і аудыторыі. Значэнне культуры мовы для вядучага адпачынкавай праграмы. Моўныя сродкі выразнасці ( (сегментаваныя  і далучальныя канструкцыі, паўтор слова альбо словазлучэння, інверсія, метафара, алегорыя і г.д.). Невербальные сродкі выразнасці ( умоўныя і няўмоўныя жэсты, перадаючыя жэсты, міміка).

*Тэма 6. Кампазіцыйная пабудова гульнёвых фальклорных прадстаўленняў*

Экспазіцыя гульнявагафальклорнага прадстаўлення – стварэнне адпаведнай гульнявой атмасферы. Сюжэтная лінія як форма ўвасаблення ідэі рэжысёра. Персанажы як носьбіты эмацыянальнага зерня. Кульмінацыя – вызначэнне пераможцаў. Фінал – узнагароджанне лепшых.

*Архітэкноніка* –(ад грэч. – архітэктар) – гэета канструктыўна – вобразная аснова, спосаб пабудовы канфлікта, гэта пабудова твора, як адзінага, узаемасувязь асноўных складаемых яго частак і элементаў.

*Камапазіцыя* –(ад лац. – “складанне”) – пабудова мастацкага твора, вызначаная сістэма сродкаў раскрыцця, стварэння вобразаў, іх сувязей і адносін.

Кампазіцыяная пабудова свята падпарадкоўваецца ідэйнаму зместу, стварэнню адзінага масавага відовішча.

*Архітэктоніка*складаецца з: а) экспазіцыі, б) завязкі, в) развіццё дзеі, г) клумінацыі, д) развязкі.

*Экспазіцыя* –(ад лац. – “тлумачэнне”)  - гэты мерапрыемствы і аргіназацыйныя моманты, якія выконваюцца да пачатку масавага відовішча, гэта ўвод усіх прысутнічых гледачоў у курс адбываючайся падзеі. У тэатры гэта уведзенне гледача ў сітуацыю, патэнцыяльна трымаючую ў сабе некаторый канфлікт.

Можна арганізаваць выставы, які япрацуюць непасрэдеа на свяце, аформіць фотавернісаж, запланаваны радыёканцэрт, гэта можа быць зазыванне удзельнікмі свята гледачоў, аб’езд скамарохамі двароў на коніках і інш. Трэба стварыць неабходную святочную атмасферу. У экспазіцыі свята павінны ўключыць афармленне вуліц, стадыёна, плошчы. Экспазіцыя свята – гэта своеасаблівы фон будучых дзеянняў.

*Завязка* –гэта асноунае дзеянее свята, пачатак развіцця тэмы, яна павінна адпавядаць папярэдняй экспазіцыі, падаваць лагічную паслядоўнасць

і дакладнасць.

*Кульмінацыя* – (ад лац. “вышыня”) – вышэйшая кропка напружання ў развіцці дзеяння (гэта можа быць спальванне чучала, узнагарода пераможцаў). У спектаклі – нэта вышэйшая кропка напружання ў развіцці канфлікта, які ўваходзіць у аснову сюжэта драматычнага твора (сцэна з пісьмом: “Верна, ці не верна!”).

*Катастрофа* –(у п’есе) – частка п’есы, якая па эмацыянальнаму началу вышэй кульмінацыі (удушэнее Атэлам), а па сутнасці лагічнага развіцця з’яўляецца спадам дзеяння. У свяце – *апафіёз* – завяршенне падзеі (нейкае ўзнагароджанне).

*Спад* – фрагмент драматычнага твора, дзе канфліктане сутыкненне пачынае спадаць і ўжо зразумела якім будзе фінал дзеяння.

*Развязка* –завяршэнне падзей, вырашэнне супярэчнасцей, момант вырашэння канфлікту. У свяце не бывае развязкі, свята – гэта комплекс мерапрыемств.

*Фінал* – можа быць, як пасляслоўе, ён як момант замацавання ў свядомасці людзей у ідэйна-тэматычнай накіраванасці (гала – канцэрт, салют, песня, карагод)

У п'есе фінал вызначае сілу ўздзеяння і пафас усяго твора (таямнічы фінал "Гамлета" - Шэкспіра). Фіналам можа быць піратэхнічнае дзеянне

*Канфлікт* – сутыкненне, “барацьба”, з’яўляецца галоўнай сілай развіцця дзеяння. Момант глыбіннай архітэктонікі твора.

Трохвуголнік Арыстоцеля 1. завязка (пачатак канфлікту),

2. кульмінацыя (найвышэшы накал, барацьба у вырашэнне праблемы),

3. фінал – (момант вырашэння канфлікту)

### *Тэма 7. Прыёмы актывізацыі і дэактывізацыі ўдзельнікаў гульнёвых фальклорных прадстаўленняў*

Неабходнасць эфектыўнага запрашэння людзей да ўдзелу ў гульнях. Прыёмы свядомай і бессвядомай актывізацыі гледачоў на свяце. Разгляд выпадкаў для дэактывізацыі ўдзельнікаў.

### *Тэма 8. Пастаноўка фальклорнага прадстаўлення*

Этапы распрацоўкі сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення. Работа над эксплікацыяй і тэкстам сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення. Рэпетыцыі ў «выгарадках» – вызначэнне спаборніцтва ў гульнях, удакладненне тэкстаў вядучых, дзеянняў памочнікаў. Тэхнічныя рэпетыцыі – падбор музычнага суправаджэння, кадраў відэапраекцыі. Зводныя рэпетыцыі. Генеральны прагон. Удакладненне слабых бакоў фальклорнага прадстаўлення.

*Рэпетыцыя* (лац. *repetitio* – паўтарэнне) – дзейнасць па падрыхтоўцы абрадавай дзеі, работа па развучванні тэксту і сцэнічнай ігры, выконваемая акцёрамі пад кіраўніцтвам рэжысёра. Нягледзячы на тое, што семантыка слова змяшчае сэнс амаль механічнай работы, кожны раз рэпетыцыі павінны праходзіць па-новаму, творча.

*У застольны перыядрэпетыцый* рэжысёр абрадавай дзеі абгрунтоўвае свой выбар, вызначае актуальнасць і сацыяльную значнасць абраду, яго тэму і ідэю; гэта таксама чытка літаратурнага сцэнарыя, размеркаванне роляў, рэжысёрская характарыстыка кожнага персанажа, вызначэнне скразной дзеі, канфліктнай асновы, чытанне сцэнарыя па ролях, раскрыццё ўнутраных маналогаў.

*Планіровачныя рэпетыцыі* – рэпетыцыі ў "выгарадках", у прадметна-рэчавым асяроддзі, якія ўмоўна мадэлiруюць мастацка-дэкаратыўнае афармленне будучай абрадавай дзеі, пошук выразных мізансцэн, дзейсны аналіз абраду.

*Мантажныя рэпетыцыі* – неабходны этап работы над увасабленнем абраду, які дае магчымасць асобна адрэгуляваць усе тэхнічныя пытанні перад зводнай рэпетыцыяй, ці прагонам, а ўжо потым уводзіць выканаўцаў у гатовую тэхнічна абсталяваную сцэнічную прастору: удакладненне мастацка-дэкаратыўнага, светлавога, гукавога афармлення дзеі на пляцоўцы.

*Прагонныя рэпетыцыі* – аб'яднанне асобных эпізодаў абраду ў адзінае сцэнічнае дзеянне, карэкціроўка мізансцэнічнага малюнка, мастацка-дэкаратыўнага і музычнага вырашэння. Падчас прагонных рэпетыцый рэжысёр не спыняе дзею, а, запісаўшы заўвагі, аналізуе паказ разам з артыстамі. У першую чаргу такія рэпетыцыі неабходны і пастановачнай групе, і самім удзельнікам абраду, каб у свядомасці кожнага з іх сфарміраваліся агульнае бачанне і тэмпарытм сцэнічнай дзеі.

*Генеральныя рэпетыцыі* – завяршальны этап работы над увасабленнем абраду. Падчас такіх рэпетыцый рэжысёрска-пастановачная група ацэньвае працэс падрыхтоўкі і ўвасаблення абраду, работу музычнага кіраўніка, хормайстра, грымёраў, касцюмераў, мастакоў і інш. Пасля рэпетыцыі рэжысёр дае заўвагі і робіць прапановы кожнаму з выканаўцаў па ўдасканаленні работы на сцэнічнай пляцоўцы; на наступны дзень назначаецца карэкціровачная рэпетыцыя з улікам выпраўлення недахопаў і праводзіцца другая генеральная рэпетыцыя.

*1.Рэжысёрскі праект (агульная характарыстыка)*

Свята – тэатралізавана-святочнае дзеянне, якое адзначае падзею ў жыцці грамадства і ўключае ў працэс арганізацыю падрыхтоўкі свята людзей розных узростаў і сацыяльных катэгорый.

Святы падзяляюцца на: а)народныя святы каляндарнага цыклу; б)святы сельска-гаспадарчай накіраванасці; в)святы гарадоў і вёсак, прафесій; г)сямейна-бытавой накіраванасці; д)святы, прысвечаныя юбілеям; е)новыя святочныя формаўтварэнні (на аснове нацыянальнай традыцыі) – гумару, рамёстваў, народнага мастацтва, пісьменства, ведаў і г.д.

Рэжысёрскі праект свята ўключае ў сябе: 1)творчую заяўку; 2)задума свята і яе кампаненты; 3)гісторыка-рэтраспектыўны аналіз; 4)сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка; 5)арганізайцыйна-вытворчы план.

У творчую заяўку ўваходзіць: а)актуальнасць і сацыяльная значнасць падзеі; б)мэты і задачы пастаноўкі; в)колькасць зацікаўленых арганізацый у правядзенні свята; г)месца і тэрмін свята; д)праграма свята; е)папярэдні каштарыс.

Задума і яе кампаненты складаюцца з: а)падзеі, якую адзначае свята; б)тэмп; в)ідэі – звышзадачы; г)каму адрасавана свята (адрас); д)месца правядзення, яго асаблівасці; е)форма ўвасаблення свята.

Сцэнар-рэжысёрская распрацоўка – гэта: а)агульны сцэнарны план свята ў кампазіцыйнай пабудове; б)творчыя і арганізацыйныя дзеі, стварэнне передсвяточнай атмасферы; в)сцэнарна-рэжысёрскі ход; г)эпізоды свята; д)мастацкі вобраз свята.

У арганізацыйна-вытворчы план свята ўваходзіць: а)арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя; б)рабочы план па падрыхтоўцы і правядзенні свята; в)гукавое афармленне; г)рэклама свята; д)арганізацыя святочнага гандлю; е)работа дапаможных служб; ж)музычная партытура; з)графік правядзення рэпетыцый; і)размяшчэнне і харчаванне ўдзельнікаў і гасцей; к)схемы вузлавых мізансцэн; л)схема арганізацыйнага камітэта свята; м)агульны каштарыс.

### *Тэма 9. Народны святочны каляндар сучаснай Беларусі*

Тэндэнцыі развіцця святочных мерапрыемстваў. Традыцыйныя каляндарныя святы і новыя святочныя формаўтварэнні. Месца фальклорнага прадстаўлення і гульнявых блокаў у сучасных святах Беларусі.

Звычаі, абрады, рытуалы суправаджаюць чалавека на працягу ўсяго жыцця – ад нараджэння да смерці. Узніклі яны на глебе веры, працоўнай дзейнасці і быту людзей, іх адпачынку. Тыя, што дайшлі да нас, маюць сінкрэтычны характар і ўвабралі элементы язычніцкай, хрысціянскай і свецкай культур. Народныя традыцыі не ўзнікаюць і не знікаюць хутка. Неабходны дзесяцігоддзі, а можа і стагоддзі, перш чым абрад ці звычай набудзе агульнанацыянальны характар.

*Святочная культура* – частка духоўнай народнай культуры,

шматузроўневая сістэма святочных традыцый, звычаяў, абрадаў, цырымоній, якія адлюстроўваюць працоўную дзейнасць чалавека і бытавыя норавы соцыуму ў яго гістарычным развіцці.

*Традыцыя* – гэта генетычная памяць нацыянальнай культуры кожнага народа, якая ахоплівае вялікае кола з'яў і праяўленняў, характэрных для ўсіх сфер сацыяльнага жыцця. Традыцыя разглядаецца як механізм перадачы сацыяльна значнага вопыту індывідуума або калектыву ад пакалення да пакалення.

У сучаснай святочнай практыцы адбываецца працэс рэанімацыі, рэстаўрацыі і трансфармацыі рэшткаў культурнай спадчыны розных гістарычных напластаванняў, якія здольныя інтэграваць паміж сабой, пераўтвараючыся ў навацыйныя элементы традыцыі і культурнага фонду нацыі. Але згодна тэорыі вечнага руху прыроды і грамадства любая навацыя абавязкова мадыфікуецца ў традыцыю.

Чалавек, які нараджаўся і жыў у арэоле бытавання традыцыйных архаічных формаў культуры, цалкам падпарадкоўваўся яе нормам і законам, пачынаючы ад глабальна-абстрактных (усведамленне агульнай карціны свету, погляды на рэлігію, тэорыю нараджэння і знікнення суб'ектаў сусвету), заканчваючы канкрэтнымі бытавымі правіламі штодзённага апранання, харчавання, працы, святкавання і інш. У архаічным абшчынна-вясковым соцыуме традыцыя існавала як працяглая ўстойліва-нязменная і недатыкальная форма быцця, своеасаблівая сістэма каштоўнасцей з міфічнай першаасновай. Нашы прашчуры прытрымліваліся тыповага для земляроба календара з уласцівымі яму святамі, якія вызначаліся па перыядах сонцазвароту і раўнадзенства,ушаноўвалі асобных прадстаўнікоў язычніцкага пантэона багоў і міфічных істот, адказных за фазы развіцця ўраджаю. У розныя перыяды эвалюцыі грамадства міфалагічную аснову традыцыі замяняла пануючая ў той час ідэалогія. Прагрэсіўныя навацыі эпохі Асветы, абапіраючыся на рэалістычныя погляды сваіх галоўных дзеячаў, трактавалі традыцыю як рэлігійны фанатызм і невуцтва. У часы Рамантызма яе атаясамлялі з прыродай, натуральна склаўшымся арганізмам, захаваўшы пры гэтым яе супрацьлегласць розуму. Дасягнуўшы пэўнага ўзроўню самасвядомасці, традыцыя прымала рацыянальны характар і ўспрымалася як звычай або норма. У савецкі перыяд і ў час перабудовы адмова ад традыцый паставіла пад пагрозу самаідэнтыфікацыю нацый былога Савецкага Саюза, што садзейнічала калектыўнай сацыяльнай абыякавасці, апатыі і развіццю ідэалагічнага нігілізму.

На стадыі ўзнікнення і першапачатковага існавання народная святочная традыцыя заўсёды прасякнута сакральнасцю і непарушальнасцю, дзейнічае

пастулат яе вечнасці, неўміручасці. Але непрыметна для чалавека яна пастаянна ўдакладняецца і з цягам часу пераўтвараецца ў эпізадычны сегмент трансфармаванага свята.

Традыцыя як феномен вызначаецца катэгорыяй агульнага – комплексам элементаў і з'яў, якія аб'ядноўваюць народ. Адначасова агульнае можа існаваць як асобнае, уласцівае толькі пэўнаму этнасу, рэгіёну, мясцовасці, здольнае вылучаць дадзеную групу сярод іншых. Аб'яднанне элементаў культуры асобных локусаў у адну схему ўспрымаецца як агульнанацыянальная традыцыя, якая з цягам часу пры захаванні знешняй формы страчвае свой першапачатковы змест, аўтэнтычнасць. Вядомы рускі фалькларыст К.Чыстаў адзначае, што ў працэсе этнічнай кансалідацыі сучасных нацый і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўзнікае тэндэнцыя да стварэння культурнай аднароднасці, у выніку чаго з'яўляюцца ўмоўна традыцыйныя, абагуленыя, агульнанацыянальныя формы, якія не супадаюць з існуючымі лакальнымі і становяцца сімваламі нацыянальнай культуры.

Адной з унікальных якасцей традыцыі можна назваць яе *варыятыўнасць* (ад лац. variation – відазмяненне другарадных элементаў пры захаванні асноўнага) – здольнасць адаптавацца да новай сацыякультурнай сітуацыі, змяняцца і ў той жа час заставацца самой сабой. Імправізацыя ў вербальнай сістэме перадачы абрадавага тэксту, рэалізацыі структурна-кампазіцыйных схем і сюжэтаў рытуальных комплексаў і асабістыя якасці іх выканаўцаў з'яўляюцца асноўнымі прычынамі трансфармацыі традыцыі.

У народным лексічным бытаванні паняцце "традыцыя" трапляе пад катэгорыю "заканамернага" і таго, што падтрымлівае заканамернасць. Парушыць гэту абумоўленасць можа толькі выпадак – спарадычная гульня, нявызначаныя, непрадказальныя паводзіны моладзі. Па законах зрытмізаванасці і цыклічнасці быцця абедзве з'явы – спрадвечнае "неабходнае" і хаатычнае "выпадковае" з цягам часу аб'ядноўваюцца ў адзіную абрадавую дзею.

У заканамерных паводзінах чалавека побач з пазітыўнымі абрадавымі дзеяннямі існуюць і негатыўныя. Прычым дрэннае не ўспрымаецца як выпадковае. У святочнай культуры беларусаў, акрамя рэгламентаваных паводзін, кожны індывід валодаў пэўнай свабодай у асобных рытуальных эпізодах. У якасці прыкладу варта прыгадаць масленічныя пераапрананні жанчын у маскарадныя эратычныя касцюмы і купальскую карнавальную ўседазволенасць моладзі, якая часам мела агрэсіўна-разбуральны характар. Галоўная функцыя масак у мінулым – стварэнне атмасферы святочнага іншабыцця, што неабходна чалавеку для псіхалагічнай разгрузкі і адключэння ад аднастайных штодзённых клопатаў.

У народным бытаванні лексема “традыцыя” ўжываецца ў аднолькавым кантэксце са словамі “звычай”, “рытуал”, “абрад”. Навукоўцы трактуюць традыцыю “як шырокае (родавае) паняцце, інстытут, які характарызуюць некаторыя прынцыповыя асаблівасці: па-першае, выбарачнасць – звязанасць з каштоўным культурным матэрыялам для пэўнага соцыуму; па-другое, паўтаральнасць, неабходная для замацавання мастацкага, этнаграфічнага матэрыялу ў межах гістарычнай дыстанцыі; па-трэцяе, яе практычны характар”.

*Звычай* – адна з відавочных і зменлівых праяў рэалізацыі традыцыі, якая ахоплівае ўсе сферы жыцця чалавека і абмяжоўваецца праяўленнем стэрэатыпных нормаў паводзін індывідуума ў штодзённым жыцці грамадства ці сацыяльнай групы.

*Абрад* – гэта ўсталяваная звычаем сістэма сімвалічных дзеянняў, якія афармляюць важныя падзеі грамадскага і асабістага жыцця чалавека. Пры змене традыцыі адбываецца трансфармацыя абраду. Некаторыя з цягам часу становяцца народнай гульнёй, забавай, варажбой, арганічна ўваходзяць у структуру новага святочнага формаўтварэння і набываюць накіраванасць на рэалізацыю іншай функцыі сацыялізацыі грамадства.

Абрад як форма ўвасаблення рэлігійных вераванняў не універсальны. Ён толькі адзін з існуючых сродкаў, пры дапамозе якога вера ўвасабляецца ў канкрэтнае дзеянне. У той ці іншы гістарычны перыяд па пэўных прычынах уяўленні чалавека могуць і не атрымаць сімвалічнага і фізічнага афармлення ўвогуле або атрымаць яго аднабаковае выяўленне. “Найбольш важным, найбольш істотным і разам з тым найбольш устойлівым элементам абраду на розных этапах развіцця аказваецца яго функцыя. У гісторыі абраду форма яго змяняецца, а функцыя пры гэтым часцей застаецца, хоць часам і тлумачыцца на новы лад”.

Вылучаюцца наступныя цыклы абрадаў: каляндарныя, рэлігійныя, аказіянальныя, грамадзянскія, абрады жыццёвага цыкла.

*Каляндарны* цыкл уключае абрады па пэўных рухомых і нерухомых датах народнага календара і падзяляецца на зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія, прымеркаваныя да сельскагаспадарчых работ. Каляндарныя абрады – поліфункцыянальныя. Даследчыкі вылучаюць у іх магічную, камунікатыўную, цырыманіяльную, гульнявую, геданістычную, эстэтычную абрадава-рытуальную, рэлігійную, сатырычную функцыі.

*Рэлігійныя* абрады – калектыўныя дзеянні, якія скіраваны на звышнатуральныя ілюзорныя аб’екты і выступаюць як спосаб рэалізацыі адносін паміж гэтымі аб’ектамі і чалавекам. Першакрыніцай рэлігійных абрадаў з’яўляецца магія. Старажытныя магічныя абрады былі цесна звязаны з

матэрыяльнай практыкай, адпаведна якой можна вылучыць наступныя віды магіі: лячэбную, любоўную, аграрную, промыслава-гаспадарчую, магію навядзення шкоды.

Правядзенне *аказіянальных* абрадаў адбываецца пры крытычным становішчы ў грамадстве (крызісныя) ці для магічнага выклікання падобнага крызісу (выклікання дажджу пры засушлівым надвор'і), пераадольвання прыроднага, грамадскага ці асобаснага крызісу (антыкрызісныя).

Да ліку *грамадзянскіх* абрадаў адносяцца вытворчыя, сямейныя, дзяржаўныя, палітычныя, прафесійныя. У залежнасці ад складу выканаўцаў грамадзянскія абрады падзяляюцца на асабовыя, групавыя, абшчынныя. Па гендэрнай і ўзроставай прыметах вылучаюцца дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя, дзявочыя, жаночыя, мужчынскія абрады.

Абрады *жыццёвага цыкла* часцей называюць сямейнымі. Галоўным аб'ектам гэтых дзей з'яўляецца канкрэтны чалавек на пэўнам этапе яго жыцця. Пры гэтым у абрадах у большасці ўдзельнічаюць іншыя сваякі (сям'я, род), магічныя і немагічныя спецыялісты, святары, а ў некаторых выпадках і вясковая абшчына (рэкруцкі абрад).

*Рытуал* (ад лац. *ritualis* – абрадавы, ад *ritus* – рэлігійны абрад, урачыстая цырымонія) – рэгламентаваная і рэгуліруемая паслядоўнасць дзеянняў, якія не змяняюць сітуацыю ў фізічным сэнсе, а вядуць толькі да яе сімвалічнай перамены.

Рытуал трэба адрозніваць ад *цырымоніі* (ад лац. *caerimonia* – культавы абрад), у аснове якой больш дэталёвая паслядоўнасць некалькіх рытуальных дзеянняў. Акрамя таго, цырымонія заўсёды мае сацыяльны характар.

Самымі распаўсюджанымі рытуаламі сучасных цырымоній з'яўляюцца пад'ём сцяга пад гукі гімна краіны; харавое выкананне гімна; вынас сцяга і арганізацыя ганаровай варты каля яго; вынас штандараў; пераклічка, здача рапартаў, абыход страёў; узнагароджванне, уручэнне ганаровых грамат, дыпломаў, каштоўных падарункаў, вымпелаў; прысяга (афіцыйнае і ўрачыстае абяцанне выконваць якія-небудзь абавязкі); клятва (яна існуе ў прадстаўнікоў розных прафесій і гаворыцца хорам або асобным чалавекам); ускладанне кветак да мемарыяльнай дошкі, помніка, да месца гібелі; рытуал уручэння сімвалаў улады, сімвалічных значкоў, амулетаў, ключа.

### *Тэма 10. Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў*

Карнавальныя традыцыі каляднага ігрышча. Калядныя гульні ў закрытым памяшканні: рэгіянальныя асаблівасці правядзення («Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Халімон»). Выраб калядных касцюмаў, масак, рэквізіту. Калядныя ігрышчы на вольным паветры – «Цягнуць Каляду на

дуба», «Кола», «Конікі». Асаблівасці правядзення рэгіянальных гульняў «Слуп», «Перацягванне каната», «Ледзяны конус», «Катанне з гор». Гульнявы характар абрадавых масленічных вяселляў і пахаванняў.

**Зімовыя ігрышчы і забавы беларусаў.** Ігрышча, народнае зборышча з танцавальна-гульнёвымі паказамі. Бярэ пачатак ад усеагульных увеселенняў язычніцкай абраднасці. Мае глубокія карэнні ва ўсходнеславянскім фальклоры. Значную ролю ў вызначэнні характару ігрышч адыгралі скамарохі. Бытапісцы і этнографы XIX ст. игрышчамі называлі ўсе выгляды народнай відовішчна-гульнявой культуры, уключаючы народную драму, што прынята і некаторымі аўтарамі XX стагоддзя (У.Н. Всеволодовский-Геригросс, П.Н. Берков). Этнограф і фальклaрыст П.У. Шэйн адносіў тэрмін да карагодных гульняў падчас вячорак або абрадаў. У сучаснай этнаграфічнай і фалькларыстычнай літаратуры тэрмін замацаваны для абрадавага комлекса, "у якім арганічна зліваюцца песні, скокі, пераапрананне, гульні, варожбы і т.п." (У.І. Чичеров)

Сам тэрмін "ігрышча" часта выступаюць сінонімам "вечарынак" і "вячорак". Асабліва характэрны ігрышча для каляднага часу, сустрэчаіправодзіныМасленіцы. Калі можна ўсё паказваць "шыварат-навыварат" г.зн у карнавальным выглядзе. Таму на ігрышча асаблівая роля належала розным паказам: карнавалізаваныя хаджэнне переапранутых; гульнёвыя паказы вяселля ("Жаніцьба Цярэшкі", "Жаніцьба бахара"); парадзіраванае "пахаванне" з уваскрасеннем у танцы, гульні; іншыя гульні ў фанты, выбар пары г.д. ("Яшчур", "Падушачка"). Тэатралізаваныя паказы на ігрышчах падаюцца ў сінкрэтычным адзінсмтве з танцамі, славеснымі жартамі і крагодамі-гульнямі.

Пачыная з Каляд і амаль што да Масленіцы ігрышча насілі шлюбны характар. Удзельнічалі людзі featureрознага ўзросту, але галоўная доля – нежанатая моладзь, проісходіў агляд жаніхоў і нявест, знаемства. Ініцыятары – дзяўчаты ці замужнія маладыя жанчыны, хлопцы наймалі музыкаў, а дзяўчаты прыносілі прадукты. Месца збору – прасторная хата, якога-небудзь заможнага, вяселага гаспадара або карчма.

Пад гукі музыкі пачывналіся разнаполыя танцы, хлопцы і дзяўчаты прыглядаліcь адзін да аднаго. Ігрышчы мелі сваіх распарадчыкаў гэта хлапцы найбольш здольных да гульняў.

Пачыналася застоллем і каргодам, потым калядные песні і танцы. Калі не было музыкаў танчылі пад прыпеўкі (часта непрыстойны). Але акрамя скокаў былі і забавы. Забавы – від фольклору, які стаіць на мяжы гулбнёвага і славеснага і адрозніваецца перавагай славесных формулай, гульнёвы элемаент у якіх выконвае другарадную або нават непрыкметную ролю ці,

наадварот, з перавагай фізічных элементаў.

Гульні і забавы былі абрадавыя і пазабрадавыя, шлюбнай нікіраванасці. (“Засяванне”, “Бахар”, “Нумары”; “Ката пячы”)

Напрыклад:

Забава – абрад “Засяванне” На першы дзень Новага года дзеці ходзяць “засяваць”. Уваходзячы ў хату, сыплюць жыта, ячмень або роса са словамі:’

Сею грэчку і пшаніцу,

А мне дайце паляніцу.

Гэтых дзяцей, безумоўна, частуюць і даюць ім грошы.

Гульня-забава“Бахар”. Гэты жарт пачынаецца з таго, што адзін з жанатых мыжчын звяртаецца да хлапцой з пытаннем: “Ці ні пара ужо бахара жаніць”. Атрымаўгы адказ “Пара”, запрашае ў жонкі якую-небудзь замужнюю жанчыну са словамі: “”Хадзі: будзь маткаю, а я буду бацькаю; будзем жаніць сваіх рабят, бо ўжо пара – Каляды прыйшлі, хлопцы нашы не жэняцца”. Яна падводзіць дзевак да хлопцаў “Ці хорыша іна цябе будіць?”(“Ладна” ці “Ні хочу”я такія і гроша не дам на бахыря) У гэтым выпадку павінны задаволіць жаданне хлопца, прывесці яму іншую. Заручыўшыся “жонкамі”, хлопцы складваюцца на гарэлку і частуюць усіх.

Гульня-забава “Ката пячы”

Збіраюцца хлопцы і дзяўчаты ў якую-небудзь хату і там рыхтуюць розныя закускі і галоўнае – рыхтуюць з цеста фігуру ката (галава і тлава цеста; вушы і ногі з сала; хвост з каўбасы) усё запякаюць. Такую фігуру вешаюць сярод пакоя пад столлю. Затым кожны па чарзе пад’язджае на ўхваце да “ката”, каб зубамі адкусіць ад яго кавалачак, ці ўсяго адарваць, пр гэтым прыгаварывая: “Еду з кута на “ката”, цап за ката”. У каго хутчэй атрмаецца.

У перарывах – размаўлялі, слухалі байкі, варажылі. Варажылі на суджаннага, ці суджаную, на багацце, пра смерць, пра шлюб, варожбы с/г накіраванасці Падзеййный момант – прыход ряжаных.

На Масленіцу ігрышчныя элементы ўтрымоўваліся ў абрадзе "Разуванне маладой" ци "Вазіць маладуху" у карчму. Да цяжарнай жанчыны прыходзілі дзяўчаты, ці маладыяжанчыны: спявалі песні:

Маладая ты марудка

Выйдзі, выйдзі к нам на вулку

Вынесь сыра – родзіш сына

Вынесь мачку – родзіц дачку

Вынесь таўкача – родзіш смаркача.

Малады садджаў маладую на санкі. Усе ехалі у карчму, дзе малады – адкупаўся пачастункамі.

Сярод бел шляхты ў гарадах:

- кулігі – хтосьці са збяднелай шляхты браў радню, слуг, наражаліся ўмаскі, ехалі да суседа, віншавалі са святам, патрабавалі частаванне (2-3 дня дзебашыралі). Потым хазяіна нараджалі ў маску, бралі яго ў сваю кампанію – ехалі да другога суседа.

- магнаты і сярэдняя шляхта наладжвала маскарады, рэдуты – платные танцавальныя вечара, вырашался лёс не адной паненкі

- маслянічныя конные каруселі (завёз з Еўропы міхаіл Казіміровіч Радзівіл ў 1721 г.)

парад удзельнікаў на канях;

выездка каней;

джыгітоўка (стоячы скакаць, ці лёжачы);

валоданне халоднай збруяй;

дастаць платок ртом на скаку;

конный жартоўныя гульні (драўлянае пудзіла з мішенню)

стралялі на поўнам скаку, папасць шпагай у персцёнак;

ўзнагарода ўдзельнікаў

У беларусаў шмат зімовых спартыўных забаў:

Перацягванне каната, цягнуць праз снегавую сцену

Віцебскі слуп – 15 м, ашкураны і змазаны вашчынай, у версе кола з прызам;

Палескі слуп – 15 м, ашкураны і abліты вадой, на версе кола на штыры, яго можна круціць і выбіраць прыз

Катаніе на санях, санныя паязды

У наш час многія элементы ігрышчаў працягваюць жыць у тых рэгіёнах, дзе захаваліся народныя традыцыі, аднак прыкметна выяўляецца тэндэнцыя выцяснення ігрышча, як аўтэнтычных форм функцыяніровання народна-танцавальна-гульнёва-тэаралізаванага мастацтва арганізаванымі святочнымі выступленнямі калектываў мастацкай самадзейнасці.

**2.Язычніцкая аснова, хрысціянскія і свецкія напластаванні ў структуры Каляднай абраднасці.**

У гадавым крузе народных каляндарных абрадаў цэнтральнае месца належыць навагодняму абрадаваму цыклу. 25 снежня ў пауночных шыротах – дзень зімовага сонцастаяння. «Адраджэнне» сонца – пачатак новага сонечнага іаграрнага года; яно абяцала прыход цяпла і святла, прабуджэнне прыроды, адраджэнне пладаноснай сілы зямлі. Каляды - сімвалічная мяжа паміж старым і новым годам. У Сербау ў гэты дзень запальвалі Бадняк – навагодні агонь, які гарэў да Новага года, агонь якога падтрымліваў сілы нараджаючага сонца. У беларусаў назва « каляды» замацавалася за перыядам

з 24 снежня па 6 студзеня па ст.ст. ( з 6 па 19 студзеня па н.ст.). Гэтыя дні называлі яшчэ «святыя вечары», «святыя дні».

Этымалогія слова: у старажытных рымлян першы дзень кожнага месяца называўся «календа» (Карскі Е.); ад слова «кола» - сонца (П. І. Кастамараў); «коло-лада» - каля позняй багіні вясны Лады (Салауеу С. М.). На Беларусі «каляда» мела паняцці: прадукты, якія даваў гаспадар парабкам за іх работу; велічальна-віншавальныя песні, якія спявалі калядоўшчыкі; дары калядоўшчыкам за выкананне магічных велічальна-віншавальных песень.

Традыцыйная рытуальная вячэра ў першы дзень Каляд (24 снежня па ст.ст. або 6 студзеня па н.ст.) – «посная куцця», якая з'яўлялася пачаткам святочных вечароў і дзен (святы вечар перад Раством Хрыстовым). «Посная» куцця пачыналася пасля заходу сонца, пры першай зорцы на небе. З самай раніцы рыхтаваліся: прыбіралі хату, мыліся ў лазні, пасцілі ўвесь дзень шчырым постам. Гаспадыня рыхтавала святочную вячэру. Гаспадары віталі Каляду і запрашалі за стол. Гаспадар ставіў снапок жыта на покуці, а ўнук ці малодшы сын клаў каля снапка частку сена, на якое ставіў гаршчок са зваранай куцею, якая накрывалася бліном ці хлебам. Рэштку сена раскладалі на стол, пасля чаго ен засцілаўся белым абрусам – магічная функцыя ўрадлівасці зернавых, здароўя і сытасці жывелы, багацце і дабрабыт сям'і ў наступаючым годзе. Перш чым сесці за стол, гаспадар гаварыў так званую малітву-зварот – просьбу да сваіх продкаў, запрашаў іх на святочную вячэру. Гаспадар садзіўся першым за стол – на покуці, астатнія размяшчаліся строга прытрымліваючыся іерархіі старшынства: з аднаго боку сыны і ўнукі, насупраць – гаспадыня і дочкі. У канцы стала стаяў зэдлік. На стале, насупраць яго, ствяла міска з лыжкай, для сем'яніна, які адсутнічаў ці для неспадзяванага падарожнага госця. У залежнасці ад дастатку сям'і, святочная вячэра складалася з трох, пяці, сямі страў: квас з грыбамі, бліны з макам, куцці (каша з ячменных круп) з мядовай сытай ці льняным маслам, селядзец з ільняным маслам (ці рыба), аўсяны кісель з мядовай сытай, вараныя грыбы, адвар з сушаных яблык, груш і сліў. У больш заможных сялян на стале стаяла дзевяць і нават дванаццаць страў. Спажываючы гэтыя стравы людзі верылі ў іх цудадзейную сілу. Куцця лічылася сакральнай стравай – цэлыя абтоўчаныя зярняты захоўваюць, аднаўляюць жыцце. Куцця ставілася ў цэнтры стала, Яна забяспечвала багаты ўраджай, дастатак ў сям'іі асабісты поспех. Варылі яе заўседы ў адным і тым жа гаршчку, ніякіх страў болей у ім не варылі, і захоўваўся ен для куцці ад Каляд да Каляд. Гаспадар першым чэрпаў куццю лыжкай і клаў яе на падаконнік ці парог, прапаноўваючы яе памершым продкам. Усе сямейнікі адсыпалі крыху кашы на стол, адлівалі крыху меду

іўсіх астатніх сакральных страў на абрус, у гонар нябожчыкаў на абрадавы стол падаваліся блінцы. Шанаванне памершых звязана з верай у здольнасць іх дапамагаць жывым ў забеспячэнні ураджаю і дабрабыту ў сям'і. У далекім мінулым, кааб сагрэць нябожчыкаў, 24 снежня на дварах распальвалі кастры, пазней іх змянілі факеламі, свечкамі. Зачарпнуўшы першую лыжку куцці, гаспадар стукаў у акно і зваў мароза «ісці куццю есці», кааб не марозіў ячмень, пшаніцу, гарох, грэчку іінш. Гаспадыня звала мароза на куццю, каб не марозіў рассаду, гуркі, гарбузы, моркву, буракіііинш. У час вячэры за сталом адбываліся наступныя «спектаклі». Жонка, седзячы насупраць свайго мужа, пыталася ў яго:

- Ці бачыш ты мяне?

- Не бачу!

- Кааб жа ты не бачыў за стагамі, за копамі, за вазамі, за снапамісвету!

Тады ў адказ гаспадар пытаўся ў сваей жонкі:

- А ці бачыш ты мяне?

- Не бачу!

- Каб жа ты не бачыла за гуркамі, за гарбузамі, за капустаю, за буракамісвету!

У канцы такога дыялогу гаспадыня брала качаргу і злегку ,шіла ею мужа, які павінен быў хутка паваліцца на лаву і адказаць:

- Каб твае снапы так хутка падалі на ніве!

Рэшткі куцці падкідвалі да столі, каб хутчэй расла маладая скаціна і кааб высокі рос лен, а таксама аддавалі раніцаю жывеле, кааб Яна была сытнай і добра пладзілася ў новым годзе. Варажылі пра ўраджай і дабрабыт сям'і, выцягваючы з-пад абруса некалькі сянінак (калі доўгі – лен будзе высокі). Пасля вячэры па травяным насенні «даведваліся» на якія зернавыя будзе лепшы ўраджай. Варажылі на куцці: калі каша атрымлівалася разварыстая – павінен быць багаты ўраджай ячменю; калі пераваранaя ці недаваранaя – дрэнная прымета.

Абрад калядавання займае цэнтральнае месца ў святочным навагоднім абрадавым цыкле. Адбываўся, як правіла, з вечара другога дня Каляд і свайго аппагея дасягаў на Новы год. Вечарам пераапранутыя калядоўшчыкі, сабраўшыся невялікімі групамі, адпраўляюцца хадзіць па весцы з тэатралізаванымі віншаваннямііі магічна-заклінальнымі абрадавымі песнямі. У развіцці каляднай абраднасці можна прасачыць тры плыні, якія раскрываюць розныя этапы станаўлення і развіцця абраду, абумоўленыя гістарычныміі сацыяльнымі ўмовамі: язычніцкі, хрысціянскіі свецкі.

Язычніцкі пласт генетычна звязаны з раннімі формамі рэлігіі, магічным фетышызмам. Першапачаткова «валхвы» хадзілі па дварах з

васьміканцовай каляднай зоркай (двайны крыж), якія спявалі магічныя песні пад вокнамі, віншавалі гаспадароў. Калі тут ўжо былі, гаспадары ў вакно паказвалі блін, гаворачы аб тым, што сонейка ўжо ўвайшло ў гэту хату. Калі з'явіліся татэмістычныя ўяўленні (пакланенне жывелам-першапродкам), галоўным сімвалам ў абрадзе сталі жывелы – сімвалы ўрадлівасці, звязаны з аграрнай і шлюбнай магіяй. «Каза» - старажытны сімвал ў радлівасці. Яе суправаджаў гурт пераапранутых: мядзведзь, журавель, бусел і г.д. За павадыра быў «дзед» з барадой, у вывернутай шубе, з палкай ў руках, які ўяўляў сабой Зюзю – бога зімы. Калядоўшчыкі хадзілі з васьміканцовай зоркай (падсвечанай унутры ці рухаючай па крузе), прасілі ўваходу ў хату, пачыналі тэатралізаваныя сцэнкі. Спевамі праслаўлялі «казу» за яе магічную сілу забяспечваць добры ўраджай у наступаючым годзе, «каза» выконвала свой рытуальны танец і памірала. Кааб ажывіць казу, гаспадары павінны былі яе абдорваць. Выконвалася віншавальная калядная песня, пажаданне ўсім членам сям'і здароўя, добрага ўраджаю ў новым годзе і ўсялякага дабрабыту. Гаспадары ўзнагароджвалі калядоўшчыкаў салам, каўбасой, пірагаміі г.д. – гэта плата за рытуальныя дзеянні на дабрабыт і любоў у сям'і.

У X ст. з прыходам хрысціянства, абрад набывае сваю афарбоўку. Форма застаеццпа тая ж, змяняецца змест. Царква спрабуе знішчыць язычніцкія абрады, Але будучы не ў сілах выкараніць народныя звычаі, звязаныя са старажытнымі аграрна-вытворчымі культаміімкнулася прыстасаваць да іх свае хрысціянскія святы і дні памяці «святых». Гэта прывяло да «двухвер'я» простага народа, дзе разам з хрысціянскімі традыцыямі святкавання святаў існуюць і язычніцкія. З XVI ст. праваслаўная царква наладжвае відовішчы. Хаджэнне суправаджаецца з шасціканцовай зоркай Давыда, пад якой нарадзіўся Гасподзь; з сяміканцовай – у гонар сямі дзен; з'явілася зорка з дванаццаццю канцамі – у гонар 12 апосталаў. У сярэдзіне зоркі была выява Божай Маці з Хрыстом, якая была падсвечана ці круцілася па крузе. Служкі царквы з лялечным тэатрам «Батлейка» разыгрывалі тэатральныя дзеянні на біблейскія тэмы – механічны тэатр лялек.

Свецкі пласт XIX ст. узнікае на матэрыялістычным, атэістычным светаўспрыманні людзей. Калядаванне з абрадавага дзеяння ператвараецца ў вяселую, святочную забаву. У маскарадных касцюмах прадстаўлялі камедыйна-распрацаваных рэальных людзей. З'яўляюцца сатырычныя вобразы папа, смерці з кассой, ражанага чорта. Пры ўзмацненні классавай барадзьбы з'яўляюцца вобразы афіцэра і барыні, купца, яўрэя-гандляра, цыганоў (якія крадуць, мяняюць, пераапранаюць коней). Персанажы разыгрываюць жыццевыя замалеўкі. У канцы XIX – пач. XX ст. калядаванне

існуе суцэльна ў кангламераце, сукупнасці ўсіх рытуальных дзеянняў. Калядны абрад развіваецца, кожны час уносіць новыя рысы (ражаны «Мішка» набываесучаснасць, паказвае студэнтаў, прэзідыўм і г.д.).

Наладжванне ігрышчаў адбывалася пасля абыходу калядоўшчыкамі вескі ў заможным доме ці карчме, якія доўжыліся на працягу двух тydняў. На калядных вячорках прысутнічалі розныя ўзросты і катэгорыі людзей, Але галоўнае месца адводзілася халастой моладзі. Вечарынкі з'яўляліся адным звузлавыхмомантаў шлюбнай абраднасці, дзе адбыўся агляд жаніхоў і нявест. Ігрышчы працягваліся да позняй ночы. Ініцыятарамі правядзення былі дзяўчаты і маладыя замужнія жанчыны. Яны прыносілі харчаванне і гатавалі вячэру, хлопцы прыносілі гарэлку, наймалі музыкаў. Прыбіралася хата. Экспазіцыйнай часткай з'ўляліся танцавальныя забавяы або каллектыўныя варожбы. Існавалі магічныя варожбы з выкарыстаннем воска, волава, люстэрка, якія былі не распаўсюджаны; бытавалі ў часцы Цэнтральнай і ўсходняй Беларусі, Гродненскай вобласці. На Беларусі былі распаўсюджаны варожбы-вытлумачэнні, якія адказвалі на розныя пытанні будучага жыцця, неслі шлюбную накіраванасць. На ігрышчах мелі сваіх распарадчыкаў, якім усе падпарадкоўваліся. Хлопцы танцавалі асобна ад дзяўчат, прыглядаліся адзін да аднаго, выбіралі сабе па сэрцу. Састаўным элементам калядных ігрышчаў з'ўлялася наступнае: варажба пра замужжа; выбар пары ў час папярэдніх танцаў; святочнае застолле; танцавальна-забаўляльная праграма, якая суправаджалася гульнявымі прадстаўленнямі ражаных; жартоўныя песніiінсцыніраванне вясельнага бацькоўскага благаслаўлення, якая ўвасаблялася ў гульні «Жаніцьба Цярэшкі». Танцавалі: Казачок, Кругавую, Мяцеліцу, Барыню, Чыжыка, Лявоніху, Падушачку, Гусачок, Журавель, пазней Полька, Падыспань і г.д. У перапынках моладзь падмацоўвалася закуссю, грала ў карты, варажыла, расказвала небыліцы, загадкі, слухала байкі старых людзей. Важнаеместа займалі гульні: Яшчур, Лось, Мацей, Каралевічы, Ката пячы, Бахар, Луч, Чорт, Апанас, Шыла, «Цот-ніцот», Каза, Мак, Землямер, Лешч, Лес, Млын і г.д.

Беларусы iіх суседзі да Х ст. Новы год святкавалі на Добравешча (25 сакавіка). У Х ст. СА з'яўленнем хрысціянства, уся Еўропа пачала святкаваць з Раждажства Хрыстова. З 1364 года часка Беларусі ў складзе РП Новы год пачынала з 1 студзення, а Усходняя Беларусь – з пачатку вясны. 1493 да 1700 года, у адпаведнасці з візантыйскай царкоўнай традыцыяй, беларусы адзначалі з 21 верасня – дзень нараджэння Маці Боскай. У 1582 годзе Рымскі папа Рыгор XIII правеў рэформу календара. Грыгарыянскі каляндар быў прыняты каталіцкімі краінамі Еўропы. З 1583 года беларусы святкуюць Новы год з 1 студзеня. Царква прысвячае Новы год св. Васілю Вялікаму – вялікаму

архіепіскапу кесарыйскаму, уселенскаму айцу і настаўніку царквы, які нарадзіўся ў 329 годзе  (у народзе гэта свята «Васілле»). Гэты падвіжнік хрысціянства за свае жыцце паспеў зрабіць шмат добрых учынкаў для свайго народа, зрабіў важныя пераутварэнні ў царкоўным багаслужэнніі для манаства, ім была канчаткова вызначана тэрміналогія Святой Троіцы. У народзе св. Васіля Вялікага лічаць ахоўнікам жывелы, асабліва свіней. Але яшчэ да хрысціянства на Новы год забівалі кабанчыка – прынашэнне ахвяры богу сонца.

Напярэданні Новага года (1 студзеня па ст.ст. – 13-14 студзеня па н.ст.) дзень адзначаўся абрадавай вячэрай – «багатая», «тоўстая», «шчодрая», «мясная», «тлустая» або «ласая» куцця. Вячэра адзначалася багаццем скаромнага. Стараліся сустрэць Новы год у поўным дастатку, кааб на працягу ўсяго наступнага года была сытная яда ў доме і ў гаспадарцы. Лічылася – чаго няма на навагоднім стале, таго не будзе ў доме цэлы год. Колькасць страў таксама мела рытуальнае значэнне: сем, дзевяць, дванаццаць. Куцця падавалася на стол з салам ці маслам. Елі вараную свіную галаву, смажаныя каўбасы, сальцісон, крывяную каўбасу, халадзец і г.д. Варылі верашчаку са свінінай, пяклі блінцы грэчневыя і аўсяныя, ужывалі сыр, кісель з малаком, пірагі. У старажытных грэкаў свіня па пладавітасці ўспрымалася, як сшмвал урадлівасці.

Навагоднія Шчадроўкі адбываліся ў вечар перад Новым годам. Дзяўчаты хадзілі са Шчодрай – сімвал ўрадлівасці. На гэтую ролю ваыбіралі прыгожую, статную дзяўчыну, адзявалі ў святочнае адзенне, галаву ўпрыгожвалі вянкамі з папяровых кветак і рознакаляровых стужак, апраналі кажушок. Дзяўчаты адпраўляліся па хатах і спявалі шчадроўкі – калядныя пнсні, якія выконваліся толькі на пярэданні Новага года з прыпевам «шчодры вечар». Шчадроўкі не адрозніваліся ад калядак ні па форме, ні пазместу, ні па функцыі, з’яўляючыся разнавіднасцю зімовай велічальна-віншавальнай песні.

У першы дзень Новага года раніцай гаспадар абыходзіць сваю гаспадарку і раскідвае зярняты на багаты ўраджай і добры прыплод. Вясковыя хлопчыкі хадзілі па хатах, выконваючы абрад «засявання» альбо «засеўкі», віншавалі з Новым годам, сыпалі зене жыта, авеса, ячменю, кругам абыходзячы хату з песнямі-зычэннямі, жадаючы шчасця, здароўя, радасці. Іх гаспадары частавалі рознымі прысмакамі.

З 18-19 студзеня  трэцяя «посная» ці «галодная» куцця адзначала заканчэнне святочнага рытуалу. У адрозненні ад першай называлася яшчэ «вадзяной», таму што да гэтай даты быў прымеркаваны хрысціянска-царкоўны абрад Вадохрышча – звязваецца з міфамі аб Хрышчэнні Хрыста ў

раццэ Іардан. Гэты рытуал з’яўляецца па сутнасці адгалоскам старажытна-язычніцкага культа вады, вераванняў у яе магічнасць. Напярэданні сям’я мылася, адзявала чыстае адзенне, хату ўтрымвалі ў чысціні, кааб ўвесь год сям’я была здаровай і чыстай. Абрадавая вячэра складалася з поснага; на стол падаваліся тыя ж стравы, што на першую куццю. Захоўваўся звычай, калі гаспадыня пераносіла куццю з печы на кут, пачынала квактаць, як курыца-квактуха, дзеткі пад сталом кудахтаюць, крычаць, як пеўні. Маці ставіць куццю на кут, накрывае хлебам, сыпле дзецям пад стол семачкі сланечніка. Сэнс абраду накіраваны на тое, кааб у гаспадарцы вадзілася многа курэй, пеўнікаў. Першчым пачаць вячэру, гаспадар браў гаршчок з куцей, хлеб, крыж (зроблены з дрэва) і крапілам з Аржаных каласоў «асвячаў» ваду. Затым гэтай жа вадой крапіў хату ііншыя будынкі (адначасова маляваў крыжы на сценах, дзвярах, вокнах хаты, варотах двара, сценах і дзвярах хлява, гумна і г.д.). Гэта называлася «запісаць каляды». Куцця, вада і крыжы павінны былі адганяць «нячыстую сілу», засцерагчы ад «чар», захаваць здароўе ўсім, хто жыў ухаце, зберагчы жывелу ад паморaў. Вярнуўшыся ў хату гаспадар ставіў куццю на стол і сям’я пачынала вячэраць спяшаючыся (кааб летам хутчэй справіцца зпалявымі работамі).

У царкве адбывалася зранку літургія, затым усе ішлі да ракі ці возера. Там выбівалі крыжападобную палонку ў ледзе, крыж ставілі побач (выкрашаны бурачным сокам у чырвоны колер), на яго вешалі яловыя вянкі, ставілі свечкі, асвячалі ваду. Набранная вада захоўвала сваю магічную, лекавую сілу ўвесь год.

Святочныя вечары называліся ў народзе «крывымі» вечарамі. Забаранялася ў гэтыя дні (асабліва да Новага года): шыць, секчы, пілаваць, ламаць, віць вяроўкіі г.д. Забароны тлумачацца імкненнем падобнага да падобнага, значэнне ўзмацняецца ўмовамііціцыяльнай магіі. Абрады неслі абарончы характар.

Да абрадаў завяршэння Каляд на вольным паветры можна аднесці:

«Цягнуць Каляду на дуба» (Бярэзінскі раен, Мінскай вобл, в. Глухі Ток, Неганічы, Светлічы, Паложына).

«Кола» (Мінская вобл., в. Вялікае сяло).

«Конікі» (Столінскі раен, Давыд-гарадок).

*Тэма 11. Абрадавыя і пазаабрадавыя гульнявыя дзеянні веснавых свят народнага календара*

Магічны сэнс веснавых гульняў і ігрышчаў (гойданне на арэлях, валачэнне калодкі, гульні з яйкам, сёмушная варажба з вянкамі). Рэгіянальныя асаблівасці правядзення веснавых абрадавых гульняў –

«Тураўскі карагод», «Ваджэнне стралы», варажба з бярозай.

*2.Масленіца*

Масленіца – гэта свята веснавога цыкла ,праводзіны зімы і падрыхтоука сустрэчы вясны.

Свята носіць аграрны характарі адзначаецца славянамі і іншымі народамі Еуропы. Назва свята, якая была раней – страчана, але даследчыкі лічаць, што гэтае святазвязаназ іменем *Велеся*(бог скаціны, хатняйжывёлы). Існуе свята, якое мае пэуны тэрмін святкавання *"Аулас".* У Беларусі у лясах і пушчах (Гродзенская, Бярэзінская, Белавежская, Налібоцкая і інш) вадзіліся *коні – тарпаны* (дзікія). Яны былі не вялікія, але вельмі моцныя. На свяце адбывалася утаймаванне дзікіх тарпаноу. Гэта відовішча – барацьба чалавека са зверам. У гэты ж дзень наладжвалі кірмашы, дзе прадавалі сельска-гаспадарчы інвентар і конскую збрую. Калі прыйшло хрысціянства, назва свята была выкаранена і з'явілася назва *"Маслніца"*. У час *"Ауласа"* - масавы ацёл жывёл, многа малака, таму людзі у ежу ужывалі малочныя прадукты.У Беларусі свята існавала пад двума назвамі *"Масленіца" і "Сырная нядзеля" ( 1177 г.у "Цверскім летапісу").*

*Агульнымі элементамі свята з'яуляюцца*:

1. Запальванне рытуальных кастроу.
2. Знішчэнне "пахаванне" пудзіла Зімы.
3. Памінанне продкау.
4. Ражанні.
5. Звычаі, звязаныя з маладымі.
6. Гульні, песні, харагоды.

Асаблівасцю святкавання усходніх славян (бел.), з'яуляецца пераходны характар свята.

Тэрмін*святкавання*– (другая палова лютага, пачатак сакавіка) .У Расіі *"Масленіцу"* выганялі, таму што у іх моцныя маразы, а у Беларусі з гонарам паважалі, бо тут цяпло.

*Агульнанацыянальныя абрадавыя формы:*

- абрадавыя стравы – варэнікі з рознымі начыненнямі, дранікі, мучныя бліны, (сяр.19 ст. пад дузелам Расіі);
- катанне з гор;
- паутор калядных ігрышчау;
- веснавыя гульні (карагоды, танцы).

Рэгіянальнай адметнасцю з'яуляецца памінальная абраднасць. У апошні дзень сырнага тыдня хадзілі на могілкі развітвацца з нябожчыкамі.

*Катанне з гор* – звычай меркавау, што шляхам дожыка да зямлі; яна хутчэй будзе радзіць. Людзі валяліся на снезе, убіралі снег з зямлі, гэты абрад

ператвараuся у забаву. Праводзілі на працягу усёй масленіцы, каталіся пераважна дзеці: Каток залівалі вадой, каталіся на лядзянках, дошках, на кадушках, скамейках .Хто праедзе на санках стоячы з трампліну больш доугую дыстанцыю, той атрымліваu прыз, але прыз вісеu на вяроuцы, стоячы на санках з пікай у руцэ трэба было папасці ёй у калечка.

Ездзілі на санях хлопцы і дзеuкі, і калі хлапцы перавярнуць дзяучат,то хто на каго упадзе,той таго і цалуе, а калі не упадзе, то дзяучаты білі іх снежкамі (абрад знішчэнне зімы). *“Конныя гульні”*– утаймаванне жарабцоu,катанне на павозках.

*Сямейна – радавыя абрады:*

*1.* абрад “Паспела”(калі нага дзяучыны таусцейшая за руку хлопца – гэта значыць яна можа ужо выходзіць замуж). Выходзілі замуж у 12-14 год. Моладзь спявалі песню:

Чабарок, чабарок, ды каля каліткі
Ніхто замуж не бярэ
Бо тоненькія лыткі.

Дзяучыну усаджвалі у сані, усталёувалі шэст з белым сцягам, хлопцы упрагаліся і ездзілі па вёсцы і крычалі “*Паспела!Паспела!* (гэта значыць можна выдаваць замуж).

*2. абрад “Падначоукі”*(да 20 ст). Дзяучына падыходзіла да хлопца, які ёй спадабауся і запрашала на сенавал, дзе яны спявалі песні, цалаваліся у шчочкі (калі ён згаджауся). Пасля яны павінны былі ажаніцца. Хлопец не меу права з другімі гуляць (бо маглі пабіць яго). Уся вёска ахоувала гэту пару “*Другімі словамі абрад”Падначоукі* – гэта ***“негласныя заручыны”***

*3. абрад “Калодка”*.Негатыуныя формы ушанавання халасцякоу, якія жаніліся у мясаед. Лічылася, што хлопец, які не жаніуся у мясаед, дрэнна удзейнічае на прыроду, зямлю. Рабілі невялікую *калодку,* перавязвалі рознакаляровай стужках, укладалі *калодку*на шыю, абвязвалі рукі рушніком, цягнулі у карму і ён павінен быу усіх частаваць. У мястэчку Вілейка існавала *“Вілейская калодка”.*

Вечарам юнакі і дзяучаты збіраліся у карме. Дзяучаты прыносілі паясы і рыхтавалі стравы. Наладжвалі выстауку усяго гэтага, а хлопцы неслі гарэлку. Тут маглі усе прысутнічаць, а у застоллі, толькі тыя, хто прынёс. Пачыналася ігрышча, юнакі і дзяучаты частаваліся, то гэта азначала, што ён мае да яе сімпатыю, і будзе засылаць сватоу.

*4. абрад “Разуванне маладой”*( магія губ). Да маладой цяжарнай жанчыны прыходзілі у госці дзяучаты і маладыя жанчыны, яны спявалі ёй песні:

Маладая ты Марутка,

Выйдзі, выйдзі к нам на вулку,
Вынесь сыра – родзіш сына
Вынесь мачку – родзіш дачку
Вынесь таукача – родзішь смаркача.

І яна усіх частавала. Яе усаджвалі на санкі, а малады муж павінен быу весці у карму і частаваць.

*5. абрад “Хаджэнне да павітух”*(павітухі хадзілі у адведкі, іх частавалі блінамі накрыж парэзанымі).

*Зімовыя гульні масленіцы:*

*1. Перацягванне каната*(рабілі снегавую сценку даужынёй 8-10 метрау, вышынёй 2,5 метра), прасверлівалі дырку і туда канат. Усе прывязваліся да каната і перацягвалі праз снегавую сценку.

*2. Ледзяны конус*( рабіліса снегу вышынёй 3.5 метра, залівалі вадой і клалі прыз).

*3. Ледзяны слуп* – акуратны, змазаны вашчынай, на якім падвешвалі прыз.

*Іншнацыянальныя ўплывы:*

Пад уздзеяннем рускай культуры у беларусі на Масленіцы з’явіліся бліны.

У 16-ым ст. калі вяліся войны паміж Маскоускім княствам і ВКЛ, многа было захопленых перaселеных у Сібір. *Сяміон Полацкі* – заснавальнік першага прыдворнага тэатра (з 70-ці акцёрау – 62 з Беларусі) паказвалі Масленічныя драмы.

У Сібіры з’явілася гульня *“Узянне снегавой крэпасці”.* З цягам часу, калібылыя палонныя вярталіся дадому, яны прывезлі гэтую гульню на Беларусь. Замацаваласягэтая гульня толькі у раёнах Усходняй Беларусі. І тут з’явуся звычай спальваць пудзіла Зімы.

У католікау існуе *абрад “Запусты”* – (апошні тыдзень перад вялікай *Пасхай).*

7 сераду па хатах па хатах хадзіу *запуст*( мужчына у світцы з палкай,насіу калпак з markup рознакаляровымі стужкамі ).Ён віншавау усіх са святам, пасыпау попелам падлогу і яго адорвалі.

Уся шляхта успрымала Заходнюю культуру.Узнік школьны тэатр (пад уплывам іезуітау) у ім – масленічныя драмы. Аутары выступалі супрать пьянства, разгвалту.

У Слоніме існавау цэлы склад касцюмау (600 шт) для маскарадау (для шляхты).

На *Масленіцу* былі феерверкі. У 1650 годзе К.Сімяновіч выдау кніжку

*“Вялікае мастацтва артылерыі”*. На масленіцу фігура у феерверку – Бахус.

*Звычай “Кулігі”*.

У госці ездзілі на кулігі у маскарадных масках і гаспадары іх частавалі.Гэтым звычаем карысталіся збяднелыя шляхтічы. На працягу тыдня ездзілі у масках, пілі і гулялі.

Былі спектаклі прафісійных і аматарскіх калектывау, выступленне духавых аркестрау. У 1850 годзе у Мінску зрабілі санны поезд даужынёй 100 метрау і вазілі, спявалі песні.

Такім чынам *“Масленіца”*уяуляе складаны поліфункцыянальны гульнёвы комплекс, у якім існавалі на практычных намаганнях язычніцкія, хрысціянскія і свецкія напластаванні.

Калі у вёсках яскрава выражаны традыцыйны характар святкавання, то у горадзе свята – на запазычаных Усходніх і Заходня Еурапейскіх масленічных фрагментах.

## *Тэма 12. Гульні беларускага Купалля*

Традыцыйныя купальскія абрадава-гульнявыя дзействы – збор удзельнікаў на свята, шэсце па вёсцы. Варажба на зеляніне. Тэатралізаваныя купальскія гульні – «Марусіначка», «Выбар пары». Вогненныя дзействы – парныя і асобныя пераскокванні праз вогнішча, купальская варажба з вянкамі, выкраданне купальскага агню. Пошук папараць-кветкі як масавае гульнявое дзеянне. Наладжванне танцавальных збораў як адметная рыса кантрактавых купальскіх кірмашоў.

2. Беларускае купалле: змест, сімволіка, семантыка дзей.

Купалле – гэта дахрысціянскае свята летняга сонцастаяння, якое светкавалася ўсімі народамі Еўропы. Абрады і звычаі дакладна захоўваюць рысы салярнага і аграрна-жывёлаводчага культу і носяць агульнаеўрапейскі характар.

Першае ўпамінанне аб свяце адносіцца да I стагоддзя да новай эры – рымскі сенатар Квіцціліян Цыцэрон апісаў свята Гранія ў брытаў.

У грамаце Вітаўта 1396г. зафіксавана свята “Купалле”, а першае апісанне свята дадзена ў густынскім летапісе ў XVI ст.

У беларускіх пісьмовых крыніцах тэрмін “Купала” упершыню зафіксаваны ў дамове з польскім каралём і літоўскімі князямі ў 1939 г. – “Амір ад Пакрова Багародзіцы да Купалава дня”.

Генэзіс свята.

Адны лічаць, што назва “Купалле” ад слова “ярыцца”: злавацца, ускіпаць; другія – што назва ўласна ад “купець” ці купацца ад слова “куп”; наступныя – ад слова “купно” (сообща); ад слова “Купала” – падавальнік ежы

і дароў; ад слова “савакупляцца”(этнограф Пячэрскі).

Беларускі фальскарыст Арсень Ліс лічыць, што салярны момант (сонца) – галоўны ў святе: свята росквіту ўрадлівых сіл зямлі.

Асновы свята звязваюць разнастайныя звычаі, якія звязаны з культам сонца, але ў цэлым – гэта сінтэз важнейшых дахрысціянскіх культаў: раслін, вады, зямлі і продкаў.

У беларусаў існавала шмат павер’яў, звязаных з купальскай ночкай: гэта нейкі пераварот у прыродзе (па зямлі ходзяць дрэвы, духі, ведзьмы – “Шабаш ведзьм на Лысай гары”); квітнее і цвіце папараць-кветка і хто яе сарве, будзе разумець усе мовы (нават птушак і жывёл), яму адкрыюцца ўсе таямніцы (скарбы). Каб убачыць папараць-кветку патрэбна было ноччу пайсці ў лес (на Віцебшчыне – голым), ачарціць вакол сябе кола і чытаць Боскую кнігу. На самой жа справе папараць размнажаецца спорамі і ніколі не цвіце.

Магічныя дзеянні супраць нячыстай сілы:

- усе шчыліны ў хаце затыкалі крапівой;
- у парог дома ўбівалі касу;
- дзяўчата ўспахвалі зямлю ў выглядзе кола;
- утыкалі веткі бярозы і асінавыя калы;
- вакол вёскі абносілі дрэва або барану;
- на конях прыгалі праз вогнішча (этнограф Шэйн – але гэта вызывае сумленне, таму што коні баяцца агню).

Сэнс:абрадавая ахова зямлі і скаціны (урадлівасці і здароўя).

Хрысціянская царква з мэтай знішчэння Купальскай абраднасці прымеркавала да гэтага дня – дзень Іаана Хрысціцеля, у выніку свята атрымала назву Івана Купалы. Тых, хто хадзіў на Купалле не дапускалі да прычашчэння, да шлюбу. У Вільне ў г.Роса было язычніцкае капішча, дзе адзначалі Кпалле, хрысціянскія служкі знеслі капішча, паставілі храм і зрабілі могілкі, увялі святкаванне кірмашоў і фэстаў – рэлігійных храмавых святаў у гонар Іаана Прэдцечы, і складаліся яны з богаслужэння, гандлю кветкамі і застолля. Але ўсё роўна знішчыць Купалле не ўдалося.

XIX ст. – пачатак XX ст. – магічныя звычаі Купалля паступова сталі разбурацца і згубілі сэнс. Да нас дайшлі толькі рэшткі, а іншыя пераўтварыліся ў забаву. Абрадавыя дзеянні маюць семантычны сэнс, але ў кожнай мясціне розныя абрадавыя дзеянні, таму яны істотна адрозніваюцца і вызначаюцца гістарычнай рознапланавасцю і шматпланавасцю. Даследаванне дазваляе раскрыць яго рэгіянальныя, тэрытарыяльныя і мясцовыя асаблівасці.

Падрыхтоўчы этап свята:

I. Збор зёлак, кветак і траў, пляценне вянкоў і выкананне абрадавых песень. Лекавыя расліны збіралі з 8 да 10 гадзін раніцы і з 16 да 17 гадзін вечара ў сухпе надвор'е. сушылі расліны так, каб прамыя сонечныя прмні, дождж і раса на іх не траплялі, каб яны не страцілі афарбоўку і лекавыя ўласцівасці (зверабой, клён, рамонак, папараць – на лекі; мяту, васількі, галінкі дуба і рабіны – на фарбы). На кветках варажылі: лічылі, што ад зверабою – будуць больш надоі і захавае ад нечысці.

Спявалі спецыяльныя песні, каб лекі не захоўвалі гаючую сілу; жывёла вярталася з пашы з вянкамі кветак на шыі.

Вакол вёскі абносілі майскае дрэва і барану, як сімвал жыцця (у Слонімскім павеце);

Рабілі рытуальны абход палеткаў з запаленым колам на шасце: агонь – падабенства сонца на зямлі (у Чашынскім раёне Віцебскай вобласці).

II этап складаецца з дзвюх частак:

1. Збор паліва для вогнішча: салома, як непатрэбшчына (пазбаўлена апладатворнага пачатку) і май (бярозы, галінкі, якія засталіся ад светкавання Троіцы), а затым непатрэбныя ў гаспадарцы рэчы. З усёй вёскі збіралі непатрэбныя рэчы, запрагалі старога каня і рабілі жабрацкі воз.
2. Выбіралі распарадчыкаў свята: у Мінскай губерніі – урадніка і распарадчыкаў танцавальна-забаўляльнай часткі – Купаліша і Купалінку.

III. Транспарціроўка паліва да месца святкавання.

IV. Збор удзельнікаў свята. Рабілі карагод-шэсце па вёсцы "Пляці пляцень": першая пара ў выглядзе дугі паднімала рукі і ўсе астатнія праходзілі. Карагод суправаджаўся песнямі. Каля кожнай хаты шэсце спынялася і ўся сябрына запрашала жыхароў хаты на свята. Народжаным у купалаў дзень на галавы ўскладвалі вянкі і віншавалі. Дзяўчатам жадалі хутчэй замуж пайсці. Нават хворыя ішлі на свята.

Наперадзе заўсёды ішлі хлопцы з факеламі; затым дзяўчаты з маем, нарадныя і з вянкамі, палыном павязвалі паясы; затым – бабы з запавам страў для святочнага застолля і апошнія – мужчыны.

Асаблівасць: рытуальнае запрашэнне на свята з просьбай аб адорванні удзельнікаў (кулага – кісель): Магілёўскі раен; абрад "ваджэнне куста"- форма запрашэння на свята ў Віцебскай і Мінскай губерніі.

V. Шэсце да месца правядзення свята і выконванне абрадавых песень. У Слонімскім павеце Мінскай вобласці – шэсце ўяўляла сабой карнавальнае шэсце з пылаючімі коламі на шастах. У Мінскай губерніі – з засохшымі галінкамі бярозы ў руках.

VI. Падрыхтоўка пляцоўкі да вогнішча – звычайна на пагорках, або ля вады, але існавалі мясцовыя асаблівасці: у Слуцкам павеце – на скрыжаванії

дарог; у Барысаўскім павеце – пасярод вёскі.

Канструктыўныя асаблівасці купальскага вогнішча:

- абвязвалі шаста саломай звітай 12 разоў, паверх іншыя рэчы (Мінская губернія);
- касцёр у выглядзе старога вулля і дошак (Маладзечанскі раён).

VII. Мастацкае афармленне месца дзеяння.

Тэрыторыю свята ўпрыгожвалі шатрамі з дрэў. Усю тэрыторыю акаймоўвалі бярозкамі. Касцёр абавязкова ў выглядзе кола і пракопвалі вакол яго. Чым большай вышыні касцёр, тым большую тэрыторыю ён асвеціць (ачысціць).

VIII. Экспазіцыйная частка свята:

1. Вячэрняя варажба з вянкамі – кіданне вянкоў на бярозу, калі вянок зачэпіцца за галінку – жаданне збудзецца.
2. Варажба завівання касы на жытнім полі – з жыта пялі касу, калі на другі дзень каса распляцецца – жаданне збудзецца.
3. Святочная вячэра: кулага; раслінныя стравы: цыбуля, часнок, розная зяляніна; верашчака (мачанка); гарэлка.

<u>Дзеі вакол вогнішча:</u>

¤ падпальванне кастра – у старажытныя часы падпальвала тсарэйшая жанчына, затым – найбольш паважаныя і сталыя жыхары вёскі. А калі гэта набыло забаўны характар – Купаліш і Купалінка.

¤ вогнішча запальвалася ў поўнай цішыні. Пакуль агонь да вяршыні не дабярэцца – людзі рабілі магічныя дзянні і загаворы (кідалі што-небудзь: ахвяравалі ў гонар дабрабыту).

¤ калі вогнішча дайшло да вяршыні – усе запявалі песню “Ой, рана на Івана”.

¤ спальвалі воз са смеццем, спявалі песні.

¤ пачыналі скокі праз касцёр (ачышчэнне): спачатку – дзяўчаты. Затым на першае месца выўшла шлюбная функцыя: пераскоквалі ў пары, узяўшыся за рукі, калі рукі ў час скока не разнялі – будуць у пары.

У Мінскай губерніі: дзяўчына кідала вянок праз касцёр хлопцу, а ён павінен быў яго разарваць (вянок – сімвал дзявоцтва).

<u>Кульмінацыя абрадавых вогненных дзей.</u>

* абрад спальвання чэрапа каня ці каровы: чэрап быў на шасце, калі збілі з шаста ў касцёр, значыць знішчылі нячыстую сілу (Пружанскі р-н).

* скачвалі пылаючыя колы ў раку – сонца ідзе на ўбыль: лета паварочвае на зіму (цэнтральная паўночная Беларусь).

* існавала абрадавае знішчэнне антрапаморфнай лялькі – або спальвалі або тапілі.

Апафеоз дзеянняў Купальскага свята.

1. Начныя абыходы вёскі, мэта: ачышчэнне.
2. Пошукі папараць-кветкі: лічылі, што яе ахоўвае нячыстая сіла.
3. Купальскае пераапрананне – у бабу, у дзеда, у ведзьму.
4. Начная варажба на вадзе з пылаючымі свечкамі на вянках (Палессе).

Фінальная частка Купалля.

Назіранне ўзыходу сонца.

Рытуальнае купанне ў рацэ ці лазні (голымі, каб ачысціцца).

Пры ўзыходзе сонца спявалі развітальныя песні.

*Тэма 13. Народныя забавы кірмашу*

Традыцыі і навацыі ў сучасных кірмашах Беларусі. У канцы XX - пачатку XXI стст. новым вітком у святочнай культуры Беларусістала адраджэнне традыцыйнага штогадовага кірмаша, які суправаджае многія народныя святы каляндарнага цыклу. Ізноў праведзены ў 1981 г. у горадзе Століне на фальклорнай аснове, кірмаш у розных раёнах пачалі адзначаць, як свята завяршэння восеньскіх сельскагаспадарчых прац. Састаўнымі кампанентамі свята з'яўляюцца: урачыстае адкрыццё, віншаванні і ўшаноўванне працаўнікоў сяла, святочны гандаль сельгаспрадукцыяй і прамысловымі таварамі, выстава-продаж вырабаў народных промыслаў, традыцыйныя кірмашовыязабавы, фэст фальклору і спартыўныя спаборніцтвы, конкурс народнай музыкі і выканаўцаў прыпевак, народныя атракцыёны, гульні і забавы, рытуал завяршэння кірмашовых дзей.

Маючы традыцыйную структуру правядзення , кірмаш ў кожным раёне прапаноўвае зараз магчымасць для выкарыстання мясцовага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу, што ў далейшым будзе садзейнічаць замацаванню ў святочнай культуры Беларусі шматлікіх забытых беларускіх кірмашовых забаў.

Так, атрымалі папулярнасць у Століне: гандлёвая латарэя, дзе ў якасці прызаў выдаюць бычкоў, парасят, курыц, сельгаспрадукцыю; у Жыткавічах, Воранава, Браславе, Тураве і Пінску - рознаварыянтныя гандлёвыя рыбалкі, дзе рыбу ловяць рукамі ў чанах або на воднай роўнядзі; у Скідзелі - птушыны аўкцыён; у Міёрах - міёрскі павук; у Івянцы і Ракаве - "івянецкія чыгуны"; у паўночнай Беларусі - "вараноўскі чыгун"; у Валожыне - гандлёвы атракцыён "Не лясніся ў лужыну" і інш.

Сучасны беларускі кірмаш у шматлікіх рэгіёнах Беларусі мае міжнародны характар: у ім прымаюць удзел гандлёвыя і творчыя арганізацыі суседніх краін. Так, у Століне ў кірмашовых дзеях прымалі ўдзел арганізацыі

з Дубровінскага раёна Украіны, у Гомельскім, Калінкавіцкім і Веткаўскім раёнах гасцей з Расіі. У Гародню на працягу многіх гадоў на свяце ўладкоўвалі спецыялізаваны нацыянальны гандаль для розных этнічных груп насельніцтва - беларускі кірмаш, польскі рынак, руская і літоўская ярмарка. На гэты святочны гандаль прывозяць прамысловыя і сельскагаспадарчыя тавары з Польшчы, Літвы, Беларусі, Расіі, гандлююць у адпаведных нацыянальных зонах, дзе арганізуюць выступленні нацыянальных творчых і спартыўных калектываў, праводзяць нацыянальныя гульні і танцавальныя праграмы. Ва ўмовах горада з яго поліэтнічным складам насельніцтва, такая форма, мае далягляд наступнага развіцця, асабліва ў мясцовасцях, дзе жывуць кампактна расселеныя групы рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў, габрэяў, татараў і інш. Такія кірмашы дазваляюць прадстаўнікам нацыянальных меншасцяў Беларусі далучыцца да сваёй нацыянальнай культуры, пагаварыць на роднай мове, паслухаць родную музыку, песні, патанчыць, адным словам, не адчуваць сябе чужынцамі ў Рэспубліцы Беларусь.

Кірмаш стаў асновай сучасных свят народных рамёстваў, якія ў старажытнасці функцыянавалі як спецыялізаваны гандаль. Такім чынам, беларускі кірмаш, адроджаны на нацыянальнай аснове, з'яўляецца шматфункцыянальным святам, які прадстаўляюць чалавеку магчымасць задаволіць разнастайныя матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні.

У апошнія дзесяцігоддзі ў нашай дзяржаве вялікая ўвага надаюць адраджэнню традыцыйнай святочнай культуры беларускага горада. У старажытнасці Беларусь звалі краінай замкаў. Сёння частка архітэктурных комплексаў рэканструюецца (у Полацку, Міры, Лідзе, Нясвіжы, Камянцы і іншых гарадах), што стала адной з прычын узнаўлення на дакументальнай аснове свят сярэднявечнай культуры. На гэтых святах, якія адлюстроўваюць вызначаныя падзеі ў жыцці беларускага горада мінулых стагоддзяў, удзельнікі трапляюць у атмасферу сярэднявечнага кірмаша, дзе яны могуць паглядзець выставу вогненай і халоднай зброі, спосабы выраба ганчарных, тэкстыльных, металічных і іншых вырабаў, паспрабаваць стравы сярэднявечнай кухні, купіць тавары рамесных цэхаў, паслухаць музыку лютні, гусляў, ліры і дуды, патанчыць сярэднявечныя танцы, нацешыцца відовішчам і самому паўдзельнічаць у рыцарскім турніры, а таксама ўбачыць сярэднявечны феерверк. Так, напрыклад, у г. Заслаўе ў 2002-2003 гг. была закладзеная традыцыя фэсту сярэднявечнай культуры "Заслаўскі звон", падчас якога было ўвасоблена наступнае: выстава, прысвечаная роду заслаўскіх магнатаў Глебавічаў; парад і прэзентацыя рыцарскіх клубаў; канцэрт сярэднявечнай музыкі; "горад майстроў"; выступленне батлейкі;

рыцарскія турніры цяжкаўзброеных латнікаў; конныя баі рыцараў; рыцарскія бугурты Групавыя баі рыцараў; паказальныя выступленні мінскага коннага клуба "Продзіус"; канцэрт беларускіх выканаўцаў на дудзе, рэканструкцыя бітвы і аблавы заслаўскага замка ў 1434 г. Пры рэканструкцыі аблавы Заслаўя выкарыстоўваліся натуральныя дэкарацыі астанкаў фартыфікацыйных пабудоў заслаўскага замка XVI - XVII стагоддзяў і Кальвініцкага сабора XVI – XVII ст. Свята стала сродкам навуковай і творчай самарэалізацыі, абуджэння гістарычнай і культурнай памяці беларусаў. Падобныя мастацка-гістарычныя святы ўладкоўваюцца ў сцен сярэднявечных замкаў такіх гарадоў, як Ліда, Мір, Навагрaдак, Камянец. Гэтыя святы раскрываюць культ рыцара-мужчыны, знаёмяць з рыцарскім братэрствам, абуджаюць у прысутных цікавасць да культурнай спадчыны мінулага, выхоўваюць любоў да роднай зямлі, краю.

Такім чынам, назіраецца імклівая хваля паўсюднага ўкаранення беларускіх традыцый у структуру сучасных кірмашоў, што дазваляе меркаваць пра наладжванне ўстойлівых гандлёвых і духоўных сувязяў не толькі паміж рэспубліканскімі арганізацыямі, але і з замежнымі краінамі, якія праяўляюць інтарэс да Беларусі. Кірмаш трывала ўвайшоў у сучасную святочную культуру Беларусі. Паядноўваючы традыцыіі навацыі, ён стаў многафункцыянальным святам, якое задавальняе многія матэрыяльныя и духоўныя патрэбы людзей.

Агульнанацыянальныя рысы і адметныя асаблівасці агульнанародных і кантрактавых кірмашоў. Тыпалогія гульнявых дзействаў беларускага кірмашу. Кірмашовыя латарэі – латарэя-рулетка, латарэя па спісе, сельскагаспадарчая латарэя. Гульнявыя атракцыёны і спартыўныя забавы.

*2. Гульнёвыя дзеі кірмаша*

Адметнай асаблівасцю традыцынага беларускага святочнага гандлю, з’яуляецца разнастайныя *гандлёва – гульнёвыя дзеі*. Так, у зоне продажу хатніх жывёл можна наладзіць сельскагаспадарчую латэрэю з розыграшамі бычкоу, авечак і г.д; у зоне продажу птушак – птушыны аукцыён, у месцы дзе прадаецца рыба – гандлёвая атракцыёны *“Павук”, “Палеская рыбалака”, “Рыбная латэрэя”,* у радах гародніны і садавіны – мінскую латэрэю *“Па спісу”, “Воранаускі чугун”, “Валожанскую забаву”,* у зоне продажу кандытарскіх вырабау – атракцыён *“Пастаускі пернік”,* на кніжным гандлі – кніжную латэрю і г.д.

Арганізацыя гандлёвых формау гандлю даемагчымасць уцягнуць у дзею значную колькасць людзей, садзейнічае іх актывізацыі, стварае жыцярадасны настрой у гледачоу. Адной з галоуных задач пры увасабленні гульнёвых формаугандлю з’яуляюцца захаванні у структуры кірмашу

традыцыйных беларускіх гандлёвых атракцыёнау і стварэнне на гэтай аснове новых ганлёвагульнёвых формаутварэнняу. Гульнёвыя атракцыёны узнiклi на кірмашы Беларусі у канцы 19 ст. Шырокай папулярызацыі гандлёвых дзей садзейнічала менавіта тое, што яны былі не толькі формай набыцця тавару, але і ператвараліся у своеасабліваю форму адпачынку. У сучаснай кірмашовай культуры гандлёвыя атракцыёны сталі адметнай рысай беларускіх кірмашоу. Пачынаючы з 80-г.г 20ст. яны былі адроджаны ва усіх рэгіёнах Беларусі.

*<u>Атракцыён "Палеская рыбалка"</u>*

*Гэтую форму гандлёвай гульнедзеянне у старадаунія часы ладзілі на кірмашах Пінска, Сталіна, Турава.*

У драуляны ган запускалі жавую рыбу. Удзельнікі, заплаціушы поуную суму грошау рыхтаваліся да рыбалкі. Адначасова у атракцыёне маглі удзельнічаць да двух дзесяткау чалавек. У час гульні ім дазвалялася або стаяць у краю гана, або залазіць у ган, але лавіць рыбу яны павінны былі толькі голымі рукамі. Па свістку арганізатара гульцы пачыналі лавіць рыбу. Гэты атракцыён раней і па штодзённа збірае мноства гледачоу і удзельнікау**.**

**"***<u>Не супыніся у лужу" –</u>гандлёвы атракцыён, які праводзілі на Спас. Вядомы яшчэ да Вялікай Айчынай Вайны.* На агароджанай плотамі пляцоуцы, на козлах памерамі 7х 1 м. стаялі некалькі начовак з вадой. На паверхні вады плавалі велізарныя, прыгожыя, смачныя яблыкі. Начаукі былі так замацаваны на козлах, што лёгка пераварочваліся. Гулец заплаціушы суму, выходзіу на пляцоуку і адмервау ад начовак 10 крокау. Затым яму завязвалі вочы. Падняушы рукі па камандзе арганізатара, гулец павінен быу тры разы павярнуцца вакол сябе, зрабіць 10 крокау і рэзка апусціць рукі. Калі рукі падалі на яблык, гулец атрымлівау яго у якасці прыза, а калі няудала – з начараквылівалася на удзельнікка вада. У 1984 г. на першым народным кірмашы Мінскай вобласці у Валожыне гэтая гульня мела вялікі поспех і распаусюдзілася па усёй Беларусі.

У сучаснай святочнай культуры Беларусі ніводны юбілей ці свята, ніводная урачыстасць гарадскога, абласнога, рэспубліканскага маштабу не абыходзіцца без святочнага гандлю з відовішчамі і забавамі. Культурная праграма кірмашовага свята павінна складацца з наступнага: **(**<u>тэатралізаванае адкрыццё</u>, <u>работа гандлёвых выстау і творчых экспазіцый, фестываль мастацтвау, спартыуныя спаборніцтвы, конкурсы народнай муыкі,кірмашовыя атракцыёны, гульні і забавы</u>**);***дзіцячая зона:* урачыстае закрыццё з падвядзеннем выніку. У час правядзення кірмашу яготэрыторыя падзяляецца на відовінную, массавагульнёвую, спартыуную і дзіцячую зоны.

- *<u>у масава-гульнёвай зоне</u>*- павінна быць наладжана работа гарадка

традыцыйных кірмашовых забау, дзе кожны чалавек може праявіць свае здольнасці, паказаць сілу і спрыт.( такія традыцыйныя забавы як*"Слуп-Кола", Палескі слуп*, турнір*"Кароль курка", "Грунвальд",*турнір рыцарау упрыгожыць любы кірмаш***).***

Разам з традыцыйнымі забавамі у масава-гульнёвай зоне можна правадзіць фестываль культарганізатарау горада, раёна. Менавіта там, дзе адначасова выступаюць дзесяткі арганізатарау розных гульняу,так званае *"гульнёвае поле"* з'яуляецца адным з самых яркіх і запамінальных фрагментау культурнай праграмы.

- *спартыўная зона* –абавязкавай часткай сучаснага кірмашу з'яуляецца*спартыўная праграма***.**Паулярнасцю карыстаюццатут традыцыйныя спартыуныязабавы беларусау: турнір асілкау, а таксама барцоу – прадстаунікоу розных вёсак, барацьба з ражаным мядзведзем, выпрабаванні скакавых і рысістых парод каней.

Разам з тым,на кірмашах праводзяцца і сучасныя спартыуныя гульні.

*- дзіцячаязона* – на гэтай пляцоуцы арганізатары шмат увагі падаюць дзецям, дзе выступаюць кал-вы мастацкай самадзейнасці школ, Дамоу юнацтва і г.д; культарганізатары праводзяць разнастайныя сюжэтна-гульнёвыя праграмы для дзяцей. Вялікую цікавасць уяуляюць і сучасныя дзіцячыя пацехі.

*Гульнёвая дзіцячая пляцоўка* – адметная асаблівасць сучаснага беларускага кірмашу – дазваляе з маленства далучаць сяброу да нацыянальнай культуры, выхоуваць у іх павагу і любоу да спадчыны бацькоу і дзядоу.

*1.АРГАНІЗАЦЫЯ СВЯТОЧНАГА КІРМАШУ.*

Састаў дырэкцыі кірмашу.

Для арганізацыі святочнага кірмашу пры аргкаміцеце свята ўтвараецца дырэкцыя, у якую ўваходзяць прадстаўнікі гандлёвых арганізацый, грамадскага харчавання, сферы абслугоўвання, органаў культуры і спорту. На сваіх пасяджэннях дырэкцыя кірмашу распрацоўвае план падрыхтоўкі святочнага гандлю і яго культурную праграму.

Паколькі кірмаш у Беларусі заўсёды быў з'явай інтэрнацыянальнай, то на сучасныя святочныя таргі можна запрасіць гандлюючыя арганізацыі з суседніх раёнаў бліжняга замежжа і вызначыць для іх асобнае месца. У зоне харчовых тавараў можна было б наладзіць работу беларускай карчмы, украінскага шынка, рускага тракціра, польскай кавярні, каўказскай шашлычнай, сярэднеазіяцкай чайханы, малдаўскага віннага склепа і інш. Усе гандлёвыя пункты (кіёскі, палаткі, магазіны) павінны быць аздоблены элементамі мастацка-дэкаратыўнага афармлення, што садзейнічае больш

эстэтычнаму ўспрыманню дзеі. Гандляроў неабходна апрануць у святочныя народныя строі, што надае таргам нацыянальны каларыт. Асаблівую ўвагу належыць звярнуць на падрыхтоўку гандляроў-каробачнікаў, якія сваімі дзеяннямі ствараюць непасрэдную, жывую, гульнёвую атмасферу святочнага кірмашу.

*Патрабаванні да месца правядзення кірмашу:*

Выбар месца для размяшчэння і будаўніцтва аб'ектаў святочнага кірмашу (прадуктовых палатак, кіёскаў інш.) узгадняецца з мясцовымі органамі санітарнага нагляду. Памеры тэрыторыі кірмашу ўстанаўліваюцца з улікам колькасці насельніцтва, якія будуць карыстацца таргамі. Да кірмашу павінны быць добрыя пад'язныя дарогі; яго плошчу фарміруюць з улікам сцёку вады. Кірмаш павінен размяшчацца на адлегласці не меней за 1,5 км ад месца збору смецця і не меней за 500 м ад прамысловых прадпрыемстваў і складоў, у якіх вытворчасць звязана з выдзяленнем пылу і пахаў, а таксама іншых аб'ектаў, якія могуць быць прычынай забруджвання тэрыторыі кірмашу.

Кірмашовую плошчу падзяляюць на дзве часткі — гандлёвую і абслуговую. У гандлёвай частцы ў адпаведнасці з відамі гандлю вылучаюць асобныя дзялянкі для:

а) гандлю харчовымі прадуктамі ў закрытых памяшканнях (магазіны, павільёны, ларкі і інш.);

б) гандлю харчовымі прадуктамі са сталоў, размешчаных радамі па роду прадуктаў (рыбныя, мучныя, малочныя, садавіна, гародніна і інш.);

в) гандлю харчовымі прадуктамі з вазоў і аўтамашын;

г) продажу хатніх жывёл;

д) прамысловых тавараў;

ж) вырабаў народных рамёстваў;

з) таргоў птушкай;

і) прадпрыемстваў культурна-бытавога абслугоўвання (медпункт, цырульня, майстэрня па рамонту абутку).

*Санітарна-медыцынскія патрабаванні.* Продаж харчовых прадуктаў на кірмашы дазваляецца толькі пасля праверкі іх у адпаведнасці з устаноўленымі правіламі ветэрынарна-санітарнай экспертызы.

З пачатку таргоў трэба правесці санітарнае абследаванне аб'ектаў дробнарознічнага гандлю: праверка агульных санітарных патрабаванняў, абавязковых для харчовых прадпрыемстваў, правілы асабістай гігіены, парадак захавання прадуктаў, іх якасць і інш.

У цёплую пару года на кірмашах забараняецца продаж харчовых прадуктаў, якія хутка псуюцца.

Тэрыторыю кірмашу ачышчаюць да пачатку гандлю і пасля яго заканчэння. Вываз смецця ў час таргоў не дазваляецца.

Адметная асаблівасць традыцыйнага беларускага святочнага гандлю — *разнастайныя гандлёва-гульнёвыя дзеі.* Таму на аднаўленне і захаванне нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны дырэкцыя кірмашу павінна звярнуць вялікую ўвагу. У зоне продажу хатніх жывёл можна наладзіць сельскагаспадарчую латарэю з розыгрышам бычкоў, парсючкоў, авечак і інш.; у зоне продажу птушак — птушыны аўкцыён; у месцы, дзе прадаецца рыба, — гандлёвыя атракцыёны “Міёрскі павук”, “Палеская рыбалка”, “Рыбная латарэя”; у радах гародніны і садавіны — мінскую латарэю “Па спісу”, “Воранаўскі чыгун”, валожынскую забаву “Не ляпніся ў лужу”; у зоне цацак — “Дзіцячую рыбалку”, “Івацэвіцкую рулетку”; у зоне продажу кандытарскіх вырабаў — атракцыён “Пастаўскі пернік” і інш.

Адной з галоўных задач пры ўвасабленні гульнёвых формаў гандлю з’яўляюцца захаванне ў структуры кірмашу традыцыйных беларускіх гандлёвых атракцыёнаў і стварэнне на гэтай аснове новых гандлёва-гульнёвых формаўтварэнняў.

У сучаснай кірмашовай культуры гандлёвыя атракцыёны сталі адметнай рысай беларускіх кірмашоў, іх этнічна-спецыфічнай асаблівасцю.

У сучаснай святочнай культуры Беларусі ніводнае свята не абыходзяцца без святочнага гандлю з відовішчамі і забавамі.

Культурная праграма кірмашовага свята павінна складацца з: тэатралізаванага адкрыцця; работы гандлёвых выстаў і творчых экспазіцый; фестывалю мастацтваў; спартыўных спаборніцтваў; конкурсаў народнай музыкі і асобных выканаўцаў; кірмашовых атракцыёнаў; гульняў і забаваў; дзіцячай зоны; урачыстага закрыцця кірмашу з падвядзеннем яго вынікаў і тэатралізаваным фіналам.

У час правядзення кірмашу яго тэрыторыя падзяляецца на відовішчную, масава-гульнёвую, спартыўную і дзіцячую зоны дзеяння.

*Відовішчная зона дзеяння.* Структура праграмы можа быць складзена з фестывалю фальклорнага мастацтва, выступленняў прафесіянальных творчых калектываў, народных вандроўных груп, конкурсаў народных інструментальных ансамбляў, выканаўцаў прыпевак, гумару і інш.

Пры арганізацыі відовішчаў трэба ўлічваць, што з’явы кірмашовага тэатра павінны перш за ўсё адлюстроўваць і развіваць беларускія фальклорныя традыцыі, у выніку чаго пазагандлёвая частка кірмашу набудзе адметныя нацыянальныя асаблівасці.

Спачатку трэба вызначыць месца, дзе будуць адбывацца цэнтральныя відовішчныя мерапрыемствы. Дзеля гэтага трэба пабудаваць эстрадную

пляцоўку вышынёй не меней за 1,2 м, каб гледачам было зручна назіраць прапанаваную дзею. У зоне відовішчных дзей для вандроўных артыстычных груп, перасоўных музычных ансамбляў, маленькіх цыркавых калектываў можна зрабіць фрай (адзін ці некалькі): акрэслены на зямлі канатамі ці вяроўкамі круг дыяметрам 13 м(па дыяметру цыркавоц арэны), дзе вызначаныя калектывы будуць выступаць.

*Масава-гульнёвай зона* кірмашу павінна быць налажана работа гарадка традыцыйных кірмашовых забаў, дзе кожны чалавек зможа праявіць свае здольнасці, паказаць сілу і спрыт.

Методыка арганізацыі і правядзення народных забаў прапануецца ў ніжэйпрыведзеных апісаннях.

*«Слуп-кола».*

Для падрыхтоўкі атракцыёна выбіралі дрэва з роўным ствалом даўжынёй прыблізна 15 м, якое напярэдадні апрацоўвалі: здымалі кару і націралі ствол воскам.

На вяршыні слупа замацоўвалі ў гарызантальным становішчы кола ад воза, да якога прывязвалі на вяроўках разна- стайныя прызы: боты, гармонік і інш. Слуп укапвалі ў зямлю. Удзельнік атракцыёна павінен быў залезці на слуп і зняць адзін з прызоў. Узлезці па слізкім слупе задача не з лёгкіх і патрабуе значных намаганняў гульца, каб перамагчы.

*Падобная забава «Палескі прызавы слуп».*

Для гэтага атракцыёна выбіралася раўнаствольнае дрэва не менш чым 16 м. З дрэва здымалі кару, укапвалі ў зямлю, на канцы ўбівалі тоўсты паўтараметровай даўжыні металічны драб, да якога мацавалі ў вертыкальным становішчы кола ад воза з прызамі. Удзельнік павінен быў залезці на верх слупа, стаць на калені ці на ногі, ухапіўшыся за прут і варочаючы кола, выбраць і адвязаць любы з прызоў.

Задача гульца была надзвычайна складанай, тым не менш гэты атракцыён карыстаўся вялікай папулярнасцю, знаходзі-лася нямала ахвотнікаў паказаць смеласць, сілу, рашучасць і дабыць каштоўны прыз для сябе ці сваёй каханай.

Гэты атракцыён быў вернуты з забыцця ў верасні 1982 г. у гарадскім пасёлку Жыткавічы Гомельскай вобласці на І Рэспубліканскім кірмашы.

І іншыя атракцыёны: *Турнір «Кароль курка»*, «*Грунвальд», «Турнір рыцараў».*

Разам з традыцыйнымі забавамі ў масава-гульнёвай зоне кірмашу можна правесці фестываль культарганізатараў раёна ці горада, дзе ўдзельнікі могуць выступаць з разнастайнымі гульнёвымі праграмамі.

*Спартыўная зона.*Папулярнасцю карыстаюцца тут традыцыйныя

спартыўныя забавы беларусаў: турнір асілкаў, а таксама барцоў — прадстаўнікоў розных вёсак, барацьба з ражаным мядзведзем, выпрабаванні скакавых і рысістых парод коней. Разам з тым на кірмашах звычайна праводзяць і сучасныя спартыўныя гульні. Ладзяць фіналы раённых спаборніцтваў па барацьбе, футболе, валейболе, шахматах, шашках, перацягванні каната, а ў асобных месцах па найбольш папулярным відзе спорту — веславанні (Скідал), конным спорце (Вілейка, Шуміліна, Гродна, Воранава) і інш. На некаторых кірмашах паказальныя выступленні праводзяць баксёры, фехтавальшчыкі, майстры баявых адзінаборстваў, майстры гімнастыкі, культурысты. Спартыўныя праграмы на кірмашы сталі дзейсным сродкам актывізацыі ўдзельнікаў свята, садзейнічаюць вырашэнню праблемы фізічнага выхавання чалавека, уносяць дынамізм у святочны штогодні гандаль.

*Дзіцячая зона.* Шмат увагі на святочным гандлі надаецца дзецям, спецыяльна для якіх ладзяць гульнёвыя зоны, дзе выступаюць дзіцячыя калектывы мастацкай самадзейнасці школ, Дамоў і Палацаў культуры, Дамоў юнацтва, культарганізатары праводзяць разнастайныя сюжэтна-гульнёвыя праграмы для дзяцей, вялікую цікавасць уяўляюць і сучасныя дзіцячыя пацехі. Паспрабуйце адгадаць імя жывога пеўня, якое напісана на паперцы, прывязанай да яго лапкі? Адгадаеце — ваш певень.

А вось дзіцячая рыбалка. За двухметровай чатырохграннай шырмай стаіць скамарох. За невялікую плату дзіця атрымлівае вудачку, закідвае за шырму — і выцягвае прыз (які чапляе яму ўдзельнік, што сядзіць за шырмай).

А ў другім месцы бацька з маці і дзецьмі становяцца на шалі, і калі іх вага будзе складаць, напрыклад 160 кг300 г, яны заслугоўваюць прыз (падарунак).

На дзіцячых пляцоўках амаль заўсёды арганізоўваюцца выстаўка-продаж дзіцячых вырабаў, майстроў малюнка і лепкі, конкурсы юных канструктараў, паказальныя выступленні клубаў службовага сабакаводства, спаборніцтвы авія- і суднамадэлістаў і інш. Гульнёвая дзіцячая пляцоўка — адметная асаблівасць сучаснага беларускага кірмашу — дазваляе з маленства далучаць дзяцей да нацыянальнай культуры, выхоўваць у іх павагу і любоў да спадчыны бацькоў і дзядоў.

Такім чынам, кірмаш, вырашаны ў творчым і арганізацыйным плане як поліфункцыянальная з’ява, зможа адначасова задаволіць матэрыяльныя, эстэтычныя і фізічныя запатрабаванні чалавека, з’явіцца сродкам эмацыянальнай разрадкі, актывізацыі ўдзельнікаў свята.

*Тэма 14. Актывізацыя ўдзельнікаў свята праз гульнявыя дзеянні*

Дыялог як форма звароту да асобы гледача. Яскравасць падзеі – адзін з важных прыкладаў актывізацыі гледачоў. Апытанне гледачоў. Правакаванне дзеянняў гледачоў – падарункі, «шчаслівае месца», латарэя. Падзея – дыялог – выхад гледача на сцэну.

*Тэма 15. Арганізацыя пазаабрадавых гульнявых дзействаў народнага календара*

Рэжысёрская распрацоўка гульнявой праграмы – сукупнасць традыцыйных і рэгіянальнах гульняў, прымеркаваных да святочнага мерапрыемства. Адбор і прасторавае вырашэнне гульняў.

*Тэма 16. Рэгіянальныя гульні Беларусі*

Падзел тэрыторыі сучаснай Беларусі на этнаграфічныя рэгіёны. Гульні, якія характэрны для кожнага рэгіёна, іх умовы правядзення і апісанне дзеяння.

*Тэма 17. Прагляд і аналіз відэазапісаў фальклорных прадстаўленняў*

Вобразны рад у прэзентацыі фальклорнага прадстаўлення. Разнастайныя фарматы, іх асаблівасці. Выкарыстанне мультымедыя ў гульнявых мэтах. Вызначэнне кульмінацыйных падзей.

*Тэма 18. Ідэйна-тэматычная аснова сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення*

Два варыянты напісання сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення. Першы варыянт – выбар тэмы, ідэі і звышзадачы фальклорнага прадстаўлення, затым падбор гульняў і абрадаў, якія будуць суадносіцца з выбранай тэматыкай фальклорнага прадстаўлення. Другі варыянт напісання сцэнарыя – падбор гульняў, а на іх аснове выбар тэмы, ідэі і звышзадачы фальклорнага прадстаўлення.

Выбар тэмы вызначаецца грамадзянскай пазіцыяй аўтара-рэжысёра.*Тэма* – гэта жыццёвая з’ява, падзея, адлюстраваныя ў абрадзе пры дапамозе сродкаў мастацкай выразнасці. *Тэма* – гэта праблема, актуальная для аўдыторыі, тэарэтычнае або практычнае пытанне, якое патрабуе вырашэння. Правільная пастаноўка праблемы дае магчымасць рэжысёру як аўтару-сцэнарысту намеціць першапачатковую канфліктную аснову будучай абрадавай дзеі. *Тэма* – гэта эмацыянальны вопыт, інтэлектуальна-сэнсавы экстракт абрадавай дзеі, які застанецца ў свядомасці і падсвядомасці ўдзель-

ніка і гледача. Тэма, якая фарміруе сюжэт, заўсёды канкрэтная і індывідуальная. Напрыклад, тэмай каляднага абраду ў адным выпадку можа з'яўляцца рэканструкцыя калектыўнага абрадава-масавага дзеяння, здольнага паўплываць праз магію вербальных канструкцый і рытуальных дзей на багацце ўраджаю і статка ў новым аграрным годзе, у іншым варыянце аўтар праз розныя абрадавыя формы можа раскрыць этапы трансфармацыі калядных звычаяў і пераўтварэнне іх з рытуальных у бытавыя.

*Ідэя* – галоўная вядучая думка, якая вызначае мастацкую задуму сцэнарыя і асноўны змест абраду. *Ідэя* – гэта эмацыянальна насычаны вобраз, які адлюстроўвае светапоглядныя і філасофскія разважанні рэжысёра.

*Тэматычны блок*– гэта сукупнасць эпізодаў, якія па-мастацку раскрываюць аспекты аўтарскай канцэпцыі, што аб'яднаны адным сцэнічным заданнем. Аўтарская канцэпцыя заўсёды мае некалькі аспектаў, таму колькасць тэматычных блокаў у сцэнарыі павінна суадносіцца з лікам гэтых аспектаў. Кожны тэматычны блок павінен мець вобразную назву, у якой канцэнтруецца сутнасць ідэйнай часткі сцэнарыя.

*Архітэктоніка* – паслядоўнасць і суразмернасць частак, якія аб'яднаны ў адзінае ідэйна-тэматычнае цэлае. Архітэктоніка вывучае сувязь паміж асобнымі часткамі драматургічнага твора і іх функцыянальную накіраванасць. Асноўныя элементы-падзеі кампазіцыйнага рашэння наступныя:

*пралог* – своеасаблівая прадмова, якая падрыхтоўвае ўдзельнікаў да маючай адбыцца ўрачыстасці. У пралогу адлюстроўваецца ў самым агульным выглядзе тэма і ідэя;

*экспазіцыя* – увод у святочную дзею. Задачы экспазіцыі: інфармацыя ўдзельнікаў абрадава-гульнявой, святочнай дзеі аб будучых дзеяннях і стварэнне атмасферы ўрачыстасці, святочнасці;

*завязка* – з яе пачынаецца драматургічны твор, "завязваюцца" канфлікт, пазіцыі бакоў, персанажаў;

*развіццё дзеі* – лагічная і эмацыянальная падрыхтоўка галоўнай падзеі; далучэнне ўдзельнікаў да сімвалаў свята, абраду, стварэнне псіхалагічнага настрою, які садзейнічае найбольш поўнаму ўспрыманню дзеяння;

*кульмінацыя* – найвышэйшы эмацыянальны пункт у развіцці тэмы;

*фінал* – завяршальная частка, эмацыянальна-сэнсавы вынік.

Разглядаючы архітэктоніку традыцыйнага каляднага абраду, можна вызначыць наступныя дзеі, у якіх выяўляюцца асноўны змест і сімволіка рытуалу:

экспазіцыя – шэсце карнавальнага гурту калядоўшчыкаў па вёсцы да гаспадаровай сядзібы, выкананне "агульных" калядак;

завязка – уваход калядоўшчыкаў у хату, дыялог паміж павадыром і

гаспадаром;

развіццё дзеі – выкананне велічальна-віншавальных песень і хвалебных прамоў членам сям'і: гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну; магічна-абрадавыя дзеі цэнтральных зааморфных масак казы, мядзведзя, каня, жорава і інш.;

кульмінацыя – карнавальнае прадстаўленне ражаных, гратэскавых персанажаў;

развязка – просьба калядоўшчыкаў аб адорванні. Узнагароджванне спевакоў падарункамі;

фінал – выкананне каляднага гімна.

*Сцэнарна-рэжысёрскі ход* – гэта вобразны рух аўтарскай канцэпцыі, накіраваны на дасягненне мэты эмацыянальнага, педагагічнага ўздзеяння. Пошук арыгінальнага аўтарскага сцэнарна-рэжысёрскага ходу – для рэжысёра задача складаная. Ён павінен быць знойдзены або прыдуманы на этапе распрацоўкі задумы, калі сфармулявана праблема, распрацавана мастацкая канцэпцыя. Запазычаны, ужо існуючы сцэнарна-рэжысёрскі ход, выконваючы функцыю штучнага аб'яднання сцэнарнага матэрыялу, з'яўляецца прыёмам. Калі замена аднаго прыёму на іншы не змяняе вашай задумы, значыць, і самой задумы як аўтарскай, наватарскай каштоўнасці не існуе.

У зімовым абрадавым комплексе сцэнарна-рэжысёрскім ходам можа быць спаборніцтва двух калядных гуртоў, напрыклад мужчынскага і жаночага. У абрадах сёмушнага святочнага кантынууму вобразна-сімвалічным дзеяннем, якое аб'ядноўвае асобныя эпізоды, можа стаць варажба на вянках, павязванне стужачак і загадванне запаветнага жадання на агульным вялікім вянку.

### *Тэма 19. Эксплікацыя фальклорнага прадстаўлення*

Экспазіцыя – арганізацыя гульнявой прасторы, фарміраванне каманд. Завязка – тлумачэнне ўмоў гульні. Развіццё дзеяння – пабуджэнне да гульнявога дзейства, актывізацыя гледачоў да ўдзелу ў гульнях, кіраванне гульнявым працэсам. Кульмінацыя – дасягненне гульнявой мэты. Фінал – узнагароджанне пераможцаў.

Пластычным увасабленнем сцэнічнага ўзаемадзеяння з'яўляюцца групіроўкі і мізансцэны. *Групіроўкай* называецца ўзаемнае размяшчэнне дзеючых асоб на сцэнічнай пляцоўцы. Групіроўка – гэта статычны момант мізансцэны.*Мізансцэна* (франц. *mise en scène* – размяшчэнне на сцэне) – размяшчэнне ўдзельнікаў на сцэне ў кожным з асобных момантаў сцэнічнай дзеі. У распрацоўцы мізансцэн выяўляецца складанае ўзаемадзеянне формы і зместу – выяўленне ўнутранай сутнасці канфлікту, узаемадзеянняў, ідэі,

логікі сцэнічнай дзеі праз яго форму, знешні візуальны вобраз драматургічнага твора. Рух акцёра, мізансцэна – гэта не толькі простае псіхалагічна або ў бытавым сэнсе апраўданае перамяшчэнне дзеючых асоб на сцэне. Мізансцэна – сэнсавае, дзейснае вырашэнне сцэнічнага вобраза. Адначасова з гэтым мізансцэна з’яўляецца пластычным адлюстраваннем аўтарскай думкі асобнага эпізоду.

З пункту гледжання звычайных сцэнічных умоў, існуюць некалькі асноўных прыёмаў пабудовы мізансцэн і групіровак: уздоўж рампы, упоперак рампы, па дыяганалі, па вертыкалі, па крывой.

*Перпендыкулярныя* мізансцэны, разгорнутыя ў глыбіню сцэнічнай пляцоўкі, даюць магчымасць стварыць эфект перспектывы руху, эфектна арганізаваць выхад асноўных дзеючых асоб з глыбіні на авансцэну, што дазволіць найлепшым чынам успрыняць іх міміку, голас, погляд. Але перпендыкулярная пабудова мізансцэны мае пэўныя недахопы: удзельнікі абрадавай дзеі на першым плане пляцоўкі заўсёды будуць перакрываць артыстаў, якія знаходзяцца на ар’ерсцэне. Падчас дыялога адзін з удзельнікаў будзе заўсёды знаходзіцца спіной да партнёра або гледача. З гэтымі ж цяжкасцямі рэжысёр сутыкнецца пры пабудове масавай сцэны, галоўная мізансцэнічная вось якой будзе праходзіць перпендыкулярна рампе. Такая пабудова будзе арганічнай у выключных выпадках, калі цэнтральны выхад дзеючых асоб з глыбіні з’яўляецца галоўнай падзеяй эпізоду.

Больш выразнымі і яскравымі з’яўляюцца *паралельныя* мізансцэны. У гэтым выпадку ўсе прасторавыя рухі партнёраў будуць больш аб’ёмнымі, рэльефнымі і значнымі для гледача. Пабудова масавай сцэны паралельна рампе дазволіць паказаць буйным планам большую колькасць дзеючых асоб і стварыць уражанне дыстанцыі паміж партнёрамі. Тым не менш пастаяннае выкарыстанне профільных планіровак робіць сцэнічную дзею аднастайнай, пры гэтым глядач не бачыць мімікі і поглядаў удзельнікаў, цяжкім становіцца ўспрыманне іх мовы і голасу. Профільная фігура ў сярэдзіне сцэны адной палавінай глядзельнай залы будзе чытацца як паўспінная, другой – як паўфас. А гэтыя два ракурсы вырашаюць зусім розныя задачы.

*Дыяганальная* мізансцэна (труакар) – адна з самых красамоўных, каштоўных мізансцэнічных магчымасцей. Па-першае, дыяганаль – гэта самая доўгая адлегласць на планшэце сцэны; па-другое, дыяганальнае прыбліжэнне дае складаны эфект змянення кампазіцыі ў двух вымярэннях адразу.

Каб парушыць прамалінейнасць сцэнічных планіровак, мізансцэна можа быць пабудавана па крывой лініі або спіралі (*спіральная*).

*Прыём шахматнай пабудовы* дазваляе дасягнуць ілюзіі вялікага гурту пры невялікай колькасці выканаўцаў і кожнаму ўдзельніку масавай сцэны

знайсці месца, з якога ён будзе бачны гледачу.

*Мізансцэнічная рыфма* – гэта прасторавае падабенства мізансцэнічнага малюнка ў розных сэнсавых дзеях і эпізодах сцэнічнай дзеі. Яна можа быць дасягнута праз паўтаральнасць поз, аднолькавасць і сінхроннасць руху (люстэркавыя мізансцэны), сіметрыю ў расстаноўцы фігур (сіметрычныя мізансцэны).

*Сцэнічныя планы* звычайна вызначаюцца па кулісах. Першы план адпавядае першай пары куліс. Ён прадугледжвае большы аб'ём кампазіцыі і дае вольнасць рухам удзельнікаў. Мізансцэны другога плана дазваляюць успрымаць чалавека цалкам, яго галоўныя рысы, стварыць імгненны эскіз персанажа. Часцей за ўсё другі план называюць сямейным – тут бачны дзеянні адначасова цэлай групы людзей. Астатнія сцэнічныя планы дазваляюць гледачу ахапіць зрокам асноўную частку сцэнічнай прасторы. Ар'ерсцэна зручная для пабудовы вялікіх манументальных кампазіцый.

У традыцыйным абрадавым масава-імправізацыйным дзеянні на вольным паветры найбольш красамоўнымі, вобразна-выразнымі і эмацыянальна-зразумелымі для ўдзельнікаў будуць *паўкругавыя* і *кругавыя* мізансцэны. У рытуальных практыках свят "сонечнага крыжа" магічнае кола сімвалічна выяўляла ідэю замкнёнасці, яднання; успрымалася той плошчай, тэрыторыяй, у межы якой не павінна пранікнуць ніякае ліха. У прасторавым вырашэнні навядзенне магічнага кола ў абрадах магло ажыццяўляцца ў розных локусах рознымі спосабамі: абворваннем навокал вёскі (імкненне засцерагчы паселішча ад градавых бур, эпідэмій), асобных сяліб (перад уваходзінамі ў новую хату); аб'ездам ці абыходам пэўнага аб'екта (жывёліны, культавага будынку, вясельнага паяздочка, калодзежу); абнясеннем пэўных рэчаў (вакол статка, каб зберагчы ад драпежнікаў); прачэрчваннем (на Купалле ад жахаў, калі чалавек чакаў зацвітанне міфічнай папараці-кветкі).

Сімвалічным магічна-ахоўным зместам надзяляўся і абрадавы рэквізіт, з'яўляючыся своеасаблівай мадыфікацыяй кола: заручальны пярсцёнак, замкнуты замок, хамут, абруч ад дзяжы, вянок і інш.

Такім чынам, у кожным з абрадавых локусаў (вёска, дарога, лес, паляна, поле, сялянскі падворак, хата) у залежнасці ад функцыянальнага прызначэння рытуалу кола напаўнялася розным сэнсавым зместам.

У *кругавых* мізансцэнах удзельнікі бачны з розных бакоў, бачыцца разнастайнасць ракурсу іх цела і рухаў у момант зносін з партнёрамі. Гэты прынцып выкарыстаны ў кругавых карагодах – "адным з найдаўнейшых жанраў фальклорна-гульнявой, абрадавай сфер традыцыйнай культуры. Яго графічная семантыка звязана з архетыпам кола і праз яе – з Сонцам. Карагод

выступае сімвалам дынамічнага Космасу, асабліва, калі ў цэнтры яго стаіць гульнявы выканаўца”.

*Тэма 20. Сюжэтна-вобразная структура фальклорнага прадстаўлення*

Сцэнарна-рэжысёрскі ход – сродак, які злучае разнастайныя гульні ў адной праграме. Магчымыя варыянты сцэнарна-рэжысёрскага ходу – падарожжа, зварот у мінулае, сустрэча людзей з процілеглымі поглядамі, барацьба за ўладаранне. Аснова кожнага сюжэта – канфлікт. Выбар вобразаў фальклорнага прадстаўлення– эмацыянальная значнасць для гледачоў і выканаўцаў.

*Тэма 21. Музычнае афармленне, мастацка-дэкаратыўнае і моўнае вырашэнне фальклорнага прадстаўлення*

Стварэнне святочнай атмасферы ў фальклорным прадстаўленні. Лейтматыў і фонавая музыка, асаблівасці падбору музычнага рада. Асаблівасці маўлення. Метады дакладнага тлумачэння ўмоў гульні для ўдзельнікаў. Распрацоўка рэквізіту і выбар прызоў.

*Тэма 22. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўкафальклорнага прадстаўлення*

Падзел святочнага асяроддзя на зоны дзеяння. Прасторавыя і архітэктурныя адметнасці зоны дзеяння. Табліца гульняў. Каштарыс фальклорнага прадстаўлення. Разгляд прыкладаў табліц гульняў і каштарыса з розных свят беларускага народнага календара.

Нараджэнне і “крышталізацыя задумы”

Існуюць два паняцця слова “задума”: задума як задуманы план дзеянняў ці дзейнасці, номер і задума як закладзены ў творч сэнс, яго ідэя. У рэжысуры мы можам выкарыстоўваць абодва гэтых паняцці, памятаючы аб тым, што размова ідзе аб розных з’явах. Прчым, калі з другім значэннем “задумы” усё больш –менш проста (гэта паняцце замяняецца паняццем ідэі твора), то задума як нейкі план дзеянняў патрабуе некаторых тлумачэнняў. Наогул любая праца пачынаецца з раздумы аб тым, што і як мы збіраемся рабіць. Чалавек схільны аналізіраваць і прыдумляць кожны сваё дзеянне. Тым больш гэта важна ў такой творчай спецыяльнасці, як рэжысура.

Рэжысёрская задума – гэта сукупнасць поглядаў рэжысёра на яго будучую пастаноўку – яго бачанне ўсяго, што ён хоча ўвасобіць на сцэне. Задума пастаноўкі з’яўляецца, як правіла, задоўга нават да першых спроб яе ўвасаблення. Усе ведаюць прыклады аб тым, як тэатральныя рэжысёры выношваюць задумы сваіх спектакляў па некалькі год і, толькі тады, калі яны

цалкам усведамляюць, што і як яны будуць рабіць, то пачынаюць плённую работу. Як нараджаецца задума? На гэтае пытанне немагчыма даць адказ – у кожнага рэжыёра гэта адбываецца па рознаму: нехта назірае за працай калегі і чэрпае нейеія ідэі ў апошняга, развівае іх і будуе на аснове чужога матэрыяла сваю канцэпцыю. Нехта чэрпае сюжэты з жыцця. Нехта аналізіруе свае асабістыя папярэднія работы і будуе планы а аснове іх. Аднак у кожным з гэтых “метадаў” можна знайсці нешта агульнае, а менавіта:

1) для ўзнікнення задумы неабходна нейкая падзея, якая выклікае ў рэжысёра “эмаыянальны ўсплеск”, прымусіць яго думаць на акрэсленую тэму;

2) для ўзнікнення і развіцця задумы рэжысёр авінен дэтальна пазнаёміцца з матэрыялам, які тычыцца тэмы яго пастаноўкі. Гэта часта называюць “быць у матэрыяле”;

3) для ўзнікнення задумы режысёр павінен пазнаёміцца з работамі іншых рэжысёраў па той жа тжматыцы, інакш ён рызыкуе паўтарыць чужыя ідэі.

Калі ён выканае ўсе гэтыя умовы, рэжысёр можа называць сукупнасць сваіх меркаванняў рэжысёрскай задумай. Наступным этапам у распрацоўцы задумы будзе яе “крышталізацыя”. “Крышталізацыя задумы” – не вельмі удалае слова, лепш замяніць яго паняццем “структурыраванне задумы”. Гэта азначае, што на гэтым этапе будзе адбывацца адбор ідэй і адкідванне ўсяго непатрэбнага, не падыходзячага для гэтай пастаноўкі. Для таго, каб структурыраваць задуму і ператварыць яе ў рэжысёрскую эксплікацыю, таксама неабходна выказаць шэраг умоў:

1. Правесці папярэдні ідэйна-тэматычны аналіз і перш за ўсё, вызначыць звышзадачу, ідэю і тэму пастаноўкі.

2. Канчаткова адкінуць ўсё непатрэбнае і заставіць толькі самае неабходнае з ідэй, якія прыйшлі ў працэсе стварэння задумы.

Далей рэжысёр можа пераходзіць да састаўлення творчай заяўкі. Творчая заяўка – гэта выразна сфармуліравана і зафіксавана на паперы рэжысёрская задума, уключаючая ў сабе рэжысёрскую эксплікацыю, папярэдні ідэйна-тэматычны аналіз, распрацоўку афармлення пляцоўкі, прыкладны гукавы шэраг і, магчыма, нават прыблізны каштарыс.

## Раздзел II. Абрадава-рытуальны комплекс народных свят як аснова факлорнага прадстаўлення

### *Тэма 1. Абрады і іх роля ў жыцці грамадства і асобы*

Паняцце «абрад». Асноўныя элементы абраду. Генезіс абрадаў і іх сацыяльная роля. Гістарычная эвалюцыя зместу, форм, тыпаў і функцый абрадаў. Структурныя элементы рытуальна-абрадавых комплексаў земляробчага календара. Маскіраванне і абрадавае пераапрананне. Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў. Рэлігійныя абрады, іх сімвалічная і практычная значнасць. Грамадскія і дзяржаўныя абрады.

Рэжысёрскі аналіз народнага абраду. Рэжысёрскае бачанне абрадавага дзейства (рэжысёрскае асваенне сцэнарыя абраду). Работа рэжысёра з мастаком над мастацка-дэкаратыўным вырашэннем абраду. Работа рэжысёра над музычным вырашэннем абрадава-рытуальных дзеянняў. Пластыка-харэаграфічнае вырашэнне абраду. Работа рэжысёра над словам і мовай у абрадзе. Этапы пастановачнай работы па ўвасабленні абраду.

Сучасная практыка правядзення абрадаў у розных раёнах Беларусі. Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абраду ў закрытым памяшканні на аснове народных традыцый выбранага этнаграфічнага рэгіёна. Збор і апрацоўка вусна-паэтычнага, музычнага і пластыка-харэаграфічнага матэрыялу, стварэнне сцэнарыя і пастановачнага плана абрадавага дзейства, выраб дэкарацый, касцюмаў, рэквізіту і бутафорыі, правядзенне рэпетыцый і паказ абраду.

### *Тэма 2. Класіфікацыя абрадаў*

Асноўныя прынцыпы тыпізацыі абрадаў па сферы працы: паляўнічыя, рыбацкія, земляробчыя, жывёлагадоўчыя, воінскія і іншыя. Тыпізацыя абрадаў у залежнасці ад сацыяльных супольнасцей: грамадскія, дзяржаўныя, сямейныя. Дзеянне абрадаў узроставай дэферэнцыяцыі: дзіцячыя, юнацкія, абрады для моладзі. Абрады, звязаныя з календаром (порамі года, сезонамі земляробчай працы, юбіленымі датамі). Рэлігійныя і свецкія абрады.

Аб’ектыўная патрэба вывучэння, захавання і развіцця традыцыйнай беларускай каляндарнай і сямейна-бытавой абраднасці, распрацоўка і далейшае ўдасканаленне новай нацыянальнай абраднасці.

*У святочны каляндар Беларусі* уваходзяць дзяржаўныя , прафесійныя,ваенныя, святы каляндарнага цыкла:: а) свята пор года і б)святы сельскай гаспадарчай накіраванасці.

Маладзёжныя або дзіцячыя святы, студэнтскія святы,святы мастацтваў,

Святы прысвечаныя выдатным дзеячам культуры( Якубу Коласу, Янке Купале і г.д..),

Новыя святочныя утварэнні. А таксама усебеларускі фестываль нацыянальных культур,усебеларускі фестываль народнага гумару „святы гарадоў і вёсак,

Кірмашы, святы народных рамёстваў,міжнароднае свята “ Звіняць цымбалы і гармонік”, свята мастацтваў(Сожскі карагод), канфесійныя святы. Найбольш інтэнсіўна развіваюцца каталіцкія святы – бо яны тэатралізаваныя.

*Хрысціянскія святы* ў сваю чаргу падзяляюцца на праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія.Існуе пэўная класіфікацыя праваслаўных свят.вылучаецца група свят па іх значэнню::вялікія,сярэднія,малыя.(найбольш вялікае –Вялікдзень) і па зместу( у гонар Хрыста), і прастольныя святы( у гонар цудатворных абразоў). Каталіцкія святы былі усталяваны ў хрысціянстве да 7 ст.,пасля з’явіліся шэраг сваіх свят.Каітолікі адзначаюць свае святочныя дні па грыгарыянскаму календару,які быў прыняты ў 1582г. па ініяцыятыве папы Грыгорыя 8.-га.Уніяцкія святы сфарміраваліся ў выніку ўзаемаўплыву ізліцця элементаў каталіцкай і праваслаўнай святочных традыцый на працягу амаль дзвюх стагоддзяў.

*Каляндарныя святы* звычайна дзеляцца на цыклы, кожны з якіхадпавядае пэўнай поры года абол сезонна-вытворчай дзейнасці.Святы пор года:

-да зімовых свят належаць – Каляды, Масленіца, Грамніцы.

-веснавыя-Сустрэча вясны, Вялікдзень,Юр’я, Сёмуха.

-летнія- купалле , зажынкі, Дажынкі

-восеньскія- Багач, Кірмаш(Фэст), Пакроў, Дзяды.

*Прафесійныя святы*- гэта былі раней святы цэхавых рамеснікаў, прысвечаныя святым патронам(мелі свайго заступніка – злотнік – святогаЯўлогія).Па структуры свята падзялялася::а)абрадавыя дзеянні, што папярэднічалі святу ;б)непасрэдна само свята.

Сучасныя прафесійныя святы:дзень медыцынскага работніка, дзень хімік,дзень энэргетыка, дзень геолага, дзеньработніка лёгкай прамысловасці, дзень работнікаў гандлю, дзень работнікаў лесу, дзень машынабудаўніцтва, дзень работнікаў сельскай гаспадаркі, дзендруку.

*Ваенныя святы*: дзень паветранага флоту(савецкай авіацыі),дзень пагранічніка, дзень таможніка, дзень міліцыі.

*Маладзёжныя святы*: дзеньСв.Валянціна,дзень моладзі(24 чэрвеня).

*Дзіцячыя*: дзень аховы дзіцяці(1 чэрвеня).

*Школьныя святы*: дзень ведаў, выпускны баль, свята апошняга званка.

*Дзяржаўныя святы* звычайна усталёўваюцца ў азнаменаванні падзей,якія маюць вялікае гістарычнае ці грамадскапалітычнае значэнне для краіны і аказвае ўплыўна развіццё на развіццё грамадства. Каляндар грамадскіх свят беларусаў,як і іншых народаў , пастаянна мяняўся.Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь зацвердзіў свяіточны каляндар Беларусі, але не ўключыў маладзёжныя, студэнцкія, ні народных, ні дзяржаўных( да яго былі дзяржаўныя святы::каляды,дзяды).Гэта можна тлумачыць тым, што святочная культура вырасла.

*Тэма 3. Рытуальна-абрадавыя комплексы свят каляндарнага цыкла*

Структурныя элементы рытуальна-абрадавых комплексаў земляробчага календара (магічныя дзеянні, абрадавыя песні і танцы, атрыбуты і сімвалы, прыкметы, варожбы), скіраваныя на ідэі паляпшэння дабрабыту, прынцыпы падабенства, захавання і працягу свайго роду, ушанаванне продкаў.

Травестацыя (маскіраванне і абрадавае пераапрананне) – унікальная з’ява традыцыйнай святочна-абрадавай культуры беларусаў, яе гаспадарча-аграрная, камунікатыўная, магічная, псіхалагічная, увесяляльная функцыі. Прыметы, уласцівыя абрадава-рытуальным комплексам каляндарнага цыкла (культ сонца, зямлі, прыроды, вады, агню, расліннасці, продкаў; абавязковая наяўнасць сімволікі, рытуальнай ежы, шэсцяў).

*Тэма 4. Рэлігійныя абрады*

Таінствы – хрысціянскія абрадавыя дзеі (хрышчэнне, прычашчэнне, свяшчэнства, пакаянне (споведзь), мірапамазанне, шлюб, алеeасвяшчэнне (сабораванне)).

Практычная і сімвалічная значнасць рэлігійных абрадаў. Абраднасць як неад’емная частка рэлігійнага культу, эмацыянальна-вобразнае ўвасабленне рэлігійных ідэй і ўя’ўленняў, знешняя форма праявы рэлігійнасці. Вызваленне традыцыйнай народнай абраднасці ад рэлігійных напластаванняў.

*2.Структура, Семантыка і змест абрадау завяршэння Каляд на вольным паветры (“Кола”,”Цягнуць Каляду на дуба“,”Конікі“).*

У Беларусі існавалі старажытныя язычніцкія абрады завяршэння Каляд на вольным паветры.

1.Абрад *“Кола”* (*в.Вялікае Сяло, Дзяржынскі р-н, Мінск.вобл.*) існуе дагэтуль.Рабілі слуп вышынёй 15 м пасярод вёскі аблівалі яго вадой, каб замёрз*(слуп уяуляу сабой стары Новы Год; кола,якое мацавалася да слупа-*

*сімвалстарога года.).* Побач распальвалі касцёр .У абрадзе прымалі удзел і мужчыны (абрад з'явіуся у эпоху патрыярхату). Трэба было залезціна слуп (рытуальнае знішчэнне старага года), зняць кола і кінуць яго у касцёр.

Хто гэта зробіць-прыносіць сонца у жыццё.Той чалавек будзе лічыцца самым ганаровым госцем у любой хаце (яму налівалі гарку,давалі закусць).

**2.** Абрад *<u>"Цягнуць Каляду на дуба"</u>* (*в.Глухі ток, Неганічы, Светлічы Бярэзінскі р-н*).

Калядоушчыкі рыхтавалі ляльку-Каляду з саломы, бралі барану уверх зубамі, накладвалі сена, усаджвалі Каляду, паміж ног ставілі гаршчок з хуццёй. Раніцай у 10-11 гадзін людзі з усіх вёсак едуць да дуба з песнямі, музыкай.З вёскі вязуць Каляду і адбываецца рытуал пахавання <u>Зімы.</u> Ляльку вешалі на дубе, барану з куццёй узцягвалі як мага вышэй на дуб бліжэй да сонца, каб яно магло пасці, каб хутчэй пусціла гарачыя промкі, каб буяла жыццё.У старажытнасці гэта быу дуб.Часам куццю не узцягвалі, а адзін з спрытных хлапчукоу залазіу як мага вышэй і там пакідау гаршчок з кашай. Запальвалі вогнішча да нябёс *(чым вышэй,тым больш сонца абагрэе).*Вакол вогнішча вадзілі харагоды, спявалі

*<u>Зімовыя песні</u>( у гульні не гулялі ).*Пускалі чарку-кругавуху,апошні выпівау і спявалі *"Будзь ваша здароу"* і ціха разыходзіліся да дому *( існавау да 80-х гадоу ).*Зразумела,што гэта была калектыуная (агульнавясковая ) ахвяра Сонцу, багам, продкам, а найперш- адной з прыродных стыхій – Марозу ,каб ён улетку не "спёк " жытнішча, садавіну і агародніну.

**3.**Абрад *<u>"Конікі"</u>(Давыд-Гарадок, Сталінскі р-н, Брэсцк вобл.).* Па традыцыі у Давыд-Гарадку кожны рог, канец вуліцы, рабіу свайго "коніка" і іншых персанажау. Гурты калядоушчыкау да 15 чалавек хадзілі па хатам: упоунач на плошчы Леніна з'яуляецца Сурмач. З розных бакоу горада ідуць гурты са сваімі конікамі.Кожны гурт ведае сваё месца. З'яуляецца *Сурмач* і дзед (самы сталы чалавек ) стучыць тры разы і крычыць: *"Пачынаем конікі".*

Гурты пачынаюць спяваць,гуляць у гульні,далучаць да сябе людзей. Задача- сабраць каля сябе як мага больш народу-той гурт і перамагае.Дзед назірау дзе лепш, ён і аб'яуляу:

*"Сёння выйграу гурт вуліцы ..."*. Гэты гурт з музыкай падыходзіць да сцэны. Дзед: *"Пачынаем кола шанавання".* Астатнія гурты ідуць па колу і аддаюць пераможцам пачастункі. Затым дзед аб'яуляе конкурс музыкау.Усе гарманісты па чарзе іграюць, астатнія танчаць і выбіраюць коніка. Той хто зможа перайграць усіх, на увесь год атрымлівау незвычайную прывілею: на працягу усяго года ён быу самым запатрабаваным музыкам на усіх мясцовых вяселлях. Лепшы *<u>"конік"</u>* атрымлівае прыз. У завяршэнні Конікау, распальваюць вогнішча. Яго запальваюць: Дзед, кіраунік лепшага гурта,

лепшы

*“конік”,*лепшы музыка. Пад барабан робяць *3* кругі вакол кастра,на кожную чвэртку круга загадваюць *12 жаданняў.* Пасля гучыць калядная песня *“Будзь ваша здароу”*і свята вяршаецца. Такім чынам – беларусы.

*Тэма 5. Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў*

Старажытныя традыцыі ўваходзін. Агонь і зерне як сімвал захавання дабрабыту і багацця ў хаце. Рытуал асвячэння гаспадаркі, сустрэчы і ўшанавання першага госця.

Прадметна-атрыбутыўны, акцыянальны (рытуальныя дзеянні) і вербальныя коды ў абрадах вяселля і пахавання. Радзінна-хрэсбінны цыкл беларускіх народных абрадаў. Абрады змянення жыццёвага статуса чалавека як абрады пераходу.

Сімволіка нацыянальнай каларыстыкі ў сямейнай абраднасці беларусаў.

*2.Сямейна – бытавыя абрады беларусаў, іх змест і вобразнасць. (на прыкладзе “Вяселля”, “Радзін”)*

Важнае месца ў духоўнай спадчыне займае сямейна-бытавая культура, якая найбольш поўна адлюстроўвае этыка-маральны бок укладу жыцця, прынцыпы рытуальна-абрадавых і штодзённых паводзін.

Беларускае вяселле складалася з агульна-славянскіх звычаяў і абрадаў. Шлюбная цэрымонія падзялялася на некалькі этапаў:

1.Пярэпыты.
2.Сватанне
3. Заручыны
4. Зборная субота
5. Каравай
6. Ад’езд маладога па нявесту
7. Вянчанне
8. Урачыстае застолле ў нявесты
9. Урачыстае застолле ў жаніха
10. Пасад нявесты
11.Распляценне касы
12. Злучэнне маладых
13. Пярэзвы або госці.

*Сватанне.* Раскрываецца старадаўняя форма шлюбу – купля-продаж нявесты. Сватоў павінна быць няцотная колькасць.

Сват казаў бацькам нявесты “Ёсць у вас тавар, у нас - купец, калі лад, дык і клад...”

Праз тыдзень пасля сватання спраўлялі *Запоіны* з ўдзелам сватоў і бацькоў жаніха. Пасля пачастункаў маці нявесты давала падарункі гасцям. Затым клікалі нявесту. Нявеста кланалася бацькам, сваякам, потым жаніха і нявесту садзілі за стол і частавалі. Праз тыдзень адбываліся *Заручыны.* Толькі на заручынах пачыналі спяваць песні, абгаворвалі эканамічны бок вяселля. Зваліся сябры маладых.

Праз 1-3 тыдні спраўлялася вяселле. Напярэдадні адбывааліся вечарыны ў маладога і нявесты. Ў маладой гэты вечар меў назву – *зборная субота* ( дзяўчаты плялі вяночкі, моладзь спявала, гуляла ), у маладога – хлапечнік.У вясельны абрад ўваходзіла і праверка цнатлівасці нявесты – пасад. Калі яна захавала цноту, саджалі на дзяжу, пакрытую кажухом наверх, і расчэсвалі ёй косы. Калі не цнатлівая – не садзілася на дзяжу, бо грэх.

*Каравайны абрад*. Хлеб – аснова дабрабыту сям'і, ён быў важным атрыбутам у абрадавым рытуале на ўсіх этапах вяселля. Хлеб сімвалізаваў дастатак у сям'і і яе шчаслівае заможнае жыццё.

*Вяселле.* Вечарам ў прызначаны час ў жаніха збіраюцца госці. Вось як на прыклад пачынаецца *вяселле ў жаніха.* Бацька ці сват запрашае гасцей за стол і яны снедаюць, спяваюць, а потым танчаць. Малады з дружынаю пад песні і музыку на прыбраных вазах едзе па маладую. Яго маці апранае кажух і тройчы абягае вакол павозкі маладога. На працягу ўсяго пуці жаніху загароджвалі дарогу.

У хаце нявесты вяселле пачыналася так, як і ў жаніха. За сталом ёй спявалі адпаведныя песні, толькі яшчэ больш, чым жаніху. Каля двара маладухі вясельны поезд спыняецца, ўсе высаджваюцца. Гасцей сустракае маці ў вывернутым кажусе з хлебам-соллю на талерцы і запрашае ўсіх у хату. Малады выкупае нявесту. У царкву ехалі на розных вазах ( пасля вянца – садзіліся ў адзін). Каля двара жаніха вясельны поезд спыняецца, ўсе высаджваюцца, бацька і маці вітаюць маладых хлебам-соллю.

Пачынаецца вясельная бяседа. Пад канец вяселля радня маладухі выводзіць яе з-за стала і садзяць на дзяжу, накрытую кажухом, воўнай ўверх і пачынаюць павязваць. Здымаюць вянок і надзяваюць сяброўцы, якую садзяць побач. Потым абедзьвюх ахінаюць прасцінаю, пасля чаго малады павінен пазнаць маладую. Маладому давалі есці мяса пеўня, а маладой - курыцу (каб неслася, як курыца).

Радня маладой ад'язджае да дому. Праз тыдзень зяць едзе да бацькоў маладухі клікаць іх на пярэзаўкі, дзе бацькі ўпершыню сустракаюцца з дачкой пасля вяселля. Беларускае вяселле было і застанецца самым цікавымі багатым абрадам.

У сямейным быце беларускага народа важнае месца займае сістэма вераванняў і нормаў, звязаная з цяжарнасцю жанчыны, нараджэння дзіцяці. Звычаі і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці ў мінулым былі прызначаны забяспечыць шчаслівы лёс чалавека, які нарадзіўся. Жанчына прытрымлівалася мясцовых правіл і норм. Цяжарнай жанчыне нельга глядзець на пажар, нябожчыка, наступаць на вяроўку, жорны. У калядны перыяд нельга шыць, вязаць, плесці, нельга хутка гаварыць, глядзець ў замочную скважыну. Яна павінна глядзець на ўсё прыгожае. Калі жанчына раджала, ніхто, акрамя бацькі і павітухі не павінен ведаць аб гэтым. Ў час родаў, развязвалі вузлы, адчынялі дзверы, ішлі ў царкву, абмывалі ікону Божай маці і паілі гэтай вадой парадзіху, чыталі замовы. Дзіця прынімалі на льняное палатно. Купаючы дзіця – кідалі срэбраныя, медныя манеты ў ваду. Павітуху адорвалі падарункамі. Праходзіла 2-3 дні і да парадзіхі прыходзілі ў атведкі. Першую чарку падымалі за здароўе маці, бабкт-павітухі, бацькі, дзіця. Прыходзілі замужнія жанчыны з кавалкам сала, сыры, мёда. Надыходзіў абрад *хрышчэння*.

*Хрэсьбіны* – радзінны абрад, праводзілі ў сям'і навароджанага ў выпадку хрышчэння ў царкве. Абрад сімвалізаваў сабой прынящце навароржданага ў сям'ю і грамадства, прынящце яго ў рэлігійную абшчыну, далучэнне дзіцяці да веры дзядоў. Выбіралі куму. Яна прыносіла да хрэсніка пялёнкі, дзіцячае адзенне. Кум і кума вязлі дзіця ў храм. Імя даваў бацюшка. Па прыездзе дамоў – іх сустракала бабка- павітуха ў вывернутым кажусе ( кажух- абярэг). Пачыналася застолле, галоўная страва – бабіна каша. Кум павінен разбіць гаршчок з кашай, а потым таргаваці ёй. На развітанне раз'езд гасцей, павітуху цягалі на баране, карыце.

Такім чынам, сямейныя абрады беларусаў складаюцца з характэрных рытуальных цыклаў, якія адлюстроўваюць спрадвечны уклад жыцця людзей, культуры, быту. І хоць сямейныя абрады вельмі старажытныя па сваім паходжанні, аднак да сёняшніх дзён яны не страцілі мэтавай накіраванасці і прызначэння ў народным жыцці.

## *Тэма 6. Грамадзянскія і дзяржаўныя абрады і рытуалы*

Генезіс дзяржаўных рытуалаў, абрадаў, цырыманіялаў. Фарміраванне сістэмы абрадава-рытуальнага комплексу – класава-палітычнай накіраванасці з XIV стагоддзя, сімвалічнае значэнне яго – мастацка-дэкаратыўнага афармлення. Цырымоніі прысвячэння, інаўгурацыі, іматрыкуляцыі як сучаснае абрадава-рытуальнае формаўтварэнне ў структуры святочнай культуры. Методыка арганізацыі і правядзення абрадава-рытуальных дзей на мемарыяльных комплексах.

*Тэма 7. Рэжысёрская распрацоўка і ўвасабленне абраду як фальклорнага прадстаўленняў закрытым памяшканні*

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця ўвасабляемага абраду, выяўленне генэзісу, яго рытуалаў, язычніцкіх, хрысціянскіх, сведскіх напластаванняў.

Ідэйна тэматычны аналіз. Тэма – жыццёвая з'ява, падзея, адлюстраваная ў абрадзе пры дапамозе розных сродкаў мастацкай выразнасці.

Ідэя – галоўная вядучая думка, якая вызанчае задуму і асноўны змест абраду. Адзінства і ўзаемадзеянне зместу і формы як спосаб аадлюстравання ідэі абраду.

Састаўныя фрагменты абраду. Сцэнарна-рэжысёрскі ход – прыём, які аб'ядноўвае розныя часткі сцэнарыя. Носьбіты сцэнарна-рэжысёрскага ходу.

*Тэма 8. Рэжысёрскі аналіз народнага абраду*

Архітэктоніка абраду як паслядоўнасць і суразмернасць частак, аб'яднаных у адзінае ідэйна-тэматычнае цэлае. Асноўныя элементы кампазіцыйнага вырашэння абраду: пралог, экспазіцыя, завязка, развіццё дзеі, кульмінацыя, развязка, фінал. Пралог – своеасаблівая прадмова, якая падрыхтоўвае ўдзельнікаў абраду да маючай адбыцца ўрачыстасці. Адлюстраванне ў пралогу ў самым агульным выглядзе тэмы абраду, яго ідэі.

Экспазіцыя – уваход у абрадавую дзею. Задачы экспазіцыі: інфармацыя ўдзельнікаў абраду аб будучых дзеяннях і стварэнне атмасферы ўрачыстасці, святочнасці ці, наадварот, журбы (пры абрадзе пахавання).

Завязка – першачя падзея, з якой пачынаецца абрад.

Развіццё дзеі, як лагічная і эмацыянальная падрыхтоўка галоўнай падзеі. Далучэнне ўдзельнікаў да сімвалаў абраду, стварэнне псіхалагічнага настрою, які садзенічае найбольш поўнаму ўспрыманню абраду.

Кульмінацыя – галоўная падзея абраду, найвышэйшы эмацыянальны пункт у развіцці тэмы.

Развязка – эмацыянальна-сэнсавы вынік абраду.

Фінал – завяршаючая частка абраду. Элементы іправізацыі пры правядзенні абраду.

*Тэма 9. Рэжысёрская бачанне абрадавай дзеі.*

Рэжысура абраду як вызначэнне пластычнага, музычнага, каляровага, дэкаратыўнага, прасторавага вырашэння абрадавай дзеі.

Вызначэнне звышзадачы і скразной дзеі. Прасторавае вырашэнне (мізансцэніраванне) эпізодаў абраду. Вывучэнне памераў сцэны альбо пляцоўкі, адведзенай для правядзення абраду, вызначэнне мізансцэнічнага цэнтра будучай абрадавай дзеі, аптымальнага размяшчэння яго ўдзельнікаў. Умоўны падзел пляцоўкі на правую і левую часткі, іх пластыная запоўненасць з ўлікам асаблівасцей успрымання гледачоў (злева направа і зверху ўніз). Падрыхтоўка і змена мізансцэн.

Мастацтва мізансцэны. Мізансцэна – размяшчэнне ўдзельнікаў на сцэне. Гісторыя мізансцэны. Драматург – рэжысёр. Мізансцэна і падзея. Мізансцэна і канфлікт. Тэмпарытм і мізансцэна. Масавая мізансцэна. Віды мізансцэн (франтальныя, дыяганальныя, кругавыя, глыбінныя, люстэркавыя, сіметрычныя, асіметрычныя, вышынныя, спіральныя), іх выразныя магчымасці і недахопы. Віды запісу мізансцэн (літаратурны, нотны, графічны).

Сіметрыя ў сінхронным руху ў ходзе абраду. Улік у рэжысёрская распрацоўцы сцэнарыя характэрнай да дадзенага абраду дынамікі дзеяння ва ўзаемасувязі з іншымі выразнымі сродкамі абраду.

Прасторавае вырашэнне абраду. Зоны дзеяння. Апорныя пункты. Цэнтральны мізансцэнічны пункт.

Мантажны ліст рэжысёра абраду: план аднаўлення ў абрадзе неабходных мізансцэн, адпаведнага ім тэксту і мастацкага афармлення.

Рэжысёрскі сцэнарый абраду – паслядоўнасць эпізодаў, якія адпавядаюць кампаазіцыйнайй структуры. Драматургіі абраду. Эпізод абраду, як сістэмаэлементарных абрадавых дзей, аб’яднаных адной мэтай і маючых адносна самастойнае значэнне.

Нараджэнне свята можа адбывацца па рознаму: з сацыяльнага ці прыватнага  заказу, абумоуленага неабходнасцю адлюстравання падзеі у жыцці грамадства, калектыву, асобы; са з’яуленнем новай аутарскай ідэі, у якой прапануецца святочныя фармаутварэнні або новая рашэнні і творчыя падыходыда ужо існуючых святочных дзеянняу. Алле у любым выпадку на пачатковым этапе перад ініцыятарамі паустае шэраг арганізацыйных пытанняу. Перш за усё гэта стваранні ініцыятыунай  группы з ліку творчых работнікау і заказчыкау( або прадстаунікоу арганізацыі, прадпрыемства, дзе мяркуецца увасобіць прапануемую урачыстасць), якія у дальнейшым будуць займацца распрацоукай, арганізацыяй і правядзеннем свята.

Работа любой ініцыятыунай групы, незалежна ад маштабу увасабляемай дзеі, складаецца з абгрунтавання выбранай тэмы, распрацоукі

агульнай канцэпцыі свята (творчай заяукі), а таксама пастаноукі агульных задач яе рэалізацыі.

Творчая заяука на правядзенне свята раскрывае наступнае :

1. актуальнасць і сацыяльную значнасцьадзначаемай падзеі;
2. мэту і задачу свята;
3. навізну (аба пераемнасць) у творчым адлюстраванні дзеі;
4. праграму, састауныя фрагменты або разгорнуты план ці агульны сцэнарый свята;
5. агульны план або пераліказадач творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фіансавага  за беспячэнне свята.

На аснове творчай заяукі члены ініцыятыунай групы распрацоуваюць палажэнне аб правядзенні свята, умовы яго правядзення, склад аргкамітэта з пералікам галоуных адказных асоб.

Калі святочнае дзеянне праводзіцца у форме фестывалю або у структуры свята ёсць конкурсы поунай накіравальнасці, то у палажэнні павінны знайсці адлюстраванне крытэрыі ацэнак выступлення удзельнікау, а таксама склад журы. У журы неабходна уключаць найбольш аутарытыйных спецыялістау у тым жанры мастацтвау  або відзе народных рамёствау, спорту, конкурсау прафесійнага майстэрства,па якіх праводзіцца спаборніцтва удзелькау, дзеля таго, каб выніковая рашэнне аб пераможцах было максімальна аб’ектыуным і не выклікала спрэчных пытанняу.

Самай цяжкай справай з’яуляецца складанне *<u>каштарыса выдаткаў</u>* на правядзенне свята. У тым выпадку, калі каштарыс складаецца пад *<u>“сцэнарый”</u>*( гэта значыць спачатку вызначаецца усе аспекты фінансавання, што з’яуляецца найлепшым варыянтам), а затым выдзяляюцца сродкі для творчага,вытворчага,матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйнага забеспячэння свята, члены аргкамітэта ў першую чаргу праводзяць арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя, каб можна было задаволіць усе патрэбы падрыхтоукі і правядзення свята. Затым фінансавыя пытанні зводзяць у агульны каштарыс, які зацвярджаецца яго заказчыкамі поунасцю або з папраукамі. У сучасных умовах  з прычыны складанага эканамічнага становішча  дзяржавы такі спосаб складання каштарыса свята ажыццяуляецца рэдка.

Звычайна выдзяляюць сродкі, загадзя распланаваныя Міністэрствам культуры РБ асобнымі сумамі на кожнае канкрэтнае свята, якое мяркуецца увасобіць на працягу фінансавага або каляндарнага года.

Дэталёва распрацаванае палажэнне аб правядзенні свята, члены ініцыятыунай групы падаюць на разгляд адпаведных дзяржауных органау, установ, якія могуць вырашыць пытанні яго правядзення (калегіі розных

міністэрстваў, абласныя, гарадскія  або раённыя выканкамы, упраўленні культуры, грамадскія і прыватныя арганізацыі і інш.).

На спецыяльным пасяджэнні такой дзяржаўнай, грамадскай ці прыватнай установы або арганізацыі абмяркоўваюць прапановы ініцыятыўнай групы, уносяць пэўныя папраўкі і дапаўненні ( калі існуе неабходнасць) і зацвярджаюць палажэнне аб правядзенні свята.

У пісьмовым выглядзе палажэнне аб правядзенні свята даводзіцца да ведама усіх творчых, арганізацыйных, гаспадарчых і іншых структур, якія прыцягваюцца  да правядзення свята.

Такім чынам, рэжысёр сёння выступае не толькі у якасці творца, але і у значнай ступені у ролі арганізатара, эканаміста, адміністратара, які павінен умець суадносіць маштаб творчай задумы з рэаліямі матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых сродкаў, выдзеленых на пастаноўку.

Пры фарміраванні рэжысёрскай задумы, рэжысёру трэба звярнуцца да падзеі, якую адзначае свята, каштоўнасці, якія знаходзяцца у цэнтры гэтага свята, у якім стане гэтыя цэннасці знаходзяцца сёння.

У *структуры творчай задумы* вызначаецца тэма, ідэя – звыш – задача.

*Тэма* – кола пытанняў, праблем, якія падымаюцца у дзеянні свята, сярод якіх выдзяляем  галоўную тэму  г.д. праблему (актыўнае пытанне), якое патрабуе неадкладнага вырашэння.

*Ідэя* – звышзадача – гэта галоўная думка аўтара твора, яго заклік да гледачоў.

У літаратурным творы ідэя і звышзадача могуць не супадаць, то у свяце яны часта аб’ядноўваюцца.

У фарміраванні рэжысёрскай задумы таксама вызначаецца адрас – каму прызначаецца свята (узроставая група, сацыяльная  рознаўзроставая група).

Таксама у фарміраванні рэжысёрнай задумы вызначаецца месца правядзення, яго архітэктурна-ландшафныя асаблівасці, робіцца аналіз месца правядзення свята. Яно павінна адпавядаць шэрагу творчых і тэхнічных патрабаванняў. Выбіраючы размяшчэнне галоўнай пляцоўкі, нават сонца трэба улічваць, нельга каб яно свяціла гледачу у вочы.

Далей у фарміраванні рэжысёрскай задумы вызначаецца форма увасаблення. Для кожнага свята яно выбіраецца асобна. *Існуе формы ўвасаблення:*рэстаўрацыя, рэканструкцыя,трансфармацыя;

Кожная з форм гэтых – *мэтанакіраванае рэчышча,* стваранне абрадавай ідэі, на аснове калектыўнай творчасці яго удзельнікаў.

*1.* *Рэстаўрацыя* –узнаўляць па рысах, якія захаваліся, калі знікла традыцыя правядзення свята, але доўгі час існавала. Рэжысёру трэба

звярнуць вялікую увагу на тлумачэнне гледачу пра свята, пра абрадавыя элементы, пажадана гэта зрабіць у гульнёвай форме.

*2.* *Рэканструкцыя*- аднауленне абрада ці свята на рэштках захаваушаіся традыцыі. Па тэкстах песень можна узнавіць весь абрад.

*3.* *Трансфармацыя* – прыстасаванне традыцыйнага свята, г.д. дзей да сучаснага свята успрыняецца ( дзея павінна быць традыцыйна – нацыянальная па форме і сучасная па зместу). (прыклад) Мядзведзь.

*4.* Свята, якое не мела аналагау у сваёй гісторы і створана на аснове народных традцый,фальклора або новай ідэі.

У працэсе станаулення новай святочнай культуры разам са шматлікімі творчымі

знаходкамі выявіуся іх шэраг тэхналагічных праблем звязаных з матэрыяльна – тэхнічным адміністрацыйным і фінансавым забеспячэннем свята. Любая задума можа быць

рэалізавана толькі тады, калі мае значную эканамічную базу. Рэжысёр выступае не

толькі у якасці творца,але у ролі арганізатара, эканаміста, адміністратара, які павінен умець суадносіць маштаб творчыя задумы з рэаліямі матэрыяльна – тэхнічных і фінансавых сродкау, выдзеленых на пастаноуку.

### *Тэма 10. Работа рэжысёра з мастацком над мастацка-дэкаратыўным вырашэннем абрадавай дзеі*

Выяўленне і дэкаратыўнае мастацтва і яго роля абрадзе. Вызначэнне мастацка-дэкаратыўнай кампазіцыі абраду. Значэнне розных выразных сродкаў і народнай сімволікі для ўспрымання абраду гледачамі, узмацнення яго эмацыянальнага ўздзеяння на чалавека.

Дэкаратыўна-мастацкае афармленне як адлюстраванне зместу абраду, яго галоўнай ідэі.

Вызначэнне сімволікі ў народным абрадзе і яе афармленне. Сімвал як найбольш выразны элемент святочна-абрадавай урачыстасці, клопат аб яго даставернасці, высокай мастоацкай дасканаласці. Сімвалічнае значэнне ў абрадах розных прадметаў (абрадавы хлеб, ручнікі, палаючыя колы, сноп, вянок і інш.), самой абрадавай дзеі, знешняга і ўнутранага ўбрання памяшканняў, воптракі выканаўцаў і ўдзельнікаў абраду.

Прызначэнне абрадавай сімволікі –віклікаць у свядомасці людзей пэўныя асацыяцыі з устойлівымі, звыклымі вобразамі (сноп –сімвал дабрабыту, хлеб-соль – сімвал добрых пачуццяў і намераў да гасцей, вянок – сімвал дзявоцтва і інш.).

Прадметна-рэчавыя сімвалы ў абрадах: натуральныя (бяроза, куст, сноп, пшаніца, каліна, кветкі, зёлкі і т.п.) і штучныя (паходня, канструкцыя кастра, абеліск, ручнік, вянок, вясельныя пярсцёнкі, пудзела зімы, русалкі і інш.). творы мастацтва (карнавальныя маскі, касцюмы, атрыбуты) і прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў якасці абрадавых сімвалаў.

Касцюмы і знакі адрознення выканаўцаў і ўдзельнікаў абраду. Аптымальнае размяшчэнне сімвалаў, эмблем і атрыбутаў абраду. Вызначэнне формы, колеру, канструкцыйных асаблівасцей, тэхналогій і вырабу абрадавай сімволікі, атрыбутыкі і рэквізіту.

*Тэма 11. Работа рэжысёра над шумавым, музычным вырашэннем абрадава-рытуальнай дзеі*

Агульная характарыстыка музыкі ў абрадзе. Фарміраванне эмацыянальнага клімату – галоўная прызначэнне музыкі ў рытуале, абрадзе. Музыка як сімвал у абрадзе.

Разнастайнасць музычнага суправаджэння ў абрадах. Харавыя спевы як форма агучвання абраду. Месца аркестравай музыкі ў абрадах і рытуалах. Ансамблі ў музычным афармленні абраду.

Народныя песні ў абрадах. Улік ідэйна-тэматычнай накіраванасці фальклорных твораў, іх адпаведасці пластычнаму дзеянню.

Музыка і тэмпарытм абраду. Уздзеянне музыкі на фарміраванне ўласціувага абраду эмацыянальнага тэмпарытму. Роля музыкі ў паўзах паміж абрадавымі дзеяннямі.

Значэнне музыкі як сімвала ў абрадзе. Выкананне абрадавай музыкай функцый пабуджальнага сродку да пэўных дзеянняў і перажыванняў. Песня як гукавы сімвал абраду.

Моўная частка абраду – праграма для падбору музычнага суправаджэння. Узаемаўплывы музыкі і слова пры стварэнні эмацыянальнага настрою ў час правядзення абраду. Адзінства слова, музыкі і абрадавага дзеяння. Эмацыянальная дамінанта як пераважаючае пачуццё, створанае ў працэссе суменага ўплыву абрадавага дзеяння, музыкі і слова.

*1.Работа рэжысера над музыкальна – шумавым вырашэннем святочных дзей.*

Музыка з'яўляеца адным з мацнейшых сродкаў эмацыянальнага ўздзеяння на чалавеека. Яна з'яўляецца часткай мастацкага вобраза свята. Таму рэжысер павінен падыйсці да гэтай справы вельмі адказна , каб праз музыку раскрыць ідэйны змест свята. Уводзячы музыку ў дзейства , рэжысер павінен улічваць , што ў кожным выпадку неабходна свая падоўжанасць гучання, пры якой гледач не толькі пачуе яе, але і ўспрыйме эмацыянальна.

Не трэба марнатравіць музыкай скарыстоўваць яе ў кожным моманце дзейства. Рэжысер вызначае эпізоды свята , у якіх плануецца жывое гучанне і эпізодаў, у якіх неабходна запіс фанаграм. Для эпізодаў , якія патрабуюць фанаграмы згодна па сцэнарыю адбываеца яго мантаж. У працэсе работы музыкі рэжысер павінен звярнуцца да розных крыніц . Гэта грампласцінкі, пленкі, на якіх музыка запісана ў розных скарасцях і рознай якасці. Каб зручней было працаваць з рознымі матэрыяламі, перш-наперш трэба перапісаць іх на адзіны дыск, у патрэбнай паслядоўнасці.

У працэсе репетыцый фарміруецца план музычнага афармлення. У далейшым усе гэта лажыцца ў аснову музычна – шумавой партытуры. У ей знаходзяць адлюстраваны наступнымі момантамі:

1. Нумар па парадку
2. Нумар магнітафона (гукаўзнаўлення)
3. Назва эпізода свята
4. Назва музычнага фрагмента
5. Падоўжанасць гучання
6. Рэпліка ці дзеянне на ўключэнне гука
7. Гукавы план узнаўлення (характар гучання фанаграм)
8. Узровень гучання
9. Рэпліка на выключэнне
10. Гукавы план вывядзення гука ці выключэння
11. Заўвагі

Этапы работы рэжысера над музыкальна – шумавым вырашэннем святочных дзей.

1. Вывучэнне сцэнарыя
2. Вызначэнне музыкальнага вобраза
3. Выпіска музыкальных нумароў
4. Вызначэнне прынцыпа музыкальнага афармлення
5. Вызначэнне прынцыпа гукаўзмацнення свята
6. Работа з кампазітарам па напісанню песень
7. Запіс, перазаіс і мантаж фанаграм свята
8. Методыка матэрыяльна – тэхнічнага гукаўзмацнення (арэнда, пракат і набыцце апаратуры)
9. Работа гукарэжысера з гукааператарам у працэсе рэпетыцый і на свяце

90 % поспеху усяго свята залежыць ад музыкі. Лейтматыў – чырвоная стужка , асноўая тэма гучання ў кульмінацыйным моманце свята. Каб пазбегнуць непрыемнасцей пры рабоце з музычным афармленнем трэба мець у калектыве гукарэжысера. Добрае выданне гукарэжысерам музычна –

шумавой партэтуры і сцэнарыя – неабходная ўмова творчага гукавога суправаджэння.

*Тэма 12. Работа рэжысёра над словам і мовай у абрадавай дзеі.*

Функцыі слова ў абрадзе. Славесныя кампаненты абраду: тэксты віншаванняў, урачыстыя запаветы, наказы, абяцанні, замовы, словы абрадавых песень, прысягі.

Узаемасувязь слова і мовы з сімволікай і абрадавымі дзеяннямі. Маналагічная і дыялагічная, загаддзя падрыхтаваная і імправізацыйная мова ў абрадзе. Асаблівасці абрадавай мовы: сцісласць і дакладнасць, яснасць і эмацыянальнасць. Прыёмы дасягнення ўмоўнай выразнасці: рытм і інтанацыйны строй.

Класіфікацыя абрадавых прамоў па прызначэнні: урачыста-афіцыйная, прывітальная, віншавальная, развітальная, памінальная.

Выражэнне павагі да ўдзельнікаў абраду (гаспадароў, юбіляраў, ганаровых гасцей і нш.) з дапамогай прывітальнай прамовы. Прамова – паказ і адлюстраванне ў ёй пажаданняў удзельнікам абраду паспяховага завяршэння грамадскіх і асабістых спраў. Віншавальная мова, яе роля і значэнне пры ўшанаванні асобных людзей у сувязі з пэўнымі падзеямі, якія адзначае абрад.

Развітальная прамова – частка абраду пахавання, у якой даецца ацэнка заслуг нябожчыка. Накіраванасць памінальнай прамовы на замацаванне добрай памяці аб тых хто закончыў жыццёвы шлях. Значэнне памінальнай прамовы ўдзельнікамі абраду існага сэнсу жыцця і чалавечай каштоўнасці.

Тэхніка мовы ў абрадзе: лагічная стройнасць, інтанацыйнае багацце і гучанне голасу, захаванне нормаў літаратурнага вымаўлення (арфаэпія), дакладнасць вымаўлення гукаў (дыкцыя).

Логіка абрадавай мовы. Моўны такт. Недапушчальнасць манатоннасці ў абрадавай мове. Сэнсавае і мастацка-эстэтынае значэнне інтанацыі ў вуснай мове. Дыханне і яго тыпы ў час маўлення ў абрадзе.

Работа рэжысёра над словам.

Работа рэжысёра над словам уключае ў сябе веданне і асэнсаванне ролі і функцый слова ў свяце. Слова ў свяце з’яўляецца адным з галоўных выразных сродкаў , якое ажыццяўляе match рознастайныя функцыі: эмацыянальную, гістарычную, пазнаваўчую і інш.

Выбар і выкарыстанне слова ў свяце будзе залежыць ад тэматыкі і ідэйнай накіраванасці свята, уліку ўзроставай аўдыторыі, стылістыкі самога сцэнарыя.

У творчай працы над тэкстам вялікае значэнне мае фантазія:

- дапамагае выканаўцу “дамалёўваць” характары, з’явы, падзеі, якія аўтар толькі намеціў скупымі рысамі;

- дапамагае “дамаляваць”, у якой ролі дзейнічае герой.

Вобразныя ўяўленні – фундамент пачатковай працы над тэкстам. Калі выканаўца навучыцца ўяўляць тое, пра што расказвае, ён як бы ператвараецца ў сведку апісаных з’яў і падзей.

Аналізіруя тэксты, выканаўца выпрацоўвае ўменне карыстацца і такім сродкам вуснай мовы, як падтэкст.

Падтэкст (Станіслаўскі) – не яўнае, але ўнутрана адчувальнае жыццё чалавечага духу ролі, якое няспынна цячэ пад словамі апраўдваючы і ажыццяўляючы іх.

Функцыі слова ў абрадзе.

Славесныя кампаненты абраду: тэксты віншаванняў, урачыстыя запаветы, наказы, абяцанні, замовы, словы абрадавых песень, прысягі. Узаемасувязь слова і мовы з сімволікай і абрадавымі дзеяннямі.

Маналагічная і дыялагічная, загадзя падрыхтаваная і імправізацыйная мова ў абрадзе. Асаблівасці абрадавай мовы: сціслаць і дакладнасць, яснасць і эмацыянальнасць. Прыёмы дасягнення моўнай выразнасці: рытм і інтанацыйны строй.

Класіфікацыя абрадавых прамоў па прызначэнні: урачыста-афіцыйная, прывітальная, віншавальная, развітальная, памінальная.

Выражэнне павагі да ўдзельнікаў абраду (гаспадароў, юбіляраў і інш.) з дапамогай прывітальнай прамовы. Прамова – паказ і адлюстраванне ў ёй пажаданняў удзельнікам абраду паспяховага завяршэння грамадскіх і асабістых спраў. Віншавальная мова, яе роля і значэнне пры ўшанаванні асобных людзей у сувязі з пэўнымі падзеямі, якія адзначае абрад. Развітальная прамова – частка абраду пахавання, у якой даецца ацэнка заслуг нябожчыка. Накіраванасць памінальнай прамовы на замацавнне добрай памяці аб тым, хто закончыў жыццёвы шлях.

Тэхніка мовы ў абрадзе: лагічная стройнасць, інтанацыйнае багацце і гучанне голасу, захаванне норм літаратурнага вымаўлення (арфаэпія), дакладнасць вымаўлення гукаў (дыкцыя).

Логіка абрадавай мовы. Моўны такт. Недапушчанасць манатоннасці ў абрадавай мове. Сэнсавае і мастацка-эстэтычнае значэнне інтанацыі ў вуснай мове. Дыханне і яго тыпы ў час маўлення ў абрадзе. Работа з гукаузмацняльнай апаратурай.

Для дальнейшага развіцця нацыянальнай святочнай культуры вялікае значэнне мае пільная ўвага рэжысёра-пастаноўшчыка да слова, яго вытокай і гісторыі развіцця.

Рэжысёру народнага свята неабходна ўважліва прааналізаваць, глыбока асэнсаваць традыцыйныя абрадава-рытуальныя і гульнёвыя дзеянні. І ў зележнасці ад задумы рэжысёра ці захаваць іх у існуючым выглядзе, альбо трансфарміраваць і прыстасаваць іх змест да сучасных умоў.

## *Тэма 13. Пастановачная работа па ўвасабленні абрадавага прадстаўлення*

Застольны перыяд рэпетыцый (актуальнасць і сацыяльная значнасць абраду, яго тэма і ідэя, чытка літаратурнага сцэнарыя, размеркаванне роляў, рэжысёрская характарыстыка кожнага персанажа, вызначэнне скразной дзеі, вызначэнне канфліктнай асновы, чытанне сцэнарыя па ролях, раскрыццё ўнутраных маналогаў. Планіровачныя рэпетыцыі (рэпетыцыі ў “выгарадках”) – прадметна-рэчавых асяроддзі, пошук выразных мізансцэн, дзейны аналіз абраду).

Мантажныя рэпетыцыі (удакладненне мастацка-дэкаратыўнага, светлавога, гукавога афармлення дзеі на пляцоўцы). Прагонныя рэпетыцыі (аб’яднанне асобных эпізодаў абраду ў адзінае сцэнічнае дзеянне, карэкціроўка мізансцэнічнага малюнка, мастацка-дэкаратыўнага і музычнага вырашэння). Генеральныя рэпетыцыі – завяршальны этап работы над увасабленнем абраду.

*1. Арганізацыйна-рэпетыцыйны працэс святочных дзей: застольныперыяд, планіровачныя, мантажныя, прагонныя, зводныя, генеральныя рэпетыцыі.*

Пры ўвасабленні літаратурнага твора рэпетыцыйны працэс складаецца з наступных этапаў: застольныя рэпетыцыі; планіровачныя, або рэпетыцыі ў выгарадках; тэхнічныя рэпетыцыі; прагонныя рэпетыцыі, генеральная рэпетыцыя і ёсць яшчэ каррэктыровачная рэпетыцыя.

Застольныя рэпетыцыі - гэта працэс аналітычнага разбору пьесы (або сцэнарыя) і роляў і распрацоўка сістэмы вобразаў. Пачынаецца застольны перыяд з першай чыткі п'есы, прадстаўлення, свята і расказа галоўнага рэжысёра аб агульных мастацкіх прыёмах будучай дзеі, цікавых момантах, мізансцэнах, музычным і пластычным вырашэннях. Затым літаратурны твор раздаецца па ролях і пачынаецца аналітычная работа над творам. Кожны персанаж працуе з рэжысёрам. Тут высвятляюцца адносіны персанажа да канфлікта п'есы, падзей. Затым высвятляюцца адносіны персанажа да іншых персанажаў у эмацыянальным пачуцці. Затым рэжысёр піша аўтарскае дасье на персанажа такога зместу:

| Аўтар аб персанажы | Пераснаж аб самім сабе | Другія аб ім |
|---|---|---|
| | | |

Вывад гэтай працы - рэжысёрская характарыстыка вобраза (які персанаж і як сябе вядзе) і на аснове гэтага высвятляецца зерне вобраза: 1. эмацыянальны стрыжань з якога выходзяць ўчынкі дзеючай асобы (зерне - галоўная рыса характара персанажа); 2. вызначэнне - зерне - гэта сукупнасць знешніх і ўнутранніх якасцей персанажа і вызначаецца гэта сукупнасць пажывёльнаму свету (змяя, мядзведзь, вожык, воўк, ліса і г. д.). Працягваецца застольны перыяд чыткай.

Планіровачныя, або рэпетыцыі ў выгарадках (дэталях, якія замяшчаюць сапраўдныя дэкарацыі) - гэта рэпетыцыі, дзе адбываецца знаходжанне мізансцэн, то есць планіровачнае і прасторавае вырашэнне дзеяння. А на сваце - выразны пластычны ход, малюнак свята і поўны дыктат рэжысёра над выканаўцамі. Тэхнічныя (мантажныя рэпетыцыі) – асобныя рэпетыцыі з тэхнічнымі рабочымі (электрыкамі, гукарэжысёрамі, мантажнікамі і г. д.). Усе знаходзяць палажэнні патрэбныя ім і фіксуюць іх у сваіх партытурах (гука, святла, тэхнічных перастановак). Далей ідзе зводная рэпетыцыя – дзе зводзяцца разам тэхнічная і акцёрская група і высвятляюцца ўсе недахопы. Прагонныя рэпетыцыі – рэпетыцыі ўсёй дзеі без перапынкаў, а рэжысёр запісвае заўвагі і пасля прагону іх раздае. Генеральная рэпетыцыя – сюды запрашаюць сяброў, знаёмых, прымаючае начальства, ідзе прасмотр, а затым начальства запрвашае рэжысёра для сваіх заўваг. Затым карэктыровачная рэпетыцыя з улікам заўваг начальства. І наканец прэм’ера!

### *Тэма 14. Асаблівасці рэжысуры народнага абраду як фальклорнага прадстаўлення на вольным паветры*

Знаёмства з народнымі традыцыямі творчай арганізацыі абрадаў на вольным паветры, markрознымі прыёмамі актывізацыі ўдзельнікаў, мастацка-вобразным вырашэннем дзействаў, спецыфікай пластычнай культуры. Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абраду каляндарнага цыкла на аснове вывучэння этнаграфічных і літаратурных крыніц, аналізу сцэнарнага фонду па вызначанай тэматыцы і трансфармацыі абрадава-рытуальных дзеянняў у розных плынях традыцыйнай культуры. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка абраду на вольным паветры з улікам агульнанацыянальных, рэгіянальных і мясцовых традыцый яго вобразна-сімвалічнага, музычнага і пластычнага ўвасаблення. Цыкл рэжысёрска-пастановачных і арганізацый-ных работ па падрыхтоўцы і правядзенні абраду на вольным паветры.

*Тэма 15. Народныя традыцыі творчай арганізацыі абрадавай дзеі на вольным паветры*

Мастацка-гістарычны вопыт народа як сістэма адбору лаканічна-выразных сродкаў і формаў творчай арганізацыі абраду, замацаваных у традыцыі.

Папярэднія зборы моладзі на рэпетыцыі абрадавых дзей, фарміраванне абрадавых гуртоў, згодна ўзроставай дыферэнцыяцыі, падзел зон дзеяння кожнага абрадавага калектыву (Каляды, Вялікдзень), падрыхтоўка абрадавых касцюмаў, масак і лялек, рэквізіту, буфаторыі, а таксама збор паліва і падрыхтоўка ваза для яго транспарціроўкі (Купалле) як традыцыйна склаўшаяся дзея інфармацыйнага і творчага характару па стварэнні перадсвяточнай атмасферы.

Шэсце ўдзельнікаў абраду па вёсцы як спосаб актывізацыі гледачоў, далучэнне іх да ўдзелу ў абрадзе, інфармацыя аб пачатку абрадавай дзеі. Шэсце як тэатралізаваная форма стварэння перадсвяточнай атмасферы. Выразныя сродкі  і асаблівасці featureлізаваных вулічных шэсцяў у абрадавых святах (зорны выхад калядных груп у Давыд-Гарадку, ланцужковы карагод – ручаіна “Загуканне вясны” ў Светлагорскім раёне, адналінейны карагод-шэсце на Юр’е, Вялікдзень і Сёмуху, шэсце на Купалле з дзяленнем на рознаўзроставыя групы, а таксама з выкарыстаннем дэталей мастацкага афармлення (палаючыя паходні, высахшыя бярозкі, якія засталіся пасля Сёмухі), ланцужковае шэсце са снапом на Зажынках, снапом і вянком на Дажынках, лупком з зернем – на Багач).

Мастацка-дэкаратыўнае афармленне месца дзеяння і вызначэнне цэнтралізаванага мізансцэнічнага пункту абраду (усталёўка слупа з колам і рытуальнае ўпрыгожванне дуба ў абрадах завяршэння Каляд на Міншчыне, пабудова ледзяной горкі і снежных фігур на Маленіцу, бярозкі ў Сёмушных абрадах кумлення і развівання вянкоў, пабудова featureлізаваных канструкцый вогнішчаў пад час святкавання Гукання вясны, Вялікадня, Юр’я, Купалля, завіванне верхавін дзвюх бярозак у вянок на парэдадні Сёмухі, выраб дажыначнага снапа і рытуальныя дзеі з ім, пабудова элементаў аказіянальнай архітэктуры на Кірмашах і інш.)

*Тэма 16. Вобразнасць у мастацка-дэкаратыўным вырашэннітрадыцыйных абрадавых дзей*

Традыцыйнае прасторавае вырашэнне абраду на вольным паветры з абавязковым падзелам тэрыторыі абрадавага дзеяння на дзве зоны: вёска (хата, падворак, вуліца) і вясковае наваколле (поле, луг, лес, рэчка).

Спецыфіка выразных сродкаў мастацка-дэкаратыўнага вырашэння абраду на адкрытай прасторы.

Работа рэжысёра з мастаком па стварэнню мастацка-дэкаратыўнага вырашэня свята- абрада.

Спачатку рэжысёр тлумача мастаку звышзадачу свята, абавязкова чытаецца аналізіруецца сцэнарый, а таксама рэжысёр з мастаком абавязкова азнакамліваюца з ландшафтам архітэктурнымі асаблівасцямі месца дзеяння свята ці абрада.Рэжысер - пастаноўшчык разам з мастаком павінны вызначыць мастацка - дэкаратыўны вобраз (аўтарскую ідэю, увасобленую архітэктурна - дэкаратыўным ці мастацка - дэкаратыўным вырашэнні) павінны распрацаваць: агульны план дэкаравання свята (горада, вескі , дзе знаходзяцца расцяжкі , салютныя устаноўкі, ілюмінацыя, сцягавыя букеты г.д).

-генеральны план тэрыторы свята памятных тэрыторый;

-назву, тэму, мэту, задачы свята;

-месца свята

-час свята

-каларыстыку свята

-эмблему свята

Мастак павінен зрабіць эскізную распрацоўку асобных комплексаў (пляцовак, канцэртных праграм) разам з рэжысерам прыдумаць рэкламна - інфармацыйны матэрыял свята.

*Тэма 17. Спецыфіка пластычнай культуры ў абрадавай дзеі на вольным паветры*

Традыцыйная вобразная сімволіка ў пластычным вырашэнні абраду. Рухі і жэсты ў абрадах на вольным паветры. Віды запрашальных жэстаў у абрадзе: малы, сярэдні і вялікі. Тэхніка руху з абрадавымі атрыбутамі. Спецыфіка пластычнай культуры ў абрадзе пахавання. Тэхніка руху з паходнямі.

Асаблівасці руху з ішмымі абрадавымі сімваламі (хлеб-соль, каравай. ручнік і інш.) Удасканальванне пластыкі традыцыйных і новых абрадаў як важны фактар павышэння іх ідэйна-мастацкага і эстэтычнага ўзроўню.

Прыёмы актывізацыі пасіўных удзельнікаў абраду. Роля выканаўцаў абраду ў актывізацыі гледачоў.

1. *<u>Прасторавае вырашэнне свята.</u>*

Разгледаючы прасторавае вырашэнне свята рэжысер і мастак перш за усе вызначаюць галоуныя мезансценічныя пункты свята. Галоуны

мезансцэнічны пункт – гэта месца, дзе будуць развівацца вузлавыя мезансцены свята (завязка, кульмінацыя, фінал). Таксама дадатковыя месцы, дзе будуць развівацца эпізыядычныя дзеянні. Уся тэрыторя свята у прасторы падзеляецца на зоны дзеяння (спартыуная пляцойка, гульневая пляцоука, абрядава-рытуальная пляцоуеа,дзіцячая пляцоука, кірмаш і інш.) Рэжысер і мастак выязджаюць на месца зон дзеяння і вырашаюць, вызначаюць архитектурна-дэкаратыунае размяшчэнне. Улічваюць ландшафтныя і архітэктурныя асаблівасці. Добра кагда мастак фатаграфуе месца дзеяння – складаецца карта-план размяшчэння зон дзеяння.

Карта-план гэта – галоуны і асноуны дакумент па прастораваму размяшчэнню усіх дэкарацый, канструкцыйных і дзеючых элементау свята, схематычна вычэрчваючы архітэктурныя і ландшавтныя асаблівасці месца дзеяння. На гэтую карту-план арыентуюцца і спасылаюцца у сваей рабоце супрацоунікі усіх структурных падраздзяленняу арганізацыйнага камітэта па правядзенню свята.

План зацвяржаецца галоуным рэжысерам, старшыней аргкамітэта, пажарна –тэхнічнай камісіяй.

Пасля стварэння карты-плана свята – мастак робіць эскізы усей прадукцыі дэкаратыунага афармлення. На аснове гэтых эскізау выраблюяюцца чарцяжы рабочага праекта па якім вядуцца будауніцтва буйных аб*емау і выраб малых формау мастацка-дэкаратыунага афармлення.

Далей этап работы – гэта кампаноука і праверка размяшчэння дэкарацый на сцэнічных пляцоуках.

Работа над планам сцэны здзейсняецца з улікам размяшчэння апорных пунктау дзеяння, месцау у якіх найбольш актыуна будуць іграць артысты.

Пры планіроуцы важна не толькі з дакладнасцю вызначыць усе памеры і месцы размяшчэння дэкарацый, але і магчымасць правільнага размяшчэння дапаможных устройствау(рабочых станкоу, лесніц і інш.)

Да работы над планам карыстна далучыць мастака па святлу, які разглядвае планіроуку з пазіцыі асвятлення дадзенай дзеі. Яго пажаданні часам патрабуюць частковых змен у кампазіцыі.

Калі дзеянне адбываецца у вячэрні час план сцэны павінен абавязкова уключаць месцы размяшчэння светлавой апаратуры и сістэмы падключэння.

Пры наяунасці перад сцэнічнай пляцоукай глядацкіх месцау у чарцяжы неабходна адзначыць крайнія месцы першага рада пры дапамозе якіх вызначаюць бачнасць дэкарацый з боку глядачоу.

*Тэма 18. Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абрадавай дзеі*

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця абраду на аснове вывучэння літаратурных, этнаграфічных і першакрыніц. Аналіз сцэнарнага фонду па вызначанай тэматыцы. Раскрыццё агульнанацыянальных фрагментаў і рэгіянальна-лакальных асаблівасцей абраду. Аналіз трансфармацыі абрадава-рытуальных дзей на розных стадыяльных этапах развіцця традыцыйнай культуры (вызначэнне язычніцкай асновы, хрысціянскіх і свецкіх напластаванняў).

Пачынаецца з глубокага вывучэння агульнанацыянальных элементау, якія есць у мясцовасці генезіса абрада, этымалогіі назвы і тэндэнцыі яго гістарычнага развіцця. Пры гэтым аналізе неабходна улічываць першасную гаспадарчую практычную аснову свята, а затым яго языцніцкія, хрысціянскія і савецкія напластаванні. Пры гісторыка-рэтраспектыуным аналізе неабходна раскрыць агульна-нацыянальны від абраду, уплыу на яго структуру з боку іншых культур, а так сама высвейтліць рэгіянальныя, тэрытаріяльныя месцы правядзення абраду. Робячы распрацоуку любога абрада с пачатку трэба звярнуць увагу на літаратурныя крыніцы фальклорнага і этнаграфічнага характару 19 ст., улічваючы тое, што у сучасны час праблемай №1 з'яуляецца аднауленне рэгіянальнага фальклора, то пры працы з літаратурай трэба звяртаць увагу на мясцовыя традыцыі. У гэтым накірунку патрэбна рабіць наступныя работы :

1)Паставіць мэту, вызначыць для сябе, якая гэта будзе форма увасаблення: рэстаурацыя, рэканструкцыя ці трансфармацыя; у якім месцы будзе адбывацца свята (у музеі, у закрытым памяшканні, на плошчы і.т.д.)

2) З серыі БНТ выпісаць па выбранаму абраду песні, прыпеукі, казкі, лічылкі і г.д., рытуалы, звычаі, якія вызначаны навукоуцамі са сваей мясцовасці.

3) Правесці фальклорна-этнаграфічнае апытванне носьбітау фальклору гэтай мясцовасці у старэых жыхароу, якія яшчэ памятаюць традыцыі

4) Прагледзіць гэты абрад у выкананні некалькіх калектывау і зрабіць аналіз сваіхназіранняу.

5) З мясцовых газет, літаратурных зборнікау, часопісау трэба выпісаць літаратурныя і музычныя творы сучасных аутарау пра гэта свята.

Такім чынам прааналізаваушы гісторыю станаулення абрада і яго сучасны стан; выпісаушы з літ-ных крыніц усе, што тычыцца вашага рэгіена па святу (абраду) мы маем поуную карціну традыцый яго развіцця у выбранай мясцовасці. Гэта дае нам магцымасць і навукова-абгрунтаваную падставу для работы над сцэнарыем абраду.

Распрацоука сцэнарыя народнага свята (абраду) уключае у сабе:

1) Высветліць, што будзе адбывацца: тыповае абрадавае, масавае ці сцэнарнае дзеянне.

2) Выявіць тое кананізаванае драматычнае русла, у рамках якога развіваецца народная традыцыя: вызначыць тэму, ідэю, структуру абрада, сцэнарна-рэжысерскі ход і кампазіцыйную пабудову, увасобіць гэта у літаратурнай аснове. Прыступаючы да распрацлукі рэжысер павінен высветліць: звышзадачу і скразное дзеянне, выявіць мастацкі вобраз у мастацка-дэкаратыуным вырашэнні, музычным і пластычным. Падзяліць на эпізоды і вызнацыць задачы выканаўцау, распрацаваць мізансцэны. Вызначыць прыемы актывізацыі гледачоу, звярнуць увагу на тлумачэнне вядучымі семантыкі і сімволікі.

Пры рабоце з выканаўцамі у застольны перыяд трэба:

А) дакладнае веданне усімі удзельнікамі семантыкі абрадавых дзей.

Б) выпрацоука народнага манеру спеваў.

В) Мізансцэніраванне абраду згодна народных традыцый.

Г) Ппадтэкста другога плана і маналога (вызначаны згодна свята)

3)Занатаваць кампазіцыйную пабудову свята, якая была раней у гэтай мясцовасці, мясцовыя стравы, народныя гульні і забавы. Пры правядзенні (увасабленні) свята для народау сусвету – трэба улічваць традыцыі іншых народау, калі свята адбываецца у горадзе – трэба улічваць гарадскія традыцыі.

Толькі пры гэтых умовах народнае свята адначасова застанецца першародным і той жа час набудзе новыя фарбы, стане сродкамі захавання рэгіянальнай, святочнай традыцыі.

*2.Абрадава - святочныя стравы беларусаў.*

Кожны народ мае сваю гістарычна вызначаную кухню, якая характарызуецца пэўным наборам прадуктаў страў, спосабам іх прыгатавання ужывання, этнічным сімволіка - абрадавым функцыям .

Па сваіх характарыстіках ежу можна падзяліць на раслінную нераслінную, посную і скаромную. Даноснай адносіліся ўсе стравы расліннага паходжання, а таксама рыба рыбныя прадукты. У пасныя дні з рацыёна харчавання выключаліся тлустыя мясныя прадукты, смятана, малако.

Пасты заканчваліся святочнымі днямі. Найбольш багатым быў стол на Вялікдзень, Радаўніцу, Сёмуху, Спас, Дзяды, Новы год.

Асартымент абрадава-святочных стра , як мы знаходз м на стале беларускага насельн цтва, бы давол шырок м разнастайным прыкметна вар'ірава ў залежнасці ад прыродных умоў народнага календара з зона года.Шырока вядомым абрадава-святочным стравамі ў беларусаў былі

мучныя вырабы ў выглядзе вадкіх па вадкіх страў. З рознай мукі (грэцкай, пшанічнай,радзей жытняй, ячнай) з дабаўкай яек гатавалі клёцкі (галушкі, галкі), якія варылі падсоленай вадзе. Апрача звычайных гатавалі клёцкі "з вушкамі", у якія загортвалі кавалачкі сырога сала. У дамах беларускай шляхты у клёцкі дабаўлялі сыр, мак, цыбулю. З канца XIX ст. клёцкі ўсё частей гатавалі з дранай бульбы. Клёцкі падавалі звычайна ў выглядзе ваткай малочнай стравы або падсмажвалі на сале з дабауленем смятаны. Яны ўжываліся як абрадавая страва (у пам нальныя дні).

Не менш распаўсюджанай мучной стравай была зацірка. Пасля прыгатаваня зацірку запраўлял маслам, салам або залівалі малаком.

Блізкая тэхналогія адзначалася прыгатаванні макаронаў. У сялянскім асяроддзі гэта страва лічылася прысмакам, ёй любілі ласавацца дзеці.

Шырока вядомай абрадава-святочнай стравай беларусаў быў кулеш.

Яго рабілі з грэцкай ці пшанічнай мукі. Фактычна гэта была самастойная посная страва, якую называлі брускамі.

З аўсянай мукі або вотруб'яў рабілі кісель. З жытняй мукі гатавалі саладуху кулагу. З'яўляючыся вегетарыянскай стравай, саладуха была галоўнай стравай у перыяд Каляднага Вялікага пастоў. Яе звычайна елі з адваранай бульбай.

З крупяных вырабаў найбольш распаўсюджаным былі кашы з грэцкіх, ячных пшанічных круп. Кашу з пшанічных круп гатавалі ў дні нараджэння, на пахаванне, памінальныя дні. Ячную кашу гатавал на Каляды.

Да канца XIX ст. прыкметна пашыраўся асартымент бульбяных страў. Як правіла, па вялікіх святах (Вялікдзень, Сёмуха, Ражство інш.) яны выключаліся з рацыёну харчаваня.

Гародніну ўжывалі свежай, нарыхтовалі пра запас. Сечаную капусту квасілі ў бочках. Малако, малочныя прадукты абрадава-святочнай харчавані беларусаў шырока выкарыстоўваўся як натуральным выглядзе так і ў якасц састаўных кампанентаў (смятана, тварог, клінковы сыр).

Мяса, мясныя прадукты ужываліся ў ежу частей за ўсё ў складзе іншых страў. Абрадава-святочная мясная страва - верашчака (прыжаніна, мачанка). У беларускіх сялян быў больш распаўсюджаны халадзец з свіных ног. У посныя дні мясныя прадукты на сялянскім стале заманяла рыба.

Немалаважнае значэнне у харчавані беларусаў мелі напіткі. Адным з найбольш распаўсюджаных старажытных напіткаў быў хлебны квас.

Ранняй вясной нарыхтоўвалі бярозавы, кляновы сок . Сок, напіткі атрымлівалі таксама з лясных ягад, яблык ,груш , рабіны.

Пчаляры выраблялі мядовы квас - медушу . На святы практыкавалі выраб піва.

*Тэма 19. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка абрадавай дзеі*

Стылізацыя народнага абраду. Паняцці “рэстаўрацыя”, “рэканструкцыя ", "трансфармацыя”. Распрацоўка сцэнарыя народнага абраду на аснове глыбокага вывучэння агульнанацыянальных, рэгіянальных і мясцовых традыцый яго ўвасаблення.

Мастацкі вобраз абрадавага прадстаўлення ў мастацка-дэкаратыўным і музычным увасабленні. Сцэнарна-рэжысёрскі ход і яго носьбіты. Прасторавае вырашэнне народнага абраду. Пошук вобразных, яскравых мізансцэн, якія адлюстроўваюць ідэйна-тэматычную накіраванасць абраду пры захаванні натуральнай, традыцыйнай формы паводзін удзельнікаў. Распрацоўка сістэмы вобразаў абраду (рэжысёрская характарыстыка персанажаў, “зерне” вобразаў, яго адносіны да падзей, што адбываюцца, і да астатніх персанажаў).

У сцэнарна – рэжысёрскую распрацоуку ўваходзяць наступныя этапы.

Рэжысёр павінен:

1. Вызначыць тэму, ідэю і падзею, якую вызначае свята .

2. Сбор матэрыяла па тэме. Пачынаецца з глыбокага вывучэння гінэзіса свята: этымалогіі назвы і тэндэнцыі яго гістарычнага развіцця. Пры гэтым аналізе неабходна улічыць першасную, гаспадарчую практычную аснову свята, а затым яго язычніцкія, хрысціянскія і свецкія напластаванні.

3. Наступным этапам сцэнарна – рэжысёрскай распрацоукі свята, з’яуляецца сцэнарны план свята, у якім рэжысёр вызначае усе дзеі будучага свята.

4. Рэжысёр кампазыцыйна будуе свята. Яно складаецца з экспазіцыі, пачатка дзеі (завязка), развіцця дзеі (монадзеі – калі свята адбываецца у вёсцы, сяле, альбо полідзеі – свята у вялікім горадзе),кульмінацыі – найвышэйшага пункту накала дзеі. Кульмінацыя у свяце можа перастаць у фінал.

5. Сцэнарна – рэжысёрскі ход. Гэта прём, які аб’ядндае разрозненыя часткі сцэнарыя у адзінае драматургічнае цэлае. Ён мае унутраную і знешнюю праявы. Унутраная – гэта выяуленне сутнасці хода, выяуленне прыёма з’яднанне дзі. Знешняя – гэта адлюстраванне візуальнага боку.

6. Вызначэнне жанру свята.

7. У сцэнарна – рэжысёрскай распрацоуцы свята рэжысёр вызначае асноуныя эпізоды свята.

8. Затым вызначае мастацкі вобраз. Гэта аутарская ідэя увасаблення у архітэктурным, мастацка – дэкаратыуным, музычным і пластычным вырашэннях. Спачатку павінны даць вобразу агульную назву, якая раскрывае

ідэю свята. Затым вызначыць прасторавае і дэкаратыунае вырашэнне свята, музычны вобраз – мелодыя  лейтматыу. Яна адлюстроувае ідэю. Пластычнае вырашэнне – гэта абрады, рытуалы і іншыя гульнёвыя дзеі, якія раскрываюць ідэю свята.

9. Наступны этап – пішацца літаратурнысцэнарый свята.

10. Пасля распрацоуваецца  творчае і матэрыяльна – тэхнічнае забеспячэнне.

11. Каштарыс.

На двух апошніх этапах сцэнарый разглядаецца з розных пазіцый і ва узмасувязі, што дазваляе скласці дакладную карціну мер, якія неабходна прыняць для таго, каб адбылося свята.

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### Тэматыка і метадычныя ўказанні да практычных заняткаў

*Зімовыя каляндарныя святы. Традыцыйныя зімовыя гульні і ігрышчы*

Першая каляндарнае свята года – Каляды. Карнавальная традыцыя святкавання. Маскі і пераапрананні галоўных выканаўцаў калядоўшчыкаў, выканаўцаў абрадоў "Шчадраванне", "Засеўкі". Калядныя гульні ў закрытым памяшканні "Жаніцьба Цярэшкі", "Жаніцьба Бахара", "Яшчар", "Халімон".

Калядныя ігрышчы на вольным паветры "Цягнуць Каляду на дуба", "Конікі", "Кола", "Була" і інш. Рэквізіт, бутафорыя, рэквізіт.

*Веснавыя каляндарныя святы. Гульнёвыя забавы дзяцей і моладзі веснавога перыяду*

Веснавыя святы беларускага народнага календара. Гульнёвы характар абрадаў на Масленіцу ("Пахаванне дзеда", "Пахаванне бабы", "Валачыць калоду", "Трэсці падушкі"). Магічны сэнс веснавых гульняў і ігрышчаў (гойданне на арэлях, валачэнне калодкі, біткі з яйкамі). Веснавыя карагоды і гульні дзяцей і моладзі на вольным паветры. "Гуканне вясны". Гульні з "птушкамі". "Тураўскі карагод" – юраўскія ігрышчы моладзі і падлеткаў.

*Летнія каляндарныя святы. Традыцыйныя гульні летняга перыяду*

Летнія святы беларускага народнага календара. Тэатралізаваныя купальскія гульні. Выбар Купалінкі, Русалкі, "Куста" і інш. Карагоды. Танок. Забавы каля кастра. Сімвалізм гульні "Абліваха". Скокі праз вогнішча. Варажба. Выбар пары. Гульня хлопцаў-падлеткаў "Хадулі". Пошук папараць-кветкі. Абрад-гульня "Пахаванне зязюлі". Роля карагода. Тыпы карагодаў з пункту гледжання кампазіцыі: кругавы, адналінейны, двухлінейны.

*Восеньскія каляндарныя святы. Народныя забавы святочных кірмашоў*

Восеньскія святы беларускага народнага календара. Жніўныя гульні. "Завіванне барады". Абрад-гульня "Жаніцьба коміна". Гульня-варажба "Дзявоцкае лета"і "Бабіна лета". Талака. Беларускі кірмаш як форма адпачынку прадстаўнікоў розных узроставых і сацыяльных катэгорый насельніцтва. Прасторавае вырашэнне, мастацка-дэкаратыўнае афармленне народных кірмашовых забаў і спаборніцтваў. Гульнёвыя забавы беларускага кірмаша. Грамадскія гульні ("Козлы", "Пляцень", "Цялепа" і інш.) Гульні на вольным паветры ("Лапта" і інш.)

*Пазаабрадавыя гульні і забавы дзяцей і моладзі*

Знаёмства з гульнёвымі традыцыямі ў мясцовасці, дзе ўвасабляецца свята. Адбор гульняў. Класіфікацыя. Гульні дзяцей-малалетак “Конікі”, “Жмуркі”, “Абгонкі”; гульні дзяцей-падлеткаў “Цот і лішак”, “Каменьчыкі”, “Жгуцікі”; гульні для хлопчыкаў і дзяўчат; гульні з рухамі, гульні з мячом, гульні з завязанымі вачыма, сімвалічныя гульні ў жывёл і птушак, ролевыя гульні ў бацькоў і дзяцей.

*Методыка правядзення абрадавых і пазаабрадавых гульняў*

Методыка складання гульнёвай картатэкі. Святочная гульнятэка. Патрабаванні да бутафорыі і рэквізіту. Методыка правядзення рухомых гульняў. Методыка правядзення інтэлектуальных гульняў. Настольныя гульні. Гульнёвыя конкурсы. Методыка ўключэння гульні ў праграму танцавальнага вечара, масавага гуляння. Правядзенне са студэнцкай аўдыторыяй некалькі каляндарна-абрадавых і сучасных гульняў.

*Кампазіцыйная пабудова гульнёвай праграмы*

Экспазіцыя – стварэнне адпаведнай гульнёвай атмасферы – арганізацыя гульнёвай прасторы, падбор удзельнікаў, фарміраванне каманд. Персанажы як носьбіты эмацыянальнай складовай гульні. Сюжэтная лінія як форма ўвасаблення ідэі рэжысёра. Завязка – тлумачэнне ўмоў і правілаў гульні. Развіццё дзеяння – пабуджэнне да ўдзелу ў гульне, актывізацыя і заахвочванне гледачоў, кіраванне дзеяннем падчас гульні. Кульмінацыя – вызначэнне пераможцаў – дасягненне гульнёвай мэты. Фінал – узнагароджванне – ушанаванне пераможцаў гульні.

*Роля вядучага як арганізатара гульні, яго прафесійныя якасці*

Эрудыцыя, густ, такт, пачуццё гумару вядучага праграмы. Камунікабельнасць, уменне лёгка збліжацца з людзьмі. Навыкі акцёрскага майстэрства, мастацтва імправізацыі. Гульнёвыя мізансцэны і месцазнаходжанне вядучага. Умовы прыцягнення ўвагі гледачоў да падзей на гульнёвай пляцоўцы. Вядучы гульнёвых праграм: адзенне, маска, пераапрананне, грым, сцэнічны касцюм і вобраз.

*Прыёмы актывізацыі удзельнікаў гульнёвай праграмы*

Дыялог як форма звароту да асобы гледача. Зацікаўленасць – адзін з прыкладаў актывізацыі гульцоў і гледачоў (падарункі, “шчаслівае месца”, латарэя). Апытанне гледачоў. Правакаванне гледачоў. Стварэнне гульнёвага “канфлікта”. Падзея – дыялог – выхад гледача на сцэну для ўдзелу ў гульне.

*Музычнае афармленне, мастацка-дэкаратыўнае і моўнае вырашэнне гульнёвых праграм*

Стварэнне святочнай і ўзнёслай атмасферы ў гульнёвай праграме. Падбор музыкальных кампазіцый для фона, стварэнне музычнага раду. Асаблівасці маўлення вядучага. Метады і сродкі дакладнага тлумачэння ўмоў гульні ўдзельнікам і гледачам. Падбор, выраб рэквізіту з улікам узросту, памяшкання, пары года і г.д. Падбор або выраб прызоў.

*Сюжэтна-вобразная структура гульнёвых праграм*

Злучэнне разнастайных гульняў у адной забаўляльнай праграме. Аснова кожнага сюжэта – канфлікт. Магчымыя варыянты сцэнарна-рэжысёрскага ходу – “падарожжа ў госці”, “зварот у мінулае”, “барацьба за ўладаранне”, “наяўнасць гульцоў з процілеглымі поглядамі”. Эмацыянальная значнасць для выканаўцаў  і гледачоў праз вобразы гульнёвай праграмы.

*Арганізацыя пазаабрадавых гульнёвых праграм*

Рэжысёрская распрацоўка пазаабрадавых гульнёвых праграм. Азнаямленне з гульнёвымі традыцыямі мясцовасці, улік мастацкіх здольнасцей насельніцтва, вызначэнне тэмы, ідэі, умоў гульнёвай праграмы. Адбор гульняў, стварэнне гульнёвага рада. Работа з арганізатарамі свята, часткай якога з’яўляецца гульнёвая праграма.

*Ідэйна-тэматычная аснова сцэнарыя гульнёвай праграмы*

Першы варыянт: выбар тэмы, ідэі і звышзадачы гульнёвай праграмы, затым падбор гульняў, якія будуць суадносіцца з выбранай тэматыкай гульнёвай праграмы. Другі варыянт:  падбор гульняў згодна задумы свята, мясцовай традыцыі, магчымасцяў і г.д., і на іх аснове выбар тэмы, ідэі, звышзадачы гульнёвай праграмы.

*Пастаноўка гульнёвай праграмы*

Этапы распрацоўкі сцэнарыя гульнёвай праграмы. Падзел святочнага асяроддзя на зоны дзеяння. Прасторавыя і архітэктурныя адметнасці зоны дзеяння. Табліца гульняў і вынікаў. Каштарыс гульнёвай праграмы. Параўнальны аналіз табліц гульняў і каштарысаў. Работа над эксплікацыяй і тэксам сцэнарыя гульнёвай праграмы. Рэпетыцыя: вызначэнне мэты і спаборніцтва гульні; удакладненне тэкстаў вядучых, дзеянняў памагатых. Тэхнічны прагон (падбор музычных трэкаў, падбор асвятлення; фота-відэакадраў і інш.).  Зводная рэпетыцыя. Генеральны прагон. Удакладненні і дапрацоўка сцэнарыя.

*Класіфікацыя абрадаў*

Унікальныя адметнасці традыцыі, рытуалу, абраду, звычаю.

Параўнальны аналіз класфікацый рытуалаў і абрадавх дзей некалькіх навуковых школ

Функцыі абрадаў каляндарнага цыкла.

Сувязь рэлігійных абрадаў з магічнымі дзеяннямі продкаў

*Пастановачная работа па ўвасабленню абраду*

Мэтазгоднасць і функцыянальнае прызначэнне кожнага з відаў рэпетыцый. Асноўнае дзеянне рэжысёра, мастака-пастаноўшчыка, музычнага кіраўніка і артыстаў на кожнай з рэпетыцый.

Вызначэнне рэжысёрскіх эпізодаў абраду. Вызначэнне сцэнарна-рэжысёрскага хода, яго носьбітаў.

Кампазіцыйная пабудова кожнага эпізода.

Распрацоўка мізансцэнічных малюнкаў у эпізодах абраду. Вызначэнне цэнтральных мізансцэнічных пунктаў.

Правядзенне рэпетыцый асобных эпізодаў абраду.

Прагонныя і генеральныя рэпетыцыі абраду.

*Рэжысёрскі аналіз народнага абраду*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця распрацоўваемага студэнтам абраду на розных гістарычных этапах.

Ідэйна-тэматычная накіраванасць абрадава-рытуальных дзей.

Агульнае і рознае ў кампазіцыйнай пабадуве рытуальных комплексаў гадавога цыкла, сямейна-бытавых урачыстсцей.

Вызначэнне рэжысёрскіх эпізодаў, галоўных дзеючых асоб (апазіцыя традыцыйных і сучасных персаніфікаваных персанажаў).

Кампазіцыйная пабудова абраду і асобных эпізодаў.

Асноўныя віды вобразных мізансцэн абрадавых комплексаў. Распрацоўка мізансцэнічных малюнкаў галоўных эпізодаў абраду.

*Асноўныя формы тэатралізаваных прадстаўленняў і канцэртаў*

На аснове прадстаўленых відэаматэрыялаў і сцэнарных распрацовак тэатралізаваных прадстаўленняў разабраць са студэнтамі суадносіны мастацкіх прыёмаў “тэатралізацыі” і “ілюстрацыі” ў сучасных прадстаўленнях.

*Тэатралізаванае прадстаўленне ў народным свяце*

Вызначыць разам са студэнтамі метадам “мазгавога штурма” асноўныя этапы работы над стварэннем тэатралізаванага прадстаўлення ў народным і

свецкім свяце. Прасачыць адрозненні і аднолькавыя рысы над распрацоўкай і ўвасабленнем прадстаўленняў у святах рознай тэматычнай і жанравай накіраванасці.

*Тэатралізаванае прадстаўленне як сцэнічная форма ўвасаблення абраду*

На аснове прадстаўленых выкладчыкам відэазапісаў тэатралізаваных прадстаўленняў, цэрымоній ураыстага адкрыцця і закрыцця алімпійскіх гульняў у розных краінах, вызначыць месца абрадавых элементаў у кожнай з тэатралізаваных дзей.

*Рэжысёрская задума і сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка тэатралізаванага прадстаўлення на аснове гатовых разнажанравых нумароў*

Вызначыць асноўныя этапы работы над рэжысёрскай задумай прадстаўлення на аснове гатовых разнажанравых нумароў. Кожны са студэнтаў прадстаўляе да тэарэтычнай абароны і групавога аналізу самастойна падрыхтаванага прадстаўлення.

*Сцэнарна-рэжысёрскі ход, кампазіцыя і рэжысёрскія эпізоды тэатралізаванага прадстаўлення*

Фарміраванне ў студэнтаў уяўлення мастацка-эстэтычнага метаду мантажа,як стварэння сучаснага тэатралізаванага прадстаўлення і сродку арганізацыі глядацкага ўспрымання.

Аналіз асноўных функцый мантажу.

Месца эпізода ў тэатралізаваным прадстаўленні.

Методыка аб’яднання эпізодаў у тэматычныя блокі.

*Вызначэнне звышзадачы, скразнога дзеяння і мастацкага вобраза прадстаўлення. Работа з мастаком, музычным кіраўнікам*

Аналіз асноўных этапаў работа рэжысёра з мастаком над афармленнем тэатралізаванага дзейства, з музычным кіраўнікам.

Дэкарацыйнае мастацтва як сродак раскрыцця зместу і стылю тэатралізаванага прадстаўлення, узмацнення яго ўздзеяння на гледача. Выразныя сродкі сучаснай сцэнаграфіі.

*Planіровачныя рэпетыцыі. Вырашэнне масавых сцэн прадстаўлення.*

Аналіз паходжання, этымалогіі назвы і гісторыі мізансцэны. Прасцэніум як новы выразны сродак мізансцэніравання.

Вызначэнне галоўных кампанентаў, якія нараджаюць мізансцэну (слова, дзея, рух), другарадныя – свет, музыка, грым.

## РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

### Пералік пытанняў да бягучай атэстацыі

Раздзел I.
«Беларускія народныя гульні»

Беларуская народная гульня ў структуры сучаснага народнага свята. Аналіз стану і перспектывы развіцця.

Асаблівасці распрацоўкі сцэнарыяў гульнёвых праграм.

Прафесійныя якасці вядучага гульнёвай праграмы.

Прыёмы актывізацыі і дэактывізацыі ўдзельнікаў гульнёвай праграмы.

Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў.

Класіфікацыя і функцыі гульні.

Беларускія народныя гульні да беларускіх традыцыйных свят летняга цыклу.

Абрадавыя гульнёвыя дзеі народнага календара беларусаў.

Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя гульнёвай праграмы.

Народныя забавы і гульнёвыя дзеі Беларускіх кірмашоў.

Асаблівасці пастаноўкі гульнёвай праграмы.

Асаблівасці выкарыстання рэгіянальных гульняў Беларусі.

Бутафорыя і рэквізіт гульнёвай праграмы.

Сучасны гульнёвы фальклор Беларусі. Аналіз стану і перспектывы развіцця.

Роля вядучага як арганізатара гульнёвай дзеі.

Выкарыстанне традыцыйных масак і лялек у гульнёвай дзейнасці.

Пазаабрадавыя гульнёвыя дзеі народнага календара беларусаў.

Цыкл народных сямейна-бытавых гульнёвых дзей.

Спецыфіка выкарыстання дзіцячых гульнёвых праграм на сучасных святах Беларусі.

Сучасныя формы гульнёвых дзей ў сучаных моладзевых праектах.

Раздзел II.
«Рэжысура традыцыйнага абраду»

Класіфікацыя абрадаў

Рытуальна-абрадавыя комплексы свят каляндарна-аграрнага цыкла

Рэлігійныя абрады

Сямейна-бытаваяабраднасць беларусаў

Грамадскія і дзяржаўныя абрады

Рэжысёрскі аналіз народнага абраду

Рэжысёрскае бачанне абрадавай дзеі (рэжысёрскае асваенне сцэнарыя абраду)

Работа рэжысёра з мастаком над мастацка-дэкаратыўным вырашэннем абраду

Работа рэжысёра над музычным вырашэннем абрадава-рытуальнай дзеяй

Работа рэжысёра над словам і мовай ў абрадзе

Пастановачная работа па ўвасабленню абрада

Народныя традыцыі творчай арганізацыі абрадаў на вольным паветры

Вобразнасць у мастацка-дэкаратыўным вырашэнні традыцыйных народных абрадаў

Спецыфіка пластычнай культуры ў абрадах на вольным паветры

Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абрада каляндарнага цыкла

Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка абрада каляндарнага цыкла

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

**10 балаў** (надзвычай выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковыястэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы экзамена, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы; беспамылкова адказаў на ўсі пытанні. Свабодна аперыруе навуковайпрафесійнай тэрміналогіяй(у тым ліку на замежнай мове);бездакорна валодае інструментарыем вучэбных дысцыпліны, умее яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы, вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўляе здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўна і глыбока засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па дысцыплінах і даваць ім аналітычную ацэнку;выказвае свае меркаванні, паказвае жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**9 балаў** (выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковыя стэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы экзамена; дакладна выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); валодае інструментарыем вучэбных дысцыплін, умее яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы, вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўляе здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай дысцыпліны; поўна засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру;умее арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

**8 балаў** (амаль выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаўсістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмыэкзамена; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове);валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), умее яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;самастойна вырашае складаныя праблемы ў рамках вучэбнай двсцыпліны;засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру;умее арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**7 балаў** (вельмі добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах экзамена; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); умее рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійныхзадач;свабодна валодае тыпавымі рашэннямі ў рамках праграмы дзяржаўнага экзамена;засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру;умее арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**6 балаў** (добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастаткова поўныя і і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па экзамену; выкарыстоўвае неабходную навуковую тэрміналогію, умее рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; самастойна прымяняе тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засвоіў асноўную літаратуру; умее арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і накірунках па дысцыплінах і даваць ім параўнальную ацэнку;

**5 балаў** (амаль добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастатковае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію, правільна адказвае на пытанні; умее выкарыстоўваць інструментарый вучэбнай дысцыпліны ў вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольны самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засвоіў асноўную літаратуру.

**4 балы** (дастаткова здавальняюча) – у студэнта дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; напалову засвоіў асноўную літаратуру, рэкамендаваную вучэбнай праграмай; у некаторых выпадках выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію, лагічна адказвае на пытанні, умее рабіць высновы без істотных памылак; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; ў большасці выпадкаў арыентуецца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вучэбнай дысцыпліны і дае ім ацэнку.

**3 балы** (нездавальняюча) – недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай па вучэбнай дысцыпліне; адказ на пытанні адбываецца з істотнымі памылкамі; недастатковае валоданне

інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках дадзенай вучэбнай дысцыпліны;

**2 балы** (нездавальняюча):фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;веданнеасобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных па вучэбнай дысцыпліне;няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубыхпамылак.

**1 бал** (нездавальняюча) адсутнасць ведаў і (кампетэнцый) у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без паважнай прычыны.

**ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ**

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
УА “ Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
___________________Н.Ў.Карчэўская
“____” ___________2022 г.
Рэгістрацыйны нумар № ВД____вуч.

# РЭЖЫСУРА ФАЛЬКЛОРНАГА ПРАДСТАЎЛЕННЯ

*Вучэбная праграма модуля*
*“Рэжысура фальклорнага прадстаўлення”*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05*
*Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя)*

Мінск
2022

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Д.П.Сергейчук,* старшы выкладчык кафедры рэжысуры, установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”;

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай рэжысуры установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № _ ад __ __ 2022 г.)

Саветам факультэта мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № _ ад _ _ 2022г.)

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №
ад )

Адказны за рэдакцыю:
Адказны за выпуск: Д.П.Сергейчук

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

На кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” рыхтуюць высокакваліфікаваных і кампітэнтных спецыялістаў для работы ў галіне святочнай культуры, здольных да самаўдасканалення і развіцця ва ўмовах зменлівага духоўнага і інфармацыйнага жыцця грамадства.

Вучэбная праграма модуля «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя).

Актуальнасць вывучэння дадзенага модуля абумоўлена фундаментальнай роляй рэжысёрскіх ведаў у фарміраванні прафесійнага светапогляду будучых спецыялістаў; неабходнасцю пераемнасці гістарычнага вопыту, назапашанага мастацтвам рэжысуры святочных дзей, набыццём прафесійных уменняў і навыкаў у творчай арганізацыі разнажанравых сцэнічных мерапрыемстваў. Вучэбны модуль «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» прадугледжвае выкладанне творчых аспектаў увасаблення святочнай гульнёвай формы мерапрыемства на базе тэарэтычных дасягненняў айчыннай і замежнай рэжысуры, этналогіі, фалькларыстыкі, мастацтвазнаўства з выкарыстаннем значнага навукова-метадычнага матэрыялу: манаграфій, навукова-папулярных прац, метадычных дапаможнікаў і публікацый па асобных праблемах творчага ўвасаблення разнастайных форм святочнай культуры. Засваенне вучэбнага модуля «Рэжысура фальклорнага прадстаўлення» абапіраецца на веды, уменні і навыкі студэнтаў, атрыманыя пры вывучэнні сумежных дысціплін «Гісторыя свят», «Традыцыйная культуры беларусаў», Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Моўнае дзеянне ў свяце», «Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята», «Музычна-шумавое вырашэнне свята» і інш. Выкладанне модуля дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі для пошукаў шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення фальклоранага прадстаўлення. Сучаснае фальклорнае прадстаўленне разглядаецца як сукупнасць разнажанравых відаў мастацтва, таму будучаму рэжысёру неабходна засвоіць мадэлі творчай арганізацыі розных структурных кампанентаў святочнай дзеі на аснове фальклора.

Асноўная *мэта* вучэбнага модуля «Рэжысура фальклорнага

прадстаўлення» – набыццё студэнтамі сістэмы ведаў, практычных навыкаў і ўменняў па розных аспектах творчай задумы, распрацоўцы і ўвасабленні фальклорнага прадстаўлення як комплексу разнажанравых масава-гульнявых і абрадава-рытуальных дзей.

Мэтавая накіраванасць вучэбнага модуля абумоўлівае вырашэнне кола *задач*:

– раскрыць агульнатэарэтычныя палажэнні і спецыфіку рэжысуры фальклорнага прадстаўлення з улікам разнажанравых элементаў;

– выявіць рэгіянальныя, тэрытарыяльныя і мясцовыя асаблівасці абрадава-рытуальных дзей у святах і ствараць на іх аснове спецыфічныя ўмовы для сцэнічнай пастаноўкі фальклорнага прадстаўлення;

– разгледзець творчую арганізацыю прадстаўлення і яго разнажанравыя структурныя кампаненты ў якасці асобных тыпаў святочнай дзейнасці;

– вызначыць шляхі стварэння і развіцця новых фарматаў на аснове культурнай пераемнасці, мастацка-гістарычнага вопыту беларускага народа;

– фарміраваць мастацкую свядомасць будучых спецыялістаў – рэжысёраў факлорных прадстаўленняў.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– гульнёвы і абрадава-рытуальны каляндар беларусаў, яго ролю ў жыцці грамадства;

– генезіс, сімволіку і семантыку беларускіх рытуалаў, звычаяў і абрадаў;

– методыку распрацоўкі і ўвасаблення сюжэтна-гульнявых і конкурсных праграм, ролевых гульняў;

– методыку дэталёвай фальклорна-этнаграфічнай распрацоўкі прадстаўлення;

– традыцыі і навацыі ў творчай пастаноўкі фальлорнага прадстаўлення, новыя напрамкі для іх развіцця ў сучаснай святочнай культуры Беларусі.

– агульныя заканамернасці рэжысуры фальклорных прадстаўленняў.

– асаблівасці рэжысуры факлорнага прадстаўлення ўнародным святе.

– методыку распрацоўкі рэжысёрскай задумы факлорнага прадстаўлення і яго ўвасабленне.

Засваенне матэрыялу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне павінна забяспечыць фарміраванне ***наступных кампетэнцый***:

УК-1. Валодаць асновамі даследчай дзейнасцю, ажыццяўляць пошук, аназіл і сінтэз інфармацыі.

УК-4. Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесіянальныя, культурныя і іншыя адрозненні.

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканальванню ў прафесійнай дзейнасці.

УК-18. Прымяняць сучасныя тэхналогіі стварэння і ўпраўлення творчымі праектамі ў сферы культуры і мастацтва.

СК-1. Ствараць сцэнарыі разнастайных відаў тэатральных прадстаўленняў і свят, абапіраючыся на прынцыпы і тэхналогіі, формы і жанры прадстаўленняў і свят.

СК-2. Выкарыстоўваць навыкі рэжысёры і выканальніцкага майстэрства акцёра, прымяняць разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці ў працэсе стварэння розных відаў свят.

СК-3. Выкарыстоўваць прынцыпы кампазіцыйнай пабудовы масавых свят на адкрытых і нетрадыцыйных пляцоўках.

Набыццё ведаў ажыццяўляецца ў непасрэднай сувязі з фарміраваннем прафесійных здольнасцей, таму студэнт павінен *умець*:

– увасабляць фальклорнае прадстаўленне на аснове мясцовых традыцый правядзення абрадаў і рытуалаў ў закрытым памяшканні і на вольным паветры;

– увасобіць спецыфічны гульнявы комплекс кожнага канкрэтнага свята каляндарнага цыкла; сучасных сюжэтна-гульнявых, конкурсных праграм, ролевых гульняў на аснове фальклорных элементаў;

– валодаць прафесійнымі якасцямі вядучага гульнёвага дзейства;

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі для назапашвання пазітыўнага вопыту гульнёвага комплексу беларусаў у сучаснай святочнай культуры;

– ствараць сцэнарна-рэжысёрскую распрацоўку фальклорнага прадстаўленне на аснове выкарыстання этнаграфічнага матэрыялу.

Змест праграмы модуля распрацаваны на аснове дзяржаўнага адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі, у адпаведнасці з дзеючымі вучэбнымі праграмамі спец.дысцыплін.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАГА МОДУЛЯ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практы ч. | семінар. | індывід. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | | | |
| **Раздзел I. Беларускія народныя гульні як кампанент фальклорнага прадстаўлення** | | | | | |
| *Тэма 1.* Гульня як кампанент фальклорнага прадстаўлення | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 2.* Гульня ў структуры сучасных святочных мерапрыемстваў | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 3.* Методыка правядзення гульняў | 6 | | 6 | | |
| *Тэма 4.* Распрацоўка сцэнарыяў гульнёвых фальклорных прадстаўленняў | 10 | | 8 | | 2 |
| *Тэма 5.* Прафесійныя якасці вядучага гульні. Роля вядучага як арганізатара гульні | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 6.* Кампазіцыйная пабудова гульнёвых фальклорных прадстаўленняў | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 7.* Прыёмы актывізацыі і дэактывізацыі ўдзельнікаў гульнёвых фальклорных прадстаўленняў | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 8.* Пастаноўка гульнёвага фальклорнага прадстаўлення | 8 | | 8 | | |
| *Тэма 9.* Народны святочны каляндар сучаснай Беларусі | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 10.* Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 11.* Абрадавыя і пазаабрадавыя гульнявыя дзеянні веснавых свят народнага календара | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 12.* Гульні беларускага Купалля | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 13.* Народныя забавы кірмашу | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 14.* Актывізацыя гледачоў прадстаўлення праз гульнявыя дзеянні | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 15.* Арганізацыя пазаабрадавых гульнявых дзействаў народнага календара | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 16.* Рэгіянальныя гульні Беларусі | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 17.* Прагляд і аналіз відэазапісаў фальклорных прадстаўленняў | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 18.* Ідэйна-тэматычная аснова сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 19.* Эксплікацыя фальклорнага прадстаўлення | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 20.* Сюжэтна-вобразная структура | 4 | | 4 | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| фальклорнага прадстаўлення | | | | | |
| *Тэма 21.* Музычнае афармленне, мастацка-дэкара-тыўнае і моўнае вырашэнне гульнёвага фальклорнага прадстаўлення | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 22.* Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка фальклорных прадстаўленняў | 6 | | 4 | | 2 |
| *Усяго 1 раздзел* | 76 | 6 | 66 | | 4 |
| **Раздзел 2. Абрадава-рытуальны комплекс народных свят як аснова фальклорнага прадстаўлення** | | | | | |
| *Тэма 1.* Абрады і іх роля ў жыцці грамадства і асобы | 6 | 2 | 4 | | |
| *Тэма 2.* Класіфікацыя абрадаў | 6 | | 4 | | 2 |
| *Тэма 3.* Рытуальна-абрадавыя комплексы свят каляндарнага цыкла | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 4.* Рэлігійныя абрады | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 5.* Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 6.* Грамадскія і дзяржаўныя абрады і рытуалы | 4 | | 4 | | |
| Тэма 7. Рэжысёрская распрацоўка і ўвасабленне абраду як фальклорнага прадстаўленняў закрытым памяшканні | 8 | | 6 | | 2 |
| *Тэма 8.* Рэжысёрскі аналіз народнага абраду | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 9.* Рэжысёрскае абчанне абрадавай дзеі | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 10.* Работа рэжысёра з мастаком над мастацка-дэакаратыўным вырашэннем абрадавай дзеі | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 11.* Работа рэжысёра над шумавым, музычным вырашэннем абрадава-рытуальнай дзеі | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 12.* Работа рэжысёра над словам і мовай у абрадавай дзеі | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 13.* Пастановачная работа па ўвасабленні абрадавага прадстаўлення | 8 | | 8 | | |
| Тэма 14. Асаблівасці рэжысуры народнага абраду як фальклорнага прадстаўлення на вольным паветры | 6 | 2 | 4 | | |
| *Тэма 15.* Народныя традыцыі творчай арганізацыі абрадавай дзеі на вольным паветры | 6 | | 4 | | 2 |
| *Тэма 16.* Вобразнасць у мастацка-дэкаратыўным вырашэнні традыцыйных абрадавых дзей | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 17.* Спецыфіка пластычнай культуры ў | 2 | | 2 | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| абрадавай дзеі на вольным паветры | | | | | |
| *Тэма 18.* Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абрадавай дзеі | 4 | | 4 | | |
| *Тэма 19.* Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка абрадавай дзеі | 4 | | 4 | | |
| *УСЯГО* | 82 | 4 | 72 | | 6 |

# ЗМЕСТ МОДУЛЯ

## *Уводзіны*

Мэта і задачы дысцыпліны. Паняцце «фальклорнае прадстаўленне» ў навуковых крыніцах. Фальклорнае прадстаўленне і яго месца ў духоўным жыцці грамадства. Агульныя і адметныя рысы народнага свята і фальлорнага прадстаўлення. Адрозненне ад іншых відаў мастацтва. Творчыя праблемы рэжысуры сучаснага фальклорнага прадстаўлення.

## Раздзел I. Беларускія народныя гульні як кампанент фальклорнага прадстаўлення

### *Тэма 1.Гульня як кампанент фальклорнага прадстаўлення*

Гульня як кампанет фальклорнага прадстаўлення. Форма гульні ў прадстаўленні. Яе функцыі і мастацкі прыём. Суадносіны асноўных паняццяў, звязаных з фальклорным прадстаўленнем: традыцыя, гульня, абрад, цырыманіял, рытуал.

### *Тэма 2. Гульня ў структуры сучасных святочных мерапрыемстваў*

Разгляд тэрміна «гульня». Асноўныя прыкметы гульні. Умовы стварэння гульнявой атмасферы. Прынцыпы стварэння гульнявага фальклорнага прадстаўлення.Тыпалогія беларускіх народных гульняў. Разнастайнасць сучаснай тыпалогіі гульняў.

### *Тэма 3. Методыка правядзення гульняў*

Узроставыя асаблівасці правядзяння гульняў для дзяцей і падлеткаў. Этапы развіцця пазнавальнай актыўнасці. Афектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці. Здольнасць тлумачыць умовы гульні для дзіцячага разумення. Разгляд беларускіх дзіцячых гульняў па запісах этнографаў XIX стагоддзя.

### *Тэма 4. Распрацоўка сцэнарыяў гульнёвых фальклорных прадстаўленняў*

Мастацкае бачанне свету як асноўны элемент асобы рэжысёра. Імкненне да крытыкі ідэй. Пошук сюжэта фальклорнага прадстаўлення. Тэхналогіі творчага мыслення. Апісанне месца дзеяння. Падбор гульняў – падзейны рад.

### *Тэма 5. Прафесійныя якасці вядучага гульні. Роля вядучага як арганізатара гульні*

Гульнявыя мізансцэны і месцазнаходжанне вядучага. Умовы прыцягнення

ўвагі гледачоў да падзей на гульнявой пляцоўцы. Вядучыя гульнявых праграм: касцюм, паводзіны і моўнае дзеянне.

*Тэма 6. Кампазіцыйная пабудова гульнёвых фальклорных прадстаўленняў*

Экспазіцыя гульнявага фальклорнага прадстаўлення – стварэнне адпаведнай гульнявой атмасферы. Сюжэтная лінія як форма ўвасаблення ідэі рэжысёра. Персанажы як носьбіты эмацыянальнага зерня. Кульмінацыя – вызначэнне пераможцаў. Фінал – узнагароджанне лепшых.

*Тэма 7. Прыёмы актывізацыі і дэактывізацыі ўдзельнікаў гульнёвых фальклорных прадстаўленняў*

Неабходнасць эфектыўнага запрашэння людзей да ўдзелу ў гульнях. Прыёмы свядомай і бессвядомай актывізацыі гледачоў на свяце. Разгляд выпадкаў для дэактывізацыі ўдзельнікаў.

*Тэма 8. Пастаноўка фальклорнага прадстаўлення*

Этапы распрацоўкі сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення. Работа над эксплікацыяй і тэкстам сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення. Рэпетыцыі ў «выгарадках» – вызначэнне спаборніцтва ў гульнях, удакладненне тэкстаў вядучых, дзеянняў памочнікаў. Тэхнічныя рэпетыцыі – падбор музычнага суправаджэння, кадраў відэапраекцыі. Зводныя рэпетыцыі. Генеральны прагон. Удакладненне слабых бакоў фальклорнага прадстаўлення.

*Тэма 9. Народны святочны каляндар сучаснай Беларусі*

Тэндэнцыі развіцця святочных мерапрыемстваў. Традыцыйныя каляндарныя святы і новыя святочныя формаўтварэнні. Месца фальклорнага прадстаўлення і гульнявых блокаў у сучасных святах Беларусі.

*Тэма 10. Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў*

Карнавальныя традыцыі каляднага ігрышча. Калядныя гульні ў закрытым памяшканні: рэгіянальныя асаблівасці правядзення («Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Халімон»). Выраб калядных касцюмаў, масак, рэквізіту. Калядныя ігрышчы на вольным паветры – «Цягнуць Каляду на дуба», «Кола», «Конікі». Асаблівасці правядзення рэгіянальных гульняў «Слуп», «Перацягванне каната», «Ледзяны конус», «Катанне з гор». Гульнявы характар абрадавых масленічных вяселляў і пахаванняў.

*Тэма 11. Абрадавыя і пазаабрадавыя гульнявыя дзеянні веснавых свят народнага календара*

Магічны сэнс веснавых гульняў і ігрышчаў (гойданне на арэлях, валачэнне калодкі, гульні з яйкам, сёмушная варажба з вянкамі). Рэгіянальныя асаблівасці правядзення веснавых абрадавых гульняў – «Тураўскі карагод», «Ваджэнне стралы», варажба з бярозай.

*Тэма 12. Гульні беларускага Купалля*

Традыцыйныя купальскія абрадава-гульнявыя дзействы – збор удзельнікаў на свята, шэсце па вёсцы. Варажба на зеляніне. Тэатралізаваныя купальскія гульні – «Марусіначка», «Выбар пары». Вогненныя дзействы – парныя і асобныя пераскокванні праз вогнішча, купальская варажба з вянкамі, выкраданне купальскага агню. Пошук папараць-кветкі як масавае гульнявое дзеянне. Наладжванне танцавальных збораў як адметная рыса кантрактавых купальскіх кірмашоў.

*Тэма 13. Народныя забавы кірмашу*

Агульнанацыянальныя рысы і адметныя асаблівасці агульнанародных і кантрактавых кірмашоў. Тыпалогія гульнявых дзействаў беларускага кірмашу. Кірмашовыя латарэі – латарэя-рулетка, латарэя па спісе, сельскагаспадарчая латарэя. Гульнявыя атракцыёны і спартыўныя забавы.

*Тэма 14. Актывізацыя ўдзельнікаў свята праз гульнявыя дзеянні*

Дыялог як форма звароту да асобы гледача. Яскравасць падзеі – адзін з важных прыкладаў актывізацыі гледачоў. Апытанне гледачоў. Правакаванне дзеянняў гледачоў – падарункі, «шчаслівае месца», латарэя. Падзея – дыялог – выхад гледача на сцэну.

*Тэма 15. Арганізацыя пазаабрадавых гульнявых дзействаў народнага календара*

Рэжысёрская распрацоўка гульнявой праграмы – сукупнасць традыцыйных і рэгіянальнах гульняў, прымеркаваных да святочнага мерапрыемства. Адбор і пасторавае вырашэнне гульняў.

*Тэма 16. Рэгіянальныя гульні Беларусі*

Падзел тэрыторыі сучаснай Беларусі на этнаграфічныя рэгіёны. Гульні, якія характэрны для кожнага рэгіёна, іх умовы правядзення і апісанне дзеяння.

*Тэма 17. Прагляд і аналіз відэазапісаў фальклорных прадстаўленняў*

Вобразны рад у прэзентацыі фальклорнага прадстаўлення. Разнастайныя фарматы, іх асаблівасці. Выкарыстанне мультымедыя ў гульнявых мэтах. Вызначэнне кульмінацыйных падзей.

*Тэма 18. Ідэйна-тэматычная аснова сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення*

Два варыянты напісання сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення. Першы варыянт – выбар тэмы, ідэі і звышзадачы фальклорнага прадстаўлення, затым падбор гульняў і абрадаў, якія будуць суадносіцца з выбранай тэматыкай фальклорнага прадстаўлення. Другі варыянт напісання сцэнарыя – падбор гульняў, а на іх аснове выбар тэмы, ідэі і звышзадачы фальклорнага прадстаўлення.

*Тэма 19. Эксплікацыя фальклорнага прадстаўлення*

Экспазіцыя – арганізацыя гульнявой прасторы, фарміраванне каманд. Завязка – тлумачэнне ўмоў гульні. Развіццё дзеяння – пабуджэнне да гульнявога дзейства, актывізацыя гледачоў да ўдзелу ў гульнях, кіраванне гульнявым працэсам. Кульмінацыя – дасягненне гульнявой мэты. Фінал – узнагароджанне пераможцаў.

*Тэма 20. Сюжэтна-вобразная структура фальклорнага прадстаўлення*

Сцэнарна-рэжысёрскі ход – сродак, які злучае разнастайныя гульні ў адной праграме. Магчымыя варыянты сцэнарна-рэжысёрскага ходу – падарожжа, зварот у мінулае, сустрэча людзей з процілеглымі поглядамі, барацьба за ўладаранне. Аснова кожнага сюжэта – канфлікт. Выбар вобразаў фальклорнага прадстаўлення – эмацыянальная значнасць для гледачоў і выканаўцаў.

*Тэма 21. Музычнае афармленне, мастацка-дэкаратыўнае і моўнае вырашэнне фальклорнага прадстаўлення*

Стварэнне святочнай атмасферы ў фальклорным прадстаўленні. Лейтматыў і фонавая музыка, асаблівасці падбору музычнага рада. Асаблівасці маўлення. Метады дакладнага тлумачэння ўмоў гульні для ўдзельнікаў. Распрацоўка рэквізіту і выбар прызоў.

*Тэма 22. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўкафальклорнага прадстаўлення*

Падзел святочнага асяроддзя на зоны дзеяння. Прасторавыя і архітэктурныя адметнасці зоны дзеяння. Табліца гульняў. Каштарыс

фальклорнага прадстаўлення. Разгляд прыкладаў табліц гульняў і каштарыса з розных свят беларускага народнага календара.

## Раздзел ІІ. Абрадава-рытуальны комплекс народных свят як аснова факлорнага прадстаўлення

### *Тэма 1. Абрады і іх роля ў жыцці грамадства і асобы*

Паняцце «абрад». Асноўныя элементы абраду. Генезіс абрадаў і іх сацыяльная роля. Гістарычная эвалюцыя зместу, форм, тыпаў і функцый абрадаў. Структурныя элементы рытуальна-абрадавых комплексаў земляробчага календара. Маскіраванне і абрадавае пераапрананне. Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў. Рэлігійныя абрады, іх сімвалічная і практычная значнасць. Грамадскія і дзяржаўныя абрады.

Рэжысёрскі аналіз народнага абраду. Рэжысёрскае бачанне абрадавага дзейства (рэжысёрскае асваенне сцэнарыя абраду). Работа рэжысёра з мастаком над мастацка-дэкаратыўным вырашэннем абраду. Работа рэжысёра над музычным вырашэннем абрадава-рытуальных дзеянняў. Пластыка-харэаграфічнае вырашэнне абраду. Работа рэжысёра над словам і мовай у абрадзе. Этапы пастановачнай работы па ўвасабленні абраду.

Сучасная практыка правядзення абрадаў у розных раёнах Беларусі. Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абраду ў закрытым памяшканні на аснове народных традыцый выбранага этнаграфічнага рэгіёна. Збор і апрацоўка вусна-паэтычнага, музычнага і пластыка-харэаграфічнага матэрыялу, стварэнне сцэнарыя і пастановачнага плана абрадавага дзейства, выраб дэкарацый, касцюмаў, рэквізіту і бутафорыі, правядзенне рэпетыцый і паказ абраду.

### *Тэма 2. Класіфікацыя абрадаў*

Асноўныя прынцыпы тыпізацыі абрадаў па сферы працы: паляўнічыя, рыбацкія, земляробчыя, жывёлагадоўчыя, воінскія і іншыя. Тыпізацыя абрадаў у залежнасці ад сацыяльных супольнасцей: грамадскія, дзяржаўныя, сямейныя. Дзеянне абрадаў узроставай дэферэнцыяцыі: дзіцячыя, юнацкія, абрады для моладзі. Абрады, звязаныя з календаром (порамі года, сезонамі земляробчай працы, юбіленымі датамі). Рэлігійныя і свецкія абрады.

Аб’ектыўная патрэба вывучэння, захавання і развіцця традыцыйнай беларускай каляндарнай і сямейна-бытавой абраднасці, распрацоўка і далейшае ўдасканаленне новай нацыянальнай абраднасці.

*Тэма 3. Рытуальна-абрадавыя комплексы свят каляндарнага цыкла*

Структурныя элементы рытуальна-абрадавых комплексаў земляробчага календара (магічныя дзеянні, абрадавыя песні і танцы, атрыбуты і сімвалы, прыкметы, варожбы), скіраваныя на ідэі паляпшэння дабрабыту, прынцыпы падабенства, захавання і працягу свайго роду, ушанаванне продкаў.

Травестацыя (маскіраванне і абрадавае пераапрананне) – унікальная з’ява традыцыйнай святочна-абрадавай культуры беларусаў, яе гаспадарча-аграрная, камунікатыўная, магічная, псіхалагічная, увесяляльная функцыі. Прыметы, уласцівыя абрадава-рытуальным комплексам каляндарнага цыкла (культ сонца, зямлі, прыроды, вады, агню, расліннасці, продкаў; абавязковая наяўнасць сімволікі, рытуальнай ежы, шэсцяў).

*Тэма 4. Рэлігійныя абрады*

Таінствы – хрысціянскія абрадавыя дзеі (хрышчэнне, прычашчэнне, свяшчэнства, пакаянне (споведзь), мірапамазанне, шлюб, ялееасвяшчэнне (сабораванне)).

Практычная і сімвалічная значнасць рэлігійных абрадаў. Абраднасць як неад’емная частка рэлігійнага культу, эмацыянальна-вобразнае ўвасабленне рэлігійных ідэй і ўяўленняў, знешняя форма праявы рэлігійнасці. Вызваленне традыцыйнай народнай абраднасці ад рэлігійных напластаванняў.

*Тэма 5. Сямейна-бытавая абраднасць беларусаў*

Старажытныя традыцыі ўваходзін. Агонь і зерне як сімвал захавання дабрабыту і багацця ў хаце. Рытуал асвячэння гаспадаркі, сустрэчы і ўшанавання першага госця.

Прадметна-атрыбутыўны, акцыянальны (рытуальныя дзеянні) і вербальныя коды ў абрадах вяселля і пахавання. Радзінна-хрэсбінны цыкл беларускіх народных абрадаў. Абрады змянення жыццёвага статуса чалавека як абрады пераходу.

Сімволіка нацыянальнай каларыстыкі ў сямейнай абраднасці беларусаў.

*Тэма 6. Грамадзянскія і дзяржаўныя абрады і рытуалы*

Генезіс дзяржаўных рытуалаў, абрадаў, цырыманіялаў. Фарміраванне сістэмы абрадава-рытуальнага комплексу – класава-палітычнай накіраванасці з XIV стагоддзя, сімвалічнае значэнне яго – мастацка-дэкаратыўнага афармлення. Цырымоніі прысвячэння, інаўгурацыі, іматрыкуляцыі як сучаснае абрадава-рытуальнае формаўтварэнне ў структуры святочнай культуры. Методыка арганізацыі і правядзення абрадава-рытуальных дзей на мемарыяльных комплексах.

*Тэма 7. Рэжысёрская распрацоўка і ўвасабленне абраду як фальклорнага прадстаўлення ў закрытым памяшканні*

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця ўвасабляемага абраду, выяўленне генэзісу, яго рытуалаў, язычніцкіх, хрысціянскіх, сведскіх напластаванняў.

Ідэйна тэматычны аналіз. Тэма – жыццёвая з’ява, падзея, адлюстраваная ў абрадзе пры дапамозе розных сродкаў мастацкай выразнасці.

Ідэя – галоўная вядучая думка, якая вызанчае задуму і асноўны змест абраду. Адзінства і ўзаемадзеянне зместу і формы як спосаб аадлюстравання ідэі абраду.

Састаўныя фрагменты абраду. Сцэнарна-рэжысёрскі ход – прыём, які аб’ядноўвае розныя часткі сцэнарыя. Носьбіты сцэнарна-рэжысёрскага ходу.

*Тэма 8. Рэжысёрскі аналіз народнага абраду*

Архітэктоніка абраду як паслядоўнасць і суразмернасць частак, аб’яднаных у адзінае ідэйна-тэматычнае цэлае. Асноўныя элементы кампазіцыйнага вырашэння абраду: пралог, экспазіцыя, завязка, развіццё дзеі, кульмінацыя, развязка, фінал. Пралог – своеасаблівая прадмова, якая падрыхтоўвае ўдзельнікаў абраду да маючай адбыцца ўрачыстасці. Адлюстраванне ў пралогу ў самым агульным выглядзе тэмы абраду, яго ідэі.

Экспазіцыя – уваход у абрадавую дзею. Задачы экспазіцыі: інфармацыя ўдзельнікаў абраду аб будучых дзеяннях і стварэнне атмасферы ўрачыстасці, святочнасці ці, наадварот, журбы (пры абрадзе пахавання).

Завязка – першачя падзея, з якой пачынаецца абрад.

Развіццё дзеі, як лагічная і эмацыянальная падрыхтоўка галоўнай падзеі. Далучэнне ўдзельнікаў да сімвалаў абраду, стварэнне псіхалагічнага настрою, які садзенічае найбольш поўнаму ўспрыманню абраду.

Кульмінацыя – галоўная падзея абраду, найвышэйшы эмацыянальны пункт у развіцці тэмы.

Развязка – эмацыянальна-сэнсавы вынік абраду.

Фінал – завяршаючая частка абраду. Элементы іправізацыі пры правядзенні абраду.

*Тэма 9. Рэжысёрская бачанне абрадавай дзеі*

Рэжысура абраду як вызначэнне пластычнага, музычнага, каляровага, дэкаратыўнага, прасторавага вырашэння абрадавай дзеі.

Вызначэнне звышзадачы і скразной дзеі. Прасторавае вырашэнне (мізансцэніраванне) эпізодаў абраду. Вывучэнне памераў сцэны альбо пляцоўкі, адведзенай для правядзення абраду, вызначэнне мізансцэнічнага цэнтра будучай абрадавай дзеі, аптымальнага размяшчэння яго ўдзельнікаў. Умоўны падзел пляцоўкі на правую і левую часткі, іх пластыная

запоўненасць з ўлікам асаблівасцей успрымання гледачоў (злева направа і зверху ўніз). Падрыхтоўка і змена мізансцэн.

Мастацтва мізансцэны. Мізансцэна – размяшчэнне ўдзельнікаў на сцэне. Гісторыя мізансцэны. Драматург – рэжысёр. Мізансцэна і падзея. Мізансцэна і канфлікт. Тэмпарытм і мізансцэна. Масавая мізансцэна. Віды мізансцэн (франтальныя, дыяганальныя, кругавыя, глыбінныя, люстэркавыя, сіметрычныя, асіметрычныя, вышынныя, спіральныя), іх выразныя магчымасці і недахопы. Віды запісу мізансцэн (літаратурны, нотны, графічны).

Сіметрыя ў сінхронным руху ў ходзе абраду. Улік у рэжысёрская распрацоўцы сцэнарыя характэрнай да дадзенага абраду дынамікі дзеяння ва ўзаемасувязі з іншымі выразнымі сродкамі абраду.

Прасторавае вырашэнне абраду. Зоны дзеяння. Апорныя пункты. Цэнтральны мізансцэнічны пункт.

Мантажны ліст рэжысёра абраду: план аднаўлення ў абрадзе неабходных мізансцэн, адпаведнага ім тэксту і мастацкага афармлення.

Рэжысёрскі сцэнарый абраду – паслядоўнасць эпізодаў, якія адпавядаюць кампаазіцыйнайй структуры. Драматургіі абраду. Эпізод абраду, як сістэмаэлементарных абрадавых дзей, аб’яднаных адной мэтай і маючых адносна самастойнае значэнне.

*Тэма 10. Работа рэжысёра з мастацком над мастацка-дэкаратыўным вырашэннем абрадавай дзеі*

Выяўленне і дэкаратыўнае мастацтва і яго роля абрадзе. Вызначэнне мастацка-дэкаратыўнай кампазіцыі абраду. Значэнне розных выразных сродкаў і народнай сімволікі для ўспрымання абраду гледачамі, узмацнення яго эмацыянальнага ўздзеяння на чалавека.

Дэкаратыўна-мастацкае афармленне як адлюстраванне зместу абраду, яго галоўнай ідэі.

Вызначэнне сімволікі ў народным абрадзе і яе афармленне. Сімвал як найбольш выразны элемент святочна-абрадавай урачыстасці, клопат аб яго даставернасці, высокай мастоацкай дасканаласці. Сімвалічнае значэнне ў абрадах розных прадметаў (абрадавы хлеб, ручнікі, палаючыя колы, сноп, вянок і інш.), самой абрадавай дзеі, знешняга і ўнутранага ўбрання памяшканняў, воптракі выканаўцаў і ўдзельнікаў абраду.

Прызначэнне абрадавай сімволікі – віклікаць у свядомасці людзей пэўныя асацыяцыі з устойлівымі, звыклымі вобразамі (сноп –сімвал дабрабыту, хлеб-соль – сімвал добрых пачуццяў і намераў да гасцей, вянок – сімвал дзявоцтва і інш.).

Прадметна-рэчавыя сімвалы ў абрадах: натуральныя (бяроза, куст,

сноп, пшаніца, каліна, кветкі, зёлкі і т.п.) і штучныя (паходня, канструкцыя кастра, абеліск, ручнік, вянок, вясельныя пярсцёнкі, пудзела зімы, русалкі і інш.). творы мастацтва (карнавальныя маскі, касцюмы, атрыбуты) і прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў якасці абрадавых сімвалаў.

Касцюмы і знакі адрознення выканаўцаў і ўдзельнікаў абраду. Аптымальнае размяшчэнне сімвалаў, эмблем і атрыбутаў абраду. Вызначэнне формы, колеру, канструкцыйных асаблівасцей, тэхналогій і вырабу абрадавай сімволікі, атрыбутыкі і рэквізіту.

*Тэма 11. Работа рэжысёра над шумавым, музычным*
*вырашэннем абрадава-рытуальнай дзеі*

Агульная характарыстыка музыкі ў абрадзе. Фарміраванне эмацыянальнага клімату – галоўная прызначэнне музыкі ў рытуале, абрадзе. Музыка як сімвал у абрадзе.

Разнастайнасць музычнага суправаджэння ў абрадах. Харавыя спевы як форма агучвання абраду. Месца аркестравай музыкі ў абрадах і рытуалах. Ансамблі ў музычным афармленні абраду.

Народныя песні ў абрадах. Улік ідэйна-тэматычнай накіраванасці фальклорных твораў, іх адпаведасці пластычнаму дзеянню.

Музыка і тэмпарытм абраду. Уздзеянне музыкі на фарміраванне ўласціувага абраду эмацыянальнага тэмпарытму. Роля музыкі ў паўзах паміж абрадавымі дзеяннямі.

Значэнне музыкі як сімвала ў абрадзе. Выкананне абрадавай музыкай функцый пабуджальнага сродку да пэўных дзеянняў і перажыванняў. Песня як гукавы сімвал абраду.

Моўная частка абраду – праграма для падбору музычнага суправаджэння. Узаемаўплывы музыкі і слова пры стварэнні эмацыянальнага настрою ў час правядзення абраду. Адзінства слова, музыкі і абрадавага дзеяння. Эмацыянальная дамінанта як пераважаючае пачуццё, створанае ў працэссе суменага ўплыву абрадавага дзеяння, музыкі і слова.

*Тэма 12. Работа рэжысёра над словам і мовай у абрадавай дзеі.*

Функцыі слова ў абрадзе. Славесныя кампаненты абраду: тэксты віншаванняў, урачыстыя запаветы, наказы, абяцанні, замовы, словы абрадавых песень, прысягі.

Узаемасувязь слова і мовы з сімволікай і абрадавымі дзеяннямі. Маналагічная і дыялагічная, загаддзя падрыхтаваная і імправізацыйная мова ў абрадзе. Асаблівасці абрадавай мовы: сцісласць і дакладнасць, яснасць і эмацыянальнасць. Прыёмы дасягнення ўмоўнай выразнасці: рытм і інтанацыйны строй.

Класіфікацыя абрадавых прамоў па прызначэнні: урачыста-афіцыйная, прывітальная, віншавальная, развітальная, памінальная.

Выражэнне павагі да ўдзельнікаў абраду (гаспадароў, юбіляраў, ганаровых гасцей і нш.) з дапамогай прывітальнай прамовы. Прамова – паказ і адлюстраванне ў ёй пажаданняў удзельнікам абраду паспяховага завяршэння грамадскіх і асабістых спраў. Віншавальная мова, яе роля і значэнне пры ўшанаванні асобных людзей у сувязі з пэўнымі падзеямі, якія адзначае абрад.

Развітальная прамова – частка абраду пахавання, у якой даецца ацэнка заслуг нябожчыка. Накіраванасць памінальнай прамовы на замацаванне добрай памяці аб тых хто закончыў жыццёвы шлях. Значэнне памінальнай прамовы ўдзельнікамі абраду існага сэнсу жыцця і чалавечай каштоўнасці.

Тэхніка мовы ў абрадзе: лагічная стройнасць, інтанацыйнае багацце і гучанне голасу, захаванне нормаў літаратурнага вымаўлення (арфаэпія), дакладнасць вымаўлення гукаў (дыкцыя).

Логіка абрадавай мовы. Моўны такт. Недапушчальнасць манатоннасці ў абрадавай мове. Сэнсавае і мастацка-эстэтынае значэнне інтанацыі ў вуснай мове. Дыханне і яго тыпы ў час маўлення ў абрадзе.

### *Тэма 13. Пастановачная работа па ўвасабленні абрадавага прадстаўлення*

Застольны перыяд рэпетыцый (актуальнасць і сацыяльная значнасць абраду, яго тэма і ідэя, чытка літаратурнага сцэнарыя, размеркаванне роляў, рэжысёрская характарыстыка кожнага персанажа, вызначэнне скразной дзеі, вызначэнне канфліктнай асновы, чытанне сцэнарыя па ролях, раскрыццё ўнутраных маналогаў. Планіровачныя рэпетыцыі (рэпетыцыі ў “выгарадках”) – прадметна-рэчавых асяроддзі, пошук выразных мізансцэн, дзейны аналіз абраду).

Мантажныя рэпетыцыі (удакладненне мастацка-дэкаратыўнага, светлавога, гукавога афармлення дзеі на пляцоўцы). Прагонныя рэпетыцыі (аб’яднанне асобных эпізодаў абраду ў адзінае сцэнічнае дзеянне, карэкціроўка мізансцэнічнага малюнка, мастацка-дэкаратыўнага і музычнага вырашэння). Генеральныя рэпетыцыі – завяршальны этап работы над увасабленнем абраду.

### *Тэма 14. Асаблівасці рэжысуры народнага абраду як фальклорнага прадстаўлення на вольным паветры*

Знаёмства з народнымі традыцыямі творчай арганізацыі абрадаў на вольным паветры, рознымі прыёмамі актывізацыі ўдзельнікаў, мастацка-вобразным вырашэннем дзействаў, спецыфікай пластычнай культуры.

Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абраду каляндарнага цыкла на аснове вывучэння этнаграфічных і літаратурных крыніц, аналізу сцэнарнага фонду па вызначанай тэматыцы і трансфармацыі абрадава-рытуальных дзеянняў у розных плынях традыцыйнай культуры. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка абраду на вольным паветры з улікам агульнанацыянальных, рэгіянальных і мясцовых традыцый яго вобразна-сімвалічнага, музычнага і пластычнага ўвасаблення. Цыкл рэжысёрска-пастановачных і арганізацыйных работ па падрыхтоўцы і правядзенні абраду на вольным паветры.

*Тэма 15. Народныя традыцыі творчай арганізацыі абрадавай дзеі на вольным паветры*

Мастацка-гістарычны вопыт народа як сістэма адбору лаканічна-выразных сродкаў і формаў творчай арганізацыі абраду, замацаваных у традыцыі.

Папярэднія зборы моладзі на рэпетыцыі абрадавых дзей, фарміраванне абрадавых гуртоў, згодна ўзроставай дыферэнцыяцыі, падзел зон дзеяння кожнага абрадавага калектыву (Каляды, Вялікдзень), падрыхтоўка абрадавых касцюмаў, масак і лялек, рэквізіту, буфаторыі, а таксама збор паліва і падрыхтоўка ваза для яго транспарціроўкі (Купалле) як традыцыйна склаўшаяся дзея інфармацыйнага і творчага характару па стварэнні перадсвяточнай атмасферы.

Шэсце ўдзельнікаў абраду па вёсцы як спосаб актывізацыі гледачоў, далучэнне іх да ўдзелу ў абрадзе, інфармацыя аб пачатку абрадавай дзеі. Шэсце як тэатралізаваная форма стварэння перадсвяточнай атмасферы. Выразныя сродкі і асаблівасці рознаварыянтных вулічных шэсцяў у абрадавых святах (зорны выхад калядных груп у Давыд-Гарадку, ланцужковы карагод – ручаіна “Загуканне вясны” ў Светлагорскім раёне, адналінейны карагод-шэсце на Юр’е, Вялікдзень і Сёмуху, шэсце на Купалле з дзяленнем на рознаўзроставыя групы, а таксама з выкарыстаннем дэталей мастацкага афармлення (палаючыя паходні, высахшыя бярозкі, якія засталіся пасля Сёмухі), ланцужковае шэсце са снапом на Зажынках, снапом і вянком на Дажынках, лупком з зернем – на Багач).

Мастацка-дэкаратыўнае афармленне месца дзеяння і вызначэнне цэнтралізаванага мізансцэнічнага пункту абраду (усталёўка слупа з колам і рытуальнае ўпрыгожванне дуба ў абрадах завяршэння Каляд на Міншчыне, пабудова ледзяной горкі і снежных фігур на Маленіцу, бярозкі ў Сёмушных абрадах кумлення і развівання вянкоў, пабудова рознаварыянтных канструкцый вогнішчаў пад час святкавання Гукання вясны, Вялікадня, Юр’я, Купалля, завіванне верхавін дзвюх бярозак у вянок на парэдадні

Сёмухі, выраб дажыначнага снапа і рытуальныя дзеі з ім, пабудова элементаў аказіянальнай архітэктуры на Кірмашах і інш.)

*Тэма 16. Вобразнасць у мастацка-дэкаратыўным вырашэннітрадыцыйных абрадавых дзей*

Традыцыйнае прасторавае вырашэнне абраду на вольным паветры з абавязковым падзелам тэрыторыі абрадавага дзеяння на дзве зоны: вёска (хата, падворак, вуліца) і вясковае наваколле (поле, луг, лес, рэчка).
Спецыфіка выразных сродкаў мастацка-дэкаратыўнага вырашэння абраду на адкрытай прасторы.

*Тэма 17. Спецыфіка пластычнай культуры ў абрадавай дзеі на вольным паветры*

Традыцыйная вобразная сімволіка ў пластычным вырашэнні абраду. Рухі і жэсты ў абрадах на вольным паветры. Віды запрашальных жэстаў у абрадзе: малы, сярэдні і вялікі. Тэхніка руху з абрадавымі атрыбутамі. Спецыфіка пластычнай культуры ў абрадзе пахавання. Тэхніка руху з паходнямі.

Асаблівасці руху з ішмымі абрадавымі сімваламі (хлеб-соль, каравай. ручнік і інш.) Удасканальванне пластыкі традыцыйных і новых абрадаў як важны фактар павышэння іх ідэйна-мастацкага і эстэтычнага ўзроўню.

Прыёмы актывізацыі пасіўных удзельнікаў абраду. Роля выканаўцаў абраду ў актывізацыі гледачоў.

*Тэма 18. Фальклорна-этнаграфічная распрацоўка абрадавай дзеі*

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця абраду на аснове вывучэння літаратурных, этнаграфічных і першакрыніц. Аналіз сцэнарнага фонду па вызначанай тэматыцы. Раскрыццё агульнанацыянальных фрагментаў і рэгіянальна-лакальных асаблівасцей абраду. Аналіз трансфармацыі абрадава-рытуальных дзей на розных стадыяльных этапах развіцця традыцыйнай культуры (вызначэнне язычніцкай асновы, хрысціянскіх і свецкіх напластаванняў).

*Тэма 19. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка абрадавай дзеі*

Стылізацыя народнага абраду. Паняцці “рэстаўрацыя”, “рэканструкцыя ", "трансфармацыя”. Распрацоўка сцэнарыя народнага абраду на аснове глыбокага вывучэння агульнанацыянальных, рэгіянальных і мясцовых традыцый яго ўвасаблення.

Мастацкі вобраз абрадавага прадстаўлення ў мастацка-дэкаратыўным і музычным увасабленні. Сцэнарна-рэжысёрскі ход і яго носьбіты. Прасторавае вырашэнне народнага абраду. Пошук вобразных, яскравых мізансцэн, якія адлюстроўваюць ідэйна-тэматычную накіраванасць абраду пры захаванні натуральнай, традыцыйнай формы паводзін удзельнікаў.

Распрацоўка сістэмы вобразаў абраду (рэжысёрская характарыстыка персанажаў, “зерне” вобразаў, яго адносіны да падзей, што адбываюцца, і да астатніх персанажаў).

# ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. Андрейчук, Н. М. Основы профессионального мастерства сценариста массовых праздников : учеб. пособие / Н. М. Андрейчук. - Изд. 6-е, стер. – СПб. ; М. ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2021. - 231 с.

2. Валодзіна, Т. В. "Ядраное жыта гаспадара кліча...": каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. - Мінск : Беларуская навука, 2015. - 354, [1] с. : каляр. фат.

3. Марков, О. И. Сценарная культура режиссеров театрализованных представлений и праздников. Сценарная технология : учеб. пособие / О. И. Марков. - Изд. 5-е, стер. - СПб. ; М.; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2021. - 420, [1] с.

4. Мордасов, А.А.Принципы режиссуры театрализованных представлений и праздников: учеб/ пособие/ А.А. Мордасов. – 4-е, стер. – СПб.: Планета музыки, 2020. – 128 с.

5. Шубина, И. Б. Драматургия и режиссура зрелищных форм. Соучастие в зрелище, или Игра в миф : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. - Изд. 4-е, стер. – СПб., М ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2020. - 238, [1] с.

*Дадатковая літаратура*


Арутюнов, С.А. Обычай, ритуал, традиция / С.А.Арутюнов // Советская этнография. – 1981. – № 2.

Базанов, В.В. Техника и технология сцены / В.В.Базанов.– Л.: Искусство, 1976. – 234 с.

Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К.Байбурин; отв. ред. Б.Н.Путилов; РАН. МАЭ им. Петра Великого (Кунсткамера). – СПб.: Наука, 1993. – 239с.

Барышев Г.И.Теотральная культура Белоруссии XVIII века.- Мн.:Бел.навука, 1992.234с.:ил.

Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. – Мн.: Беларусь, 1994. – 128 с.

Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / В.Ф.Бацяеў [і інш.]; рэдкал.: В.М.Бялявіна [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 606 с.: іл.

Богданович, А. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А.Богданович. – Мн.: Беларусь, 1995. – 186 с.

Восточнославянский фольклор: словарь науч. и нар. терминологии / редкол.: К.П.Кабашников [и др.] – Мн.: Наука и техника, 1993. – 487 с.

Гуд, П.А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П.А.Гуд. – Мн.:БДУ культуры, 1999. – 137 с.

Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А.Гуд, Н.І.Гуд. – Мн.: Полымя, 1996. – 270 с.: іл.

Гуд, П.А. Мастацтва феерверкаў / П.А.Гуд. – Мн.: Мэджік Бук, 2007. – 100 с.: іл.

Гуд, П.А. Тэхналогія стварэння свята / П.А.Гуд. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 234 с.

Гульні забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мн.: Бел.навука, 1996. – 534 с.

Гусев, В.Е. Народные игры, драмы и театр / В.Е.Гусев // Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры. – М.: Наука, 1987. – 458 с.

Гуревич, А.Я. Проблемы средневековой народной культуры / А.Я.Гуревич. – М.: Искусство, 1981. – 359 с.: ил.

Гурскі, А.І. Святкаванне Каляд на Беларусі / А.І.Гурскі. –

Мн.:Універсітэцкае,1998. – 94 с.

Джексон, Ш. Пособие по изготовлению театрального костюма / Ш.Джексон. – М.: Искусство, 1984. – 144 с.

Емельянов, Е.Д. Звукофикация театров и концертных залов. – М.: Искусство, 1989. – 272 с.

Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л.М.Салавей. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 518 с.

Захаржевская, Р. Костюм для сцены / Р. Захаржевская. – М.: Советская Россия, 1967. – 176 с.

Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І.Гурскага; уступ. арт. А.І.Гурскага, А.С.Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 429 с.

Камінскі, А.Я. Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства / А.Я.Камінскі. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – 112 с.

Камінскі, А.Я. Зімовыя святы / А.Я.Камінскі. – Мн.: Чатыры чвэрці, 2009. – 140 с.

Камінскі, А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду / А.Я.Камінскі. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 113 с.

Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мн.: Беларусь, 1999. – 179 с.

Карскі, Я. Беларусы / Я.Карскі; уклад. і камент. С.Гараніна і Л.Ляўшун; навук. рэд. А.Мальдзіс. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.

Катовіч, А. Веснавыя святы: нарысы: у 2 кн. / А.Катовіч, Я.Крук. – Мн.: Маст. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

Котлярчук, А. С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII века: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С.Котлярчук. – СПб.: Петербург. Востоковедение, 2001. – 238 с.

Крук, І.І. Сімволіка беларускай народнай культуры / І.І.Крук. – Мн.: Беларусь, 2003. – 350 с.: іл.

Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т.І.Кухаронак. – Мн.: Ураджай, 2001. – 239 с.

Кухаронак, Т. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX–XX ст. / Т.Кухаронак. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

Ліс, А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А.С.Ліс. – Мн.: Бел. навука, 1998. – 188 с.

Лозка, А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А.Лозка. – Мн.: Тэхналогія, 1997. – 183 с.

Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мн.: Бел. навука, 1982. – 276 с.

Мальдзіс А. Як жылі нашыя продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мн.: Ураджай, 2001. – 178 с.

Митта, А. Кино между адом и раем / А.Митта. – М.: Подкова, 2002. – 480 с.

Мочалов, Ю. Композиция сценического пространства: поэтика мизансцены / Ю.Мочалов. – М.: Просвещение,1981. – 239 с.

Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мн.: Бел.навука, 2002. – 432 с.: іл.

Народны тэатр / уклад. М.А.Каладзінскі. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 554 с.

Пави, П. Словарь театра / П.Пави. – М.: Прогресс, 1991. – 504 с.:ил.

Петров, Б.Н. Массовые спортивно-художественные представления: основы режиссуры, технологии, организации и методики / Б.Н.Петров. – М.: ТВТ Дивизион, 2006. – 374 с.: ил.

Радзіны. Абрад. Песні / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 1998. – 637 с.:іл.

Ремез, О. Мизансцена – язык режиссера / О.Ремез. – М.: Просвещение, 1965.

Романов, Е.Р. Белорусский сборник: быт белоруса / Е.Р.Романов. – Вильно, 1912. – Вып.8.

Сергейчук, Д.П. Аналіз арганізацыі народнай гульні ў святах календарнага цыкла / Д.П. Сергейчук // Культура: открытый формат – 2011. Сборник научных работ. – Мн.: БГУКИ , 2011. – 119 с.

Сям'я і сямейны быт беларусаў / Рэдкал.: В.М.Бялявіна і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 2002. – 345 с.

Тавлай, Г.В. Белорусское купалье: обряд, песня / Г.В.Тавлай. – Мн.: Наука и техника, 1986. – 174 с.:ил.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б.Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В.І.Басько [і інш.]. – Мн.: Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б.Варфаламеева [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 790 с.

Фонштейн, В. Куклы театрализованного представления / В.Фонштейн // Художник и зрелище: Сб. ст. М.:Сов. художник, 1990. – 542 с.

Фядотаў, А.Г. Элементы народнай культуры беларускай шляхты ў сучасных гарадскіх святах / А.Г.Фядотаў // Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання: навук.-метад. часопіс. – 2008. – № 2. – С. 48–51: іл.

Черняк, Ю.М. Режиссура праздников и зрелищ / Ю.М.Черняк. – Мн.: ТетраСистемс, 2004. – 221 с.

Чечетин, А.И. Искусство театрализованных представлений / А.И.Чечетин. – М.: Сов. Россия, 1988. – 136 с.

Шарая, О.Н. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н.Шарая. – Мн.:Технология, 2002. – 249 с.

Шароев, И.Г. Режиссура эстрады и массовых представлений / И.Г.Шароев. – М.: Просвещение, 1986. – 463 с.

Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях / П.В.Шейн. – СПб.:Тип. Имп. акад. наук, 1877. – Т.1. – 585 с.

Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В.Шейн // Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях / П.В.Шейн. – СПб.:Тип. Имп. акад. наук,1902. – Т.3 – 535 с.